ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 34 (2820) • Пяўтніца, 20 жніўня 1976 г. • Цана 8 кап.

Яшчэ жаўрэнь кліча дзятву ў лес і на рэчку... Яшчэ слухае сэрца покліч піянерскага горна і запаўняюцца старонкі летняга дзённіка... Ды ўжо і абазначаны сцежкі юнацтва ў школу, у класы, у майстэрні. Ужо вывучаецца распісанне ўрокаў і адбываюцца сустрэчы з педагогамі. Праз дзесяць дзён—пачатак навучальнага года, і сотні тысяч падлеткаў зробяць яшчэ адзін крок да ведаў, да тых вяршынь навукі, тэхнікі, мастацтва, з якіх адкрываецца ўсё багацце свету і чалавецтва. Камунізм будаваць наканавана людзям прафесіянальна ўзброеным, адукаваным, дасведчаным, культурным.

На здымку, зробленым М. Амельчанкам,—адна з сустрэч вучня з настаўнікам. Гэта педагог Рэспубліканскай школы-інтэрната па музыцы і выяўленчаму мастацтву Л. Заяц і юная арфістка Оля Куракевіч.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Дружыць тэатр з заводам (3-я стар.)

Юбілей пісьменніка М. Паслядовіча (4-я стар.)

РЭЦЭНЗІІ — пра кнігі В. Трыхманенкі, Ул. Калесніка, Ю. Сапажкова (4, 5-я стар.)

НОВЫЯ ТВОРЫ Г. Далідовіча, В. Хомчанкі, П. Прудніка, П. Марціновіча (6, 7, 15-я стар.)

Паэты братніх рэспублік — К. Курбаннепесаў (14-я стар.)

Слова пра народныя промыслы (8-я стар.)

На мастацкай выстаўцы «Маладосць краіны» (9-я стар.)

Фестываль самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (12-я стар.)

СТАНЦЫЯ «МЕСЯЦ-24» НА ПАВЕРХНІ МЕСЯЦА *Паведамленне ТАСС*

18 жніўня 1976 года ў 9 гадзін 36 мінут па маскоўскаму часу савецкая аўтаматычная станцыя «Месяц-24» зрабіла мяккую пасадку на паверхню Месяца ў паўднёва-ўсходнім раёне Мора крызісаў у пункце з селенаграфічнымі каардынатамі: 12 градусаў 45 мінут паўночнай шырыні і 62 градусы 12 мінут усходняй даўжыні.

Як паведамлялася ўжо, станцыя «Месяц-24» 14 жніўня 1976 года была выведзена на селенацэнтрычную кругавую арбіту.

У адпаведнасці з праграмай палёту 16 і 17 жніўня ажыццёўлены карэкцыі траекторыі руху станцыі, у выніку якіх яна перайшла на эліптычную арбіту з максімальнай вышынёй над паверхняй Месяца 120 кіламетраў і мінімальнай вышынёй—12 кіламетраў.

Для забеспячэння пасадкі станцыі ў разліковы раён Месяца 18 жніўня ў 9 гадзін 30 мінут уключыўся тармазны рухавік. Зніжэнне станцыі праходзіла ў рэжыме кіруемага спуску і завяршылася мяккай пасадкай у разліковым раёне.

Згодна з данымі тэлеметрычных вымярэнняў, усе бартавыя сістэмы станцыі функцыяніруюць нармальна. Пачата выкананне намечанай праграмы работы на паверхні Месяца.

«САЛЮТ-5»: ТЭХНІЧНЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ

Цэнтр кіравання палётам. 18. (ТАСС). Працягваецца работа Барыса Валынава і Віталія Жолабава на борце арбітальнай навуковай станцыі «Салют-5».

У адпаведнасці з праграмай касманаўты выканалі серыю тэхнічных эксперыментаў з мэтай удасканалення сістэм арыентацыі касмічных апаратаў. У прыватнасці, 17 жніўня на працягу некалькіх гадзін кіраванне станцыяй праводзілася ў ручным рэжыме з арыентацыяй па аптычнаму візіру.

Па праграме медыцынскіх эксперыментаў праведзены чарговы цыкл даследаванняў па вызначэнню змяненняў смакавых адчуванняў касманаўтаў пад уплывам фактараў касмічнага палёту.

Бартавыя сістэмы станцыі функцыяніруюць нармальна. Самаадчуванне таварышаў Валынава і Жолабава добрае.

Палёт станцыі «Салют-5» працягваецца.

З КЛОПАТАМІ ПРА МОЛАДЗЬ

Рашэнні XXV з'езда КПСС надаюць асаблівую ўвагу выхаванню падрастаючага пакалення. Пытанні ідэйнага выхавання людзей, праблемы фарміравання новага чалавека — будаўніка камунізму, займаюць вялікае месца ва ўсёй шматграннай дзейнасці Камуністычнай партыі.

«...маладыя людзі актыўна далучаюцца да свядомага ўдзелу ў камуністычным будаўніцтве,— гаворыцца ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі.— Выхоўваць такую свядомасць не так проста, асабліва ўлічваючы, што маеш справу з людзьмі маладымі, з яшчэ не сталымі характарамі. Яны гатовы шчыра, горача адкліканцца на любыя добрыя пачынанні. Але сутыкненне з фармалізмам, з бюракратычным падыходам да выхаваўчай работы тушыць агонь сэрцаў. А наша ж задача, не толькі захоўваць, але і раздзімаць гэты агонь. Мы хочам, каб энтузіязм, жывасць розуму, маладая энергія заставаліся ў нашых людзей на ўсё жыццё».

Справа выхавання моладзі — адна з важнейшых і ў рабоце партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Толькі за гады дзевятай пяцігодкі ў Саюз пісьменнікаў было прынята 40 маладых літаратараў. З ліку моладзі папаўняецца і пісьменніцкая партыйная арганізацыя. Пытанні, прысвечаныя выхаванню маладых камуністаў і задачам партыйнай арганізацыі сталі тэмай чарговага сходу камуністаў СП БССР.

Яго адкрыў уступным словам народны паэт рэспублікі Пімен Панчанка.

З дакладам на сходзе выступіў сакратар партбюро Аляксей Кулакоўскі. Пра сваю літаратурную і грамадскую работу расказаў малады празаік Генрых Далідовіч.

Думкамі пра выхаванне літаратурнай моладзі падзяліліся Іван Чыгрынаў, Мікалай Аляксееў, Вячаслаў Адамчык, Станіслаў Шушкевіч, Алесь Махнач.

ДАРОГАМІ НЕЎМІРУЧАСЦІ

Пасля двух тыдняў упартай барацьбы 18 жніўня ў Наваполацку спушчаны флаг II Усесаюзных турысцкіх спаборніцтваў піянераў і школьнікаў, якія праходзілі на тэрыторыі Мінскай і Віцебскай абласцей. У іх удзельнічалі больш чым 500 выдатнікаў вучобы — юных турыстаў з усіх саюзных рэспублік, а таксама Масквы і Ленінграда. Вучні спаборнічалі па турысцкай тэхніцы, арыентаванню на мясцовасці, тапаграфіі, валейболу і іншых відах. Яны пабывалі на мемарыяльным комплексе «Хатынь», Кургане Славы, сустракаліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы, наведалі прадпрыемствы, калгасы, саўгасы.

Надоўга застанецца ў памяці юных турыстаў сустрэча ля мемарыяльнага комплексу «Прарыў» ва Ушачах, у якой удзельнічалі былы камандзір партызанскага злучэння, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Герой Савецкага Саюза У. Е. Лабанок, старшыня Белсаўпрофа М. Н. Полазаў, першы сакратар Віцебскага абкома КПБ С. М. Шабашоў, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч, міністр асветы БССР М. Г. Мінкевіч.

І вось прыйшоў час падводзіць вынікі. Журы аб'явіла іх. Першае месца ў агульнакамандным заліку сярод турыстаў старэйшай узроставай групы занялі вучні 19-й сярэдняй школы г. Мінска, другое—вучні 20-й сярэдняй школы г. Горкага. На трэцім — каманда 77-й сярэдняй школы г. Масквы.

Пераможцамі сярод удзельнікаў малодшай узроставай групы названы турысты з 113-й сярэдняй школы г. Мінска. У тройку прызёраў увайшлі таксама каманды Ваганаўскай васьмігадовай школы Ленінградскай вобласці і 4-й сярэдняй школы з украінскага горада Ківерцы.

Гэтыя сустрэчы паказалі ўзросшае майстэрства юных турыстаў краіны, — гаворыць галоўны суддзя спаборніцтваў генерал-лейтэнант І. І. Лісаў.— Школьнікі прадэманстравалі добрую тэхнічную падрыхтоўку і паспяхова справіліся з пастаўленымі задачамі.

Удзельнікі спаборніцтваў прынялі зварот да школьнікаў краіны, у якім заклікаюць павышаць тэхнічную падрыхтоўку, шырэй удзельнічаць у паходах па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа, глыбей вывучаць гісторыю сацыялістычнай Айчыны.

С. ШАІРКА,
спец. кар. БЕЛТА.

Наваполацк.

ВІНШУЕМ!

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР за шматгадовую актыўную работу ў друку і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем адказны сакратар рэдакцыі часопіса «Неман» Анатоль Іванавіч БЕЛАШЭЎ узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У НАШЫХ ЛІТОЎСКІХ СЯБРОЎ

НАСУСТРАЧ ЮБІЛЕЮ

Вільнюскі дзяржаўны універсітэт імя В. Капсукаса рыхтуецца адзначыць свой 400-гадовы юбілей. Для падрыхтоўкі і правядзення ўрачыстасцей створан рэспубліканскі юбілейны камітэт. Ён абмеркаваў план юбілейных мерапрыемстваў, з праектам якога азнаёміў членаў камітэта рэктар універсітэта, прафесар І. Кубілюс.

ДЭКАДА ПОЛЬСКАЙ КНІГІ

У рэспубліцы адбылася традыцыйная дэкада польскай кнігі, у час якой літоўскія чытачы набылі шмат літаратуры, выдадзенай у ПНР. Толькі за апошнія пяць гадоў у Савецкай Літве распаўсюджана каля мільёна экземпляраў кніг выдавецтваў Польскай Народнай Рэспублікі.

У час дэкады ў Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў была арганізавана выстаўка фотаплаката «Польшча ад VI да VII з'езда ПАРП».

КАНЦЭРТ ЛАЎРЭАТАЎ

Канцэрт лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Сярэбраныя галасы» адбыўся ў Вільнюсе. У ім прынялі ўдзел лепшыя самадзейныя вакальныя ансамблі, якія занялі першыя месцы на занальных аглядах.

Пераможцам конкурсу былі ўручаны дыпломы лаўрэатаў.

РАЯЦЦА КРАЯЗНАЎЦЫ

Шылальскі раён славіцца сваімі помнікамі культуры і архітэктуры. Тут умела захоўваюць іх, клапоцяцца пра тое, каб яны былі ў належным стане. У гэтым вялікая заслуга раённага аддзялення таварыства аховы помнікаў і краязнаўства.

Нядаўна для знаёмства з работай шылальцаў сюды прыбылі на семінар актывісты таварыстваў рэспублікі. Яны наведалі памятныя мясціны, абмяняліся вопытам, намецілі планы работы.

ВЫСТАЎКА ФІЛАТЭЛІІ

На рэспубліканскай выстаўцы філатэлістаў залатым медалём адзначан А. Гарунас з Вільнюса за калекцыю поштовых мініяцюр «К. Маркс і Ф. Энгельс — стваральнікі навуковага камунізму».

Сярэбраных медалёў удастоены Г. Волкаў з Клайпеды за калекцыю «Гісторыя КПСС у паштовых марках» і З. Аўгусцінавічус з Вільнюса за калекцыю «Асваенне космасу».

ЗЕЛЯНЕЮЦЬ СОСНЫ ЛЯ ЗАВОДА

Павесялелі сосны ў гаях, якія акружаюць Мінскі трактарны завод.

— Дыханне прадпрыемства стала чысцейшым, — гаворыць кіраўнік групы аховы прыроды завода Г. І. Буніц. — Калісьці трактарны, бадай, больш за іншыя прадпрыемствы горада выкідваў у паветра пылавых і газавых адходаў. Цяпер над трубамі вісяць не цёмныя дымныя воблакі, а лёгкія светлыя баранчыкі пары. З пачатку года санітарная служба горада не зарэгістравала ніводнага выпадку забруджвання атмасферы гэтым гіганцкім прадпрыемствам.

Значную колькасць ядавітага чаднага газу выдзялялі вагранкі. Цяпер на кожнай з іх устаноўлена спецыяльнае прыстасаванне для яго спальвання. Пыл жа ўлоўліваюць асобыя фільтры.

Дым і гар з электрасталеплавільных печаў пачалі прапускаць праз слой вады. Яна паглынае газы і ўтрымлівае цвёрдыя часцінкі пылу і сажы. Кожны дзень гэтыя ўстаноўкі збіраюць больш за чатыры тоны пылападобных адходаў, якія раней забруджвалі паветра. Да канца года магутныя фільтры будуць пастаўлены і на астатніх печах.

Каля дзвюхсот установак ачышчаюць пыладымавыя выкіды прадпрыемства. Сістэма ачысткі іх пастаянна ўдасканальваецца. На барацьбу з забруджваннем паветра штогод затрачваюцца значныя сродкі. Вакол пэхаў створаны заслоны з дрэў і кустоў, якія добра ачышчаюць паветра.

БЕЛТА.

КУЛЬТУРНАЯ ХРОНІКА: ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

ЮБІЛЕЙ ПІСЬМЕННІКА

У Смалявіцкім раённым Доме культуры на вечары, прысвечаным 60-годдзю крытыка і літаратуразнаўцы Уладзіміра Юрэвіча, выступілі І. Чыгрынаў, М. Аўрамчык і іншыя беларускія паэты і празаікі. У прайшоўшым затым канцэрце ўдзельнічалі артысты Белдзяржфілармоніі і Рэспубліканскага тэатра юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі.

ПАСЫЛКА ГЕНЕРАЛА

Пакой баявой славы, створаны пры Палацы культуры Светлагорскага завода штучнага валакна, папоўніўся новымі цікавымі экспанатамі. Двойчы Герой Савецкага Саюза, былы камандуючы 65-й арміяй, якая вызваляла раён ад фашысцкіх захопнікаў, генерал арміі П. І. Батаў прыслаў сюды пасылку. У ёй — асабістыя рэчы палкаводца, кніга мемуараў «У баях і паходах», фотаздымкі і іншыя матэрыялы.

КЛАСІКА І СУЧАСНАСЦЬ

У Магілёве пачаў гастролі Шахцінскі тэатр драмы імя М. Пагодзіна.

За час гастроляў, якія працягнуцца да 1 верасня, магілёўчане ўбачаць «Васілісу Мяленцьеву» А. Астроўскага, «Залетыя кастры» І. Штока, «Энергічных людзей» В. Шукшына і іншыя пастаноўкі па творах класікі і сучаснай драматургіі.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Дазвольце праз вашу газету выказаць шчырую падзяку ўсім, хто раздзяліў з намі вялікае гора — смерць усім нам блізкага і дарагога Івана Паўлавіча Мележа.

Сям'я І. П. МЕЛЕЖА.

ПАМЯЦІ ВЯЛІКАГА ПЕСНЯРА

13 жніўня на старыя могілкі ў цэнтры Мінска, што ў народзе завуць Вайсковымі, дзе спачывае прах двух вялікіх песняроў беларускага народа, прыйшлі пісьменнікі, супрацоўнікі літаратурных музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа, прадстаўнікі ўстаноў культуры і калектываў працоўных... Прыйшлі, каб пакланіцца дарагім магілам, усклясці кветкі, аддаць шчырую даніну іх светлай памяці.

Мінула дваццаць гадоў, як не стала Якуба Коласа. Але з адлегласці часу справа Якуба Коласа, яго жыццёвы і творчы подзвіг у імя шчасця народа яшчэ больш вымалёўваюцца ва ўсёй гістарычнай значнасці. «Імёны нашых песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа стаяць побач з найбольш вядомымі пісьменнікамі свету... «Новая зямля», «Сымон-музыка», «Рыбакова хата», «На ростанях»... Гэта і гісторыя нашага народа, і гісторыя літаратуры. Не кожны народ, не кожная літаратура мае такую глыбока народную паэму, як Коласава «Новая зямля», — гаварыў у сваёй прамове над магілай Якуба Коласа сакратар праўлення СП БССР Іван Чыгрынаў.

Ушанаванне памяці народнага песняра працягвалася на плошчы Якуба Коласа, каля мемарыяльнага ансамбля, узведзенага ў гонар яго.

В. ГАУРЫЛАЎ,

САДРУЖНАСЦЬ

У ЗАЎКОМ прафсаюза Мінскага аўтазавода пазваніў сакратар парткома тэатра оперы і балета БССР Аляксандр Сяргеевіч Самарадаў.

— У нас заўтра сход трупы, прысвечаны адкрыццю новага сезона,— сказаў ён.— Прыходзьце, калі ласка.

— Абавязкова будзем,— паабяцаў старшыня заўкома прафсаюза Том Аляксандравіч Шпакоўскі.

На наступны дзень Шпакоўскі, яго намеснік Раіса Іванаўна Шамаль і намеснік сакратара парткома завода Валянціна Афанасьеўна Грушчанкова прыйшлі ў тэатр. Яны абмяркоўвалі рэпертуар на новы сезон, мерапрыемствы па шэфскаму абслугоўванню працоўных.

Крыху пазней аўтазаводцы запрасілі да сябе артыстаў тэатра.

Стала традыцыяй, што радасць працы і творчасці стваральнікі «МАЗаў» і артысты тэатра дзеляць папалам, дапамагаюць адзін аднаму ва ўсіх справах.

Завод і тэатр... Здавалася б, два розныя калектывы: адзін стварае каштоўнасці матэрыяльныя — вядомыя ўсяму свету «МАЗы», другі — духоўныя багацці, прывівае людзям любоў да мастацтва. Але ў нашы дні рабочы чалавек не можа жыць без мастацтва, а мастацтва ўслаўляе людзей працы, якія ствараюць матэрыяльна-тэхнічную базу камунізму. Зусім натуральна, што аўтазаводцы, сярод якіх нямала сапраўдных аматараў оперы і балета, вельмі часта бываюць на спектаклях у тэатры. Артысты ж цікавяцца справамі аўтамабілебудаўнікоў. І садружнасць мастацтва і працы нарадзілася вельмі заканамерна. Яшчэ больш ўзмацнела яна пасля таго, як у студзені 1969 года ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна калектывы Мінскага аўтазавода і Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР заключылі дагавор на творчую садружнасць.

Многім аўтамабілебудаўнікам запомнілася тая першая сустрэча з артыстамі тэатра, якая адбылася ў цэху лесавозаў. У канцэрце, які праходзіў у чырвоным кутку, прынялі ўдзел салісты оперы і балета. Рабочым завода асабліва спадабалася выступленне народнай артысткі СССР Тамары Ніжнікавай. Цудоўны голас, таварыскасць, жывы інтарэс да іх спраў... І яны вырашылі залічыць Тамару Ніжнікаву членам свайго калектыву. З таго часу яе часта можна ўбачыць у цэху лесавозаў. Кожны раз паміж сябрамі завязваецца размова аб поспехах завода і тэатра, пра асабістыя справы.

Мінуў час. Цяпер Тамара Ніжнікава не толькі спявае ў тэатры, але і выкладае ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага. Але нягледзячы на сваю занятасць, не забывае сяброў.

Часта бываюць у сваіх цэхах ганаровыя члены камуністычных брыгад народныя артысты рэспублікі Тамара Шымко, Людміла Бржазоўская, Ніна Давыдзенка, Ала Карзянкова, Аляксей Кагадзееў, заслужаныя артысты рэспублікі Ірына Шыкунова, Юрый Траян, Леў Гаўэлік і народны мастак БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Яўгеній Чамадураў. У дзень Камуністычнага суботніка яны заўсёды разам з аўтазаводцамі працуюць у сваіх цэхах.

У сваю чаргу артысты тэатра залічылі ганаровымі членамі свайго калектыву Героя Сацыялістычнай Працы, шафёра-выпрабавальніка Канстанціна Паўлянковіча, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР, галоўнага канструктара Міхаіла Высоцкага, штампоўшчыка Георгія Латушкіна, газаэлекразваршчыка Пятра Андронава, наладчыка Якава Камарыста, тэхніка Надзею Шкуёнак.

— Па сабе мяркую, як карысна дружба аўтазаводцаў з калектывам тэатра,— гаворыць тэхнік Надзея Шкуёнак.— Колькі цікавага адкрыла я для сябе за гэтыя гады, навучылася глыбей разумець оперу і балет... Нас запрашаюць сябры на ўсе прэм'еры, на ўсе цікавыя спектаклі.

Але сустрэчы сяброў праходзяць не толькі ў тэатры. Артысты, канцэртмайстры, дырыжоры,— жаданыя госці ў заводскіх цэхах, аддзелах і інтэрнатах. Па даўняй традыцыі на заводзе штогод у дзень нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна праводзіцца Дзень тэатра. Тады да аўтазаводцаў прыязджае адразу некалькі канцэртных брыгад. У комплексе маладзёжных інтэрнатаў па вуліцы Енісейскай працуе факультэт музыкі народнага універсітэта культуры. Заняткі праводзяць вядучыя спецыялісты тэатра.

— Не застаецца ў даўгу перад тэатрам і калектыў завода,— расказвае дырэктар тэатра Мікалай Панцеляймонавіч Шаўчук.— Аўтазаводцы не толькі першыя паніцелі новых спектакляў. Калі рыхтуецца прэм'ера, рабочыя дапамагаюць вырабляць дэкарацыі. У прыватнасці, вялікая дапамога аказана ў пастаноўцы спектакляў «Нікавая дама», «Хаваншчына», «Бахчысарайскі фантан». Заводам устаноўлены прэміі артыстам тэатра за лепшае выкананне партый у оперных і балетных спектаклях. Заводскіх прэмій удастоены народны артыст рэспублікі Віктар Саркісьян і заслужаны артыст рэспублікі Аркадзь Саўчанка. Вялікую карысць прынёс нам аўтагурток, арганізаваны для калектыву тэатра. Гэты спіс добрых спраў можна прадоўжыць.

Прайшло сем гадоў. Шмат змен адбылося за гэты час у жыцці тэатра і завода. Выраслі іх калектывы, дасягнуты вялікія поспехі ў працы і творчасці. Мінскі аўтазавод стаў галоўным прадпрыемствам вытворчага аб'яднання «БелаўтаМАЗ» — буйнейшага ў рэспубліцы. Тэатр адзначыў саракагоддзе, паставіў нямала цудоўных спектакляў, у яго складзе з'явіліся новыя імёны маладых талентаў. Дружба ж артыстаў з рабочымі завода з кожным годам робіцца больш трывалай.

Нядаўна адбылася чарговая сустрэча сяброў. Прадстаўнікі тэатра і завода падпісалі сумеснае абавязацельства на творчае супрацоўніцтва на 10-ю пяцігодку. Толькі сёлета ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода адкрыецца філіял тэатра. Двойчы ў месяц на працягу сезона на сцэне Палаца культуры будуць ісці спектаклі тэатра. Распрацаваны абанементы, па якіх стваральнікі «МАЗаў» будуць наведваць тэатр. Дружба, якая прыносіць так шмат карысці калектывам завода і тэатра, што з'яўляецца крыніцай натхнення ў іх працы, мацнее.

С. ГЕБЕЛЕВА.

ЗЯМЛЯ — МАЁ ПРЫЗВАННЕ

Непрытоенай радасцю засвяціліся вочы хударлявага хлопца ў рабочым камбінезоне, калі трактар, выведзены з майстэрні, лёгка і прыгожа зрабіў па двары два пробныя кругі. Вопытныя механізатары ўсміхаліся. Яны разумелі, што для іх малодшага таварыша, выпускніка сярэдняй школы Аляксандра Віцько, сёння дзень асаблівы. Гэты трактар, у рамонце якога Саша прымаў удзел нароўні са сталымі майстрамі, стаў першай пробай яго сіл і ўмення.

Сёлета ён скончыў школу і разам з атэстатам аб сярэдняй адукацыі атрымаў правы вадзіцеля. Але на ўроках па аўтасправе, акрамя аўтамабіляў, школьнікі вывучалі і сельскагаспадарчыя машыны. А пасля заняткаў часта можна было ўбачыць Сашу або ў калгасных майстэрнях, або ў полі побач з трактарыстам ці камбайнерам. Пасля выпускных экзаменаў юнак, не вагаючыся, выбраў для сябе дарогу механізатара.

Побач з ім у майстэрнях працуюць учарашнія школьнікі — Іван Турко, Рыгор Шуцько і Васіль Мазур.

Над юнымі ўзялі шэфства вопытныя майстры, якія ў любую мінуту гатовы дапамагчы і словам, і справай. Па самых складаных пытаннях ідуць юнакі за парадай да ветэрана майстэрань, паважанага тут чалавека — майстра-наладчыка П. І. Гавакі. У яго вучацца яны майстэрству, любві да выбранай прафесіі.

Для жадаючых вучыцца ў калгасе «Нёман» створаны ўсе ўмовы. Праўленне ахвотна пасылае на курсы, у сельскагаспадарчыя ВНУ і тэхнікумы. Цяпер у калгасе чатыры стыпендыяты, а трое камсамольцаў займаюцца завочна. Закончыўшы вучобу, яны папоўняць сям'ю калгасных спецыялістаў.

Клопатамі і ўвагай акружаюць у гаспадарцы і тых, хто вяртаецца на бацькоўскую зямлю пасля службы ў радах Савецкай Арміі. Ім выдаецца грашовая пазыка, яны ў першую чаргу забяспечваюцца добраўпарадкаванымі кватэрамі.

Неабыякавыя для калгаса і справы школы. Ужо шмат гадоў звязвае іх добрая дружба. Старэйшыя дапамагаюць вучням у абсталяванні кабінетаў, рамантуюць будынак, забяспечваюць сталовую прадуктамі. У сваю чаргу, вучні даглядаюць цукровыя і кармавыя буракі і гародніну, пасаджаныя на адведзеным для іх участку, дапамагаюць дарослым на сенаўборцы. З дзяцінства засвойваюць яны тонкасці хлебаробскай прафесіі.

А. БЯРЭЙШЫК,
кар. БЕЛТА.
Стаўбцоўскі раён.

ЗА ВЯЛІКІ ХЛЕБ

У гэтыя дні нярэдка па палявых дарогах Маладзечаншчыны можна сустрэць клуб палітычнай інфармацыі райкома партыі.

Агітатары і прапагандысты клуба знаёмяць працаўнікоў вёскі з палітычным і культурным жыццём нашай краіны, з поспехамі перадавых калектываў і асобных працаўнікоў у выкананні абавязацельстваў па ажыццяўленню рашэнняў XXV з'езда КПСС.

У час выступленняў прапагандуецца вопыт перадавікоў калгаснай вытворчасці, расказваецца пра герояў жніва, лепшых камбайнераў раёна — пра такіх, як Мікалай Іванавіч Русецкі, які сёлета ўзяў абавязацельства намалаціць камбайнам «Ніва» 600 тон збожжа. За час жніва клуб пабывае ва ўсіх 22 гаспадарках раёна.

Разам з клубам палітычнай інфармацыі да хлебаробаў выязджаюць работнікі райкомаў партыі і камсамола. Цёпла сустракаюць працаўнікі вёскі лектара райкома партыі У. У. Тубеліса. Яго гутаркі на эканамічныя і міжнародныя тэмы заўсёды праходзяць з поспехам.

Жаданыя госці ў хлебаробаў — самадзейныя артысты клуба. Настаўнік Хожаўскай сярэдняй школы Уладзімір Свістуноў па-майстэрску чытае гумарэскі беларускіх пісьменнікаў. Людміла Шарафановіч, Таццяна Тычыліна і Раіса Афанасенка любяць цёплую і задушэўную песню. Яны ўжо выступілі перад хлебаробамі калгасаў «Чырвоны прамень», імя Калініна, «Шлях Леніна», «Усход» і «Светлы шлях». А наперадзе — новыя дарогі, цікавыя сустрэчы.

І. ГАЛУБОВІЧ.

Камуніст майстар-наладчык Уладзімір Шульга—ветэран саўгаса «Прыазёрны» Баранавіцкага раёна. Дваццаціпяцігадовы стаж работы, высокая кваліфікацыя, творчы падыход да справы дазваляюць яму паспяхова спраўляцца з даручанай справай.

Фота Р. АЛЫМАВА.



З пачатку года металургі Мінскага трактарнага завода выдалі звыш плана 700 тон ліцця.
На здымку: перадавік сталеліцейнай вытворчасці МТЗ брыгадзір заліўшчыкаў Б. Салавей.

Фота В. ВІТЧАНКІ. (БЕЛТА).

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Макару ПАСЛЯДОВІЧУ—70

Заўтра вядомаму беларускаму пісьменніку Макару Паслядовічу спаўняецца 70 гадоў. З нагоды юбілею праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі накіравала яму прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Макар Трафімавіч!

З выпадку Вашага сямідзесяцігоддзя шлём Вам, вядомаму беларускаму празаіку і публіцысту, свае шчырыя віншаванні.

Амаль пяцьдзесят гадоў Вы верна служыце нашай літаратуры, натхнёным мастацкім словам дапамагаеце людзям разумець навакольнае жыццё, змагацца за светлыя чалавечыя ідэалы. Ваша далучэнне да літаратуры прыпадае на 20-я гады, калі Вы выступілі з першым апавяданнем «Пад старою бярозаю». У хуткім часе чытачы атрымалі зборнікі Вашых апавяданняў «Зруйнаваныя межы», «Людзі вясны», аповесці «Марсэль», «Хада ў заўтра», «Магістральны канал», раман «Паўстанне». У сваіх творах Вы паказвалі нараджэнне новага сацыялістычнага чалавека, барацьбу за новае жыццё.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Вы ўваходзілі ў падпольную групу, якая дзейнічала ў Пухавіцкім раёне. У пасляваенны час Вы падарылі чытачам шмат змястоўных і цікавых кніг. Гэта—аповесці «Цёплае дыханне». «Па воўчых сцежках», «З табою побач», раман «Святло над Ліпскам».

Значны ўклад Вы ўнеслі і ў іншыя жанры—дзіцячай літаратуры, сатыры і гумару. Па такіх кнігах. як «Мяцежнае сэрца» і «Салігорскае дзіва», мы ведаем Вас як назіральнага, баявітага публіцыста.

На працягу доўгага часу Вы з'яўляецеся намеснікам старшыні праўлення Белліфонду, прымаеце чынны ўдзел ў жыцці пісьменніцкай арганізацыі.

Жадаем Вам, дарагі Макар Трафімавіч, доўгіх год жыцця, радасці і творчага натхнення».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і горача жадае Макару Трафімавічу шчасця ў жыцці, плёну ў творчай рабоце.

СУМЛЕННА І ТАЛЕНАВІТА

У АДНЫМ са шматлікіх пісем і тэлеграм, якія ў гэтыя дні атрымлівае Макар Трафімавіч, ёсць такі радок: «Ты — сумленна і таленавіта служыш літаратуры і народу». Віншуючы юбіляра, народны паэт Беларусі Пімен Панчанка сказаў коратка, проста і трапна. Менавіта грамадзянскае сумленне і талент з'явіліся той рухаючай сілай, якая вывела Макара Паслядовіча на магістраль творчай і грамадскай дзейнасці.

У 1924 годзе на старонках газеты «Беларуская вёска» з'яўляюцца яго селькораўскія заметкі і гамалёўкі, а неўзабаве юнак пачынае працаваць у штаце рэдакцыі.

Шчыра падтрымліваў свайго малодшага сябра Кузьма Чорны: «От ты мне расказваў, а я слухаў. Сядай сёння ўвечары і пішы... Каб праз тыдзень апавяданне ляжала на маім стале!». І апавяданне было напісана.

Юнаку не сядзіцца ў рэдакцыі. У час адпачынку едзе ў Сібір, на Далёкі Усход, сустракаецца з перасяленцамі, піша нарыс «Тайгу заваюе толькі калектыў». І зноў паездкі. Цяпер на Харкаўскі і Сталінградскі трактарныя заводы, у саўгас «Гігант». У 1930 годзе адразу выходзяць дзве кнігі нарысаў.

Адначасова збіраецца матэрыял для першай аповесці «Марсэль», у якой паказана жыццё французскага ваеннапалоннага, што трапіў у кабалу да кулака.

Перад вайной пісьменніка захапілі праблемы асушэння і асваення балот. Тысячы кіламетраў аб'ездзіў ён па Палессі. І вось вынік — аповесць «Магістральны канал».

У пасляваенны час Макар Трафімавіч паказаў у сваіх творах яркія, запамінальныя вобразы народных мсціўцаў.

...Героі аповесцей і раманаў М. Паслядовіча простыя людзі ад зямлі і ў той жа час не прыземленыя. Яны — аптымісты і радуюць сваёй чалавечай прыгажосцю.

«Жыць — не туляцца» — так вызначае сваё жыццёвае крэда малады муляр з аповесці «Цёплае дыханне». Радкі гэтыя з поўным правам можна аднесці і да самога пісьменніка, які разам са сваімі героямі, камуністамі і беспартыйнымі, гаворыць: «Душа наша зраслася з Савецкай уладай, як бетон з жалезам».

Пастаянны клопат М. Паслядовіча — «каб чытач, узяўшы мой новы твор, ніколі не сумаваў і атрымліваў ад яго нешта патрэбнае яму і карыснае». І гэтага творца дасягае. Сапраўды, над яго кнігамі не засумуеш. Нават калі чытаеш на так званую «вытворчую» тэму, здзіўляешся, як пісьменнік умее апаэтызаваць, ярка, у той жа час рэальна, паказаць працу чалавека. Сакрэт тут у тым, што аўтар у гэтым працэсе раскрывае перш за ўсё ўнутраны свет асобы, ідэйныя зрухі душы, імкненне ўпрыгожыць зямлю, каб жыць на ёй і радавацца.

Жыццё без усмешкі — што аднаколерны малюнак. Дасціпная ўсмешка то тут, то там з'яўляецца ў яго творах, радуе, а часам і здзіўляе сваёй прыемнай нечаканасцю.

«Мне так выпала, — гаворыць Макар Трафімавіч,—што ад самага маленства давялося больш сустракацца і з добрымі людзьмі, і з добрымі кнігамі».

Добрыя людзі своечасова памаглі станаўленню яго таленту. У свой час многіх маладых пісьменнікаў заўважыў і падтрымаў і Макар Трафімавіч.

У 1949 годзе выйшаў першы раман Івана Шамякіна «Глыбокая плынь». Першую рэцэнзію ў «ЛіМе» надрукаваў М. Паслядовіч. «Праўда, — успамінае ён цяпер, — я тады бачыў і папрок — перахваліў». Папрок, як цяпер відаць, неабгрунтаваны.

М. Паслядовіч быў рэдактарам першых твораў Т. Хадкевіча, Ул. Карпава, А. Рылько, Ул. Шахаўца. А хто ж не ведае, як цяжка пісьменніку адарвацца ад сваёй працы, каб узяцца за чужы твор, ацаніць яго, адкрыць новы талент, ці ўзяць на сябе смеласць параіць маладому чалавеку шукаць іншы шлях у жыцці?

Творы М. Паслядовіча даўно выйшлі за межы рэспублікі. Аповесці «Магістральны канал», «З табою побач», «Цёплае дыханне» і адзін з лепшых раманаў нашай літаратуры «Святло над Ліпскам» (рукапіс якога, падрыхтаваны ў свой час для выдання ў Маскве, чытаў і высока ацаніў Аляксандр Фадзееў) перакладзены на рускую мову. На ўкраінскай мове пазнаёміліся чытачы з аповесцю «З табою побач». «Цёпкае дыханне» чытаюць нашы сябры па-нямецку. Дакументальная аповесць «Па воўчых сцежках», у якой пісьменнік выкрывае былых памагатых гітлераўцаў, а цяпер агентаў імперыялістычных разведак, друкавалася з працягам у прагрэсіўнай газеце «Русский голос», што выходзіць у Нью-Йорку.

Макар Трафімавіч робіць пэўны ўклад у перакладчыцкую справу. Ён пераклаў на беларускую мову паасобныя творы М. Астроўскага, А. Пушкіна, А. Чэхава, а ў сааўтарстве з А. Бачылам «Тараса Бульбу» М. Гогаля. Зусім нядаўна, дзякуючы яго працы, па-беларуску загучалі цудоўныя казкі рускага казачніка А. Нячаева.

Творчая энергія М. Паслядовіча, здаецца, невычэрпная. Калі ні зойдзеш да яго, стол пісьменніка завалены рукапісамі — і сваімі, і чужымі.

— Гэта што? — паказваю на пухлую папку.

— Далі з выдавецтва на рэцэнзію, — адказвае Макар Трафімавіч.

— А гэта?

На вуснах яго з'яўляецца ўсмешка:

— Дакументальны твор пра партызанскую брыгаду «Беларусь», якой камандаваў Герой Савецкага Саюза Мікалай Пракопавіч Пакроўскі. Багаты матэрыял. Апрацоўваю. Будзе цікавая кніжка...

Семдзесят год жыцця, з якіх амаль паўстагоддзя сумленнай працы для літаратуры і народа. Макар Трафімавіч узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Па традыцыі, такія артыкулы заканчваюцца пажаданнямі юбіляру добрага здароўя і плёну. І я таго жадаю. Аднак мне, ведаючы пра багаты запас творчай энергіі Макара Трафімавіча, яшчэ хочацца сказаць словамі няўрымслівага брыгадзіра муляраў, аднаго з герояў аповесці «Цёплае дыханне», Уладзіміра Саламакі:

— Габлюй так і далей, дарагі наш Макар!

Леанід ПРОКША.

СЯРОД КНІГ

НЕБА—АДНО НА ЎСІХ

Віктар Трыхманенка — з тых пісьменнікаў, хто ўсё сваё творчае жыццё «прывязаны» да адной вялікай тэмы. Праходзяць гады, з'яўляюцца новыя кнігі, аднак па-ранейшаму ў сэрцы герояў іх, як і ў самога аўтара, жыве вялікая любоў—неба. Змянілі былыя ваенныя лётчык прафесію, стаў журналістам, пісьменнікам і па-ранейшаму ў душы застаўся чалавекам высокага палёту і чыстага, адкрытага сэрца.

З гэткімі ж высокімі крытэрыямі падыходзіць ён і да іншых людзей, імі кіруецца ў сваёй творчасці. Добра гэта прасочваецца, у прыватнасці, у рамане «Небом крещенные», у якім пісьменнік пераконвае ў высакароднасці адных, і прымушае ў чымсьці паспрачацца з іншымі.

На старонках рамана ажываюць надзеі больш чым трыццацігадовай даўнасці, у жыццё герояў урываецца вайна. Аднак яны — Валька Булгакоў, Вадзім Зосімаў, Косця Раінскі — праходзяць не толькі праз суровыя выпрабаванні ваеннага ліхалецця. Наперадзе — нялёгкая барацьба за сваё чалавечае «я» ў нашы дні. Яна часта носіць як бы лакальны характар, і староннямy чалавеку нават не відаць, што нехта ўзмоцнена, нават пакутліва-балюча, пераасэнсоўвае сваё мінулае, каб прыйсці да простых ісцін чалавечнасці, высакародства, навучыцца разумець іншых.

Інакш кажучы, чалавек бы нараджаецца нанава, і ён ужо не хоча, не можа жыць ранейшымі прынцыпамі, калі яны ў нечым састарэлі. Чалавеку хочацца пакараць новыя вяршыні, і не толькі ў небе, але і ў паўсядзённым жыцці. Аднак ці заўсёды ён, прад'яўляючы патрабаванні да таварышаў ці

В. Трыхманенка. Небам хрышчоныя. На рускай мове. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1976.

НАТХНЁНЫМ СЛОВАМ

Назва новай кнігі Ул. Калесніка «Зорны спеў» напачатку здалася нам некалькі прэтэнцыёзнай, а яе жанравае абазначэнне — літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды — не зусім дакладным. У такім падзагалоўку ёсць перадумова нечага раскідзістага, неакрэсленага, у той час, як зборнік — цэласны, прасякнуты не толькі адзінствам пафасу, але і «ўнутранага сюжэта».

Кніга прываблівае ўжо тым, што яна — пра людзей творчых, цікавых у кожным разе на-свойму. Сярод іх — Мікола Гусоўскі, Максім Танк, Янка Брыль, Піліп Пестрак, Мікола Засім; чацвёра паэтаў з вёскі Зачэпічы з-пад Дзятлава вабяць, можа, пакуль што не столькі сваёй паэзіяй, колькі імкненнем да яе; Ніна Мацяш, чалавек трагічнага лёсу і мужнага сэрца. Для кожнага з іх аўтар знайшоў харошае, свежае і патрабавальнае слова.

Павагі і ўдзячнасці заслугоўвае імкненне Ул. Калесніка паказаць праўдзіва, ва ўсёй жыццёвай складанасці, ідэйна - мастацкай дыялектыцы літаратурны рух у былой Заходняй Беларусі. Вельмі зразумелы яго папрок некаторым нашым даследчыкам, «якія лёгка вытыкаюць хібы масавай заходнебеларускай паэзіі». Нельга не пагадзіцца з наступным сцвярджэннем аўтара: «Паэзія гэтая не той матэрыял, на якой крытык можа з чыстым сумленнем дэманстраваць вузкі прафесіяналізм, веданне паэтычнага рамяства. На масавай паэзіі рэвалюцыйна - вызваленчага руху крытыку і чытачу трэба правяраць сваю грамадзянскую чуласць, здольнасць рэагаваць на гуманістычны дэвіз гэтага руху — «людзьмі звацца». Масавая паэзія была фактам народнага парывання да чалавечай годнасці, а не мастацтвам слова ў ардынарным разуменні гэтага слова».

Заходнебеларускі матэрыял займае ў кнізе даволі значнае месца. Аўтар звяртаецца да складанай праблемы развіцця рамантычнай плыні ў заходнебеларускай літаратуры (артыкул «Старонкі рамантызму»). Тут разглядаецца творчасць такога супярэчлівага публіцыста, як Ігнат Карчэўскі (Абдзіраловіч), «фантазмы» якога, на думку даследчыка, «належаць прагрэсіўна-рамантычнай плыні заходнебеларускай грамадскай думкі і паэзіі».

З любоўю і нейкай асаблівай цеплынёй напісаны эцюд «Гняздо паэтаў».

Грунтоўная навуковая праца «Берасцейскае вогнішча», у якой аўтар прасочвае гісторыю культурнага жыцця на Брэстчыне ад «пачатку рода» па сённяшні дзень. Перад намі праходзяць — пісьменнік - палеміст XVII стагоддзя Афанасій Філіповіч, «трагічная постаць Казіміра Лышчынскага, філосафа-атэіста, засечанага катам і спаленага 30 сакавіка 1689 года на плошчы Старога Мяста ў Варшаве «за знявагу вялікасці бога»...

Далей — «інжынер барыкад» Пілін Пестрак; цікавы паэт, чалавек складанага лёсу Мікола Засім і іншыя слаўныя людзі Брэстчыны. Аўтар зрабіў і аб'ектыўны агляд набыткаў сучасных літаратараў, сваіх землякоў — В. Праскурава, А. Авечкіна, М. Цялічкі, М. Купрэева і некаторых іншых.

Асобныя падраздзелы адведзены М. Рудкоўскаму, Н. Мацяш, А. Разанаву. У раздзеле «Сябрына», дзе Ул. Калеснік разглядае творы І. Арабейкі, Я. Пархуты, В. Жуковіча, В. Гардзея, Н. Гарагляд, паказваецца, што поспех паэта напаткае там, дзе адбудзецца «сапраўдны сінтэз народнага пачатку з сучасным». У канцы артыкула «Берасцейскае вогнішча» аўтар як бы апраўдваецца: «І я то з радасцю, то з сумам бачыў, як хутка старэлі тыя матэрыялы: шэраг пісьменнікаў... выехалі ў іншыя гарады... Іншыя, хоць і заставаліся жыць на Брэстчыне, творча вычарпалі сябе...». Але не дарма была гэтая гаворка. Яна, апроч усяго іншага, і — сведчанне сталасці нашай крытычнай думкі.

Ул. Калеснік. Зорны спеў. Літаратурныя партрэты, нарысы, эцюды. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1975.

падначаленых, сам застаецца ва вышыні гэтых патрабаванняў?

Адказ на гэтае пытанне не можа быць адзначаным, ды і не заўсёды яго лёгка знайсці. А патрэбна... Таму В. Трыхманенка разам з героямі і шукае шлях да ісціны, спасцігае ўсю складанасць чалавечых узаемаадносін.

Чаму Булгакоў часта самаўпэўнены, і, наадварот, Зосімаў, у супрацьлегласць свайму сябру, скаваны ў дзеяннях, у чымсьці інертны? А Разінскі, з якога ўсе кпілі і смяяліся ў лётнай школе, становіцца маральна моцным і мэтанакіраваным? Разблытваецца клубок чалавечых характараў, разгортваюцца падзеі больш ці менш важныя, а пісьменнік як быццам гаворыць нам: не спяшайцеся рабіць вывады. Самы ж строгі і патрабавальны суддзя ў кожнай справе — час, ён і адкажа, хто жыў правільна, вытрымаў выпрабаванне на чалавечую годнасць.

Праз увесь раман праходзіць вобраз роднага неба. В. Трыхманенка, які месцамі скупаваты ў фарбах, не можа схаваць сваёй радасці і захаплення, калі піша пра лётчыкаў. Услухаемся ўважліва ў рокат рэактыўных рухавікоў, і быццам шырэюць блакітныя далі — прагнеш прастору, імклівага руху, дзеяння.

Неба ў рамане — стыхія, якая кліча да сябе смелых, апантаных. У той жа час яно атоесамліваецца з вобразам Радзімы. Застацца верным роднаму небу, значыць, умацаваць у сабе вялікую любоў да роднай зямлі.

«Крещенные небом за свою летную жизнь проходят две жизни: одну в небе, другую — на земле...». Глыбокая ісціна ў гэтых словах. Героі В. Трыхманенкі разумеюць гэта і застаюцца вернымі свайму прызванню. Прайшоўшы праз многія выпрабаванні, пачынае лётаць на транспартным самалёце Разінскі і здзяйсняе подзвіг, не даўшы магчымасці злачынцам накіраваць машыну за мяжу. Выкладчыкам аэрадынамікі ў родным вучылішчы, цяпер ужо вышэйшым інжынерным, працуе Зосімаў, у штаб перайшоў Булгакоў...

Аб кожным з іх можна сказаць словамі, якія пісьменнік адрасуе Булгакову: «До сорока лет дожил Булгаков, до полковничьего звания дослужился, а как был, так и остался летчиком».

Героі пісьменніка, як і ён сам, жывуць небам. І ў рамане «Небом крещенные» ён паказаў сябе добрым знаўцам армейскага жыцця. Успаміны Булгакова дапаўняюцца старонкамі з дзённіка Зосімава, лірычнымі адступленнямі аўтара, які, пра што ўказана і ў творы, некаторы час служыў разам са сваімі героямі. Праз прызму асабістага ўспрыняцця падзей ён раскрывае грамадска-значныя праблемы, дае магчымасць зразумець іх сацыяльную сутнасць.

У рамане, пяглядзячы на пэўныя пралікі (месцамі сустракаецца апісальніцтва, адчуваецца аўтарская «прысутнасць» у дзённіку Зосімава), В. Трыхманенка праўдзіва, з партыйных пазіцый паказвае савецкага чалавека, які абараняе мірнае неба Радзімы.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

СЛОЎ ВЫСОКІХ ПАДМУРАК

«ГЕРАІЗМ, подзвіг... Словы надта ж высокія. Вунь як тыя калоны. Уявіце, калі б не было ў іх бетоннага кораня? Страшнавата. Вось і ў слоў высокіх павінен быць моцны падмурак».

Так гаворыць брыгадзір будаўнікоў Лукомльскай ДРЭС Уладзімір Паўлавіч Зайцаў, герой кнігі нарысаў Юрыя Сапажкова «Несущие свет».

Прывабная рыса лепшых нарысаў Ю. Сапажкова — строгая дакументальнасць. Я не агаварыўся — менавіта дакументальнасць, якой беларускаму нарысу часам не хапае. Вось адзін аўтар доўга і прыгожа расказвае, аб чым думала перадавая даярка пры пераходзе ў адстаючую брыгаду, у другога нарысіста герой падрабязна ўспамінае сваё басаногае дзяцінства і марыць вярнуцца ў вёску... Ці не падмяняе іншы раз гэтакае ўяўнае пранікненне ў душу сучасніка самой праўды жыцця?

Ю. Сапажкоў сустракаецца са сваімі героямі рэгулярна. Пад час адной з такіх сустрэч ён пачуў і запісаў выказванне будаўніка Зайцава пра высокія словы. А перад гэтым будаўнікі ў надзвычай складаных умовах, якія патрабавалі ад людзей сапраўднай мужнасці, закончылі мантаж трубы вышынёй 250 метраў. Брыгадзір расказваў пра тое ў прысутнасці ўсёй брыгады. «Мне здалося,— піша далей аўтар, — што яны глядзелі на яго са здзіўленнем, — маўляў, запомніў жа! Я вырашыў праверыць сваю здагадку і спытаў ва ўсіх: хто працаваў тады на вышыні акрамя Клімко і Юневіча? Хлопцы пазіралі адзін на аднаго, стараючыся ўспомніць. Усе разам знайшлі яшчэ траіх смельчакоў. Апошнім «апазнаў» сябе Яўген Барадзёнак...

Ёсць мужнасць, якая становіцца натуральнай рысай характару. Яе не заўважаюць, як часам не заўважаюць сваіх звычак».— Такое рэзюме робіць аўтар.

У працытаваных словах — сутнасць аўтарскай манеры Ю. Сапажкова: не проста падаць той ці іншы факт, а толькі ўсебакова даследаваўшы яго. Таму чытаеш кнігу і бачыш, што аўтар думае, перажывае, нечым абураецца, аналізуючы тыя ці іншыя жыццёвыя з'явы, учынкі герояў. Актыўнасць аўтарскай пазіцыі робіць кнігу па-сапраўднаму публіцыстычнай. Кожны твор Ю. Сапажкова ўяўляе сабой так званы нарыс-партрэт, прычым, нарыс газетны — і па памерах, і па стылю. У часопісах такія творы звычайна ставяць пад рубрыку «Штрыхі да партрэта».

Сапраўды, да некаторых замалёвак Сапажкова жанравае вызначэнне «нарыс» можна аднесці з нацяжкай, калі разглядаць іх паасобна. Ды вось сабраныя разам, умела скампанаваныя гэтыя «штрыхі» набываюць цэласнасць і як бы ўтвараюць адзін шматпланавы нарыс.

Кніга мае падзагаловак «Нарысы пра камуністаў». Ужо знаёмыя нам будаўнік Зайцаў, сакратар парткома Яроцкі, шліфоўшчык Нікіфараў, чыгуначнік Пражко, настаўніца Дзямідчык, шахцёр Арыстаў... Адзін-два факты з біяграфіі, сціслая аўтарская рэмарка — і перад намі паўстае абагульнены тып нашага сучасніка, чалавека высокага грамадзянскага пачуцця і шчодрай душы, актыўнага пераўтваральніка ў жыццё планаў партыі. Значыць, і «штрыхі да партрэта», калі яны зроблены ўмелай рукой, могуць стаць штрыхамі часу ў добрым сэнсе слова.

Не ўсё ў зборніку раўнацэнна. Там, дзе аўтар не падмацоўвае наогул правільныя думкі, атрымліваецца рыторыка, маралізаванне без палстаў. Маю на ўвазе замалёўкі «Лёнькава кладка», «Што ты стварыў?», «Біёграф зямлі» і некаторыя іншыя. Высокія словы тут, на жаль, засталіся без трывалага падмурка — ёмкага факта, удала заўважанай жыццёвай з'явы, што характэрна для лепшых нарысаў Ю. Сапажкова.

Анатоль КАЗЛОВІЧ.

Ю. Сапажкоў. Тыя, што нясуць святло. (Нарысы аб камуністах). На рускай мове. Мінск, «Беларусь», 1976.

Да ўзораў прафесіянальнай рэцэнзіі хочацца аднесці аналіз анталогіі беларускай паэзіі, якая выйшла ў 1971 годзе ў Лодзі.

Нельга не далучыцца да той ацэнкі, якую дае Ул. Калеснік працы Я. Семяжона над перакладам «Песні пра зубра» М. Гусоўскага («Вяртанне зор»). Уласна перакладу ў гэтым цікавым артыкуле адведзены толькі падраздзел «Перастварэнне», аднак і тут выказаны арыгінальныя думкі, якія можна аспрэчваць, але ад якіх нельга адмахнуцца (скажам, думка аб новым варыянце перакладу).

З асаблівым пачуццём чытаюцца «Будзённы дзень з Максімам Танкам» і «Здымак у жыццё» — творчы партрэт Я. Брыля. Прывабнасць гэтых раздзелаў ва ўменні аўтара паказаць чалавека як арганічную і гарманічна цэласную асобу, паказаць яго не толькі ў тыя моманты, у тыя імгненні, калі ён здольны чуць і разумець «Зорны спеў», але і ў самай будзённай сітуацыі ўбачыць у мастака праявы высокага духоўнага напружання.

Ул. Калеснік — не толькі дапытлівы і арыгінальны вучоны. Талент даследчыка ён спалучае з дарам дасціпнага і цікавага апавядальніка. Ёсць, праўда, у новай кнізе і мудрагелістыя пасажы, накшталт: «... Фальклорная фантазія, вызваленая ад анімізму, набывае новыя паэтычна - сэнсавыя пазнавальныя магчымасці, яна ставіць прадметы, з'явы, характары ў такія неверагодныя сітуацыі, у якіх выяўляецца іх скрытая каштоўнасць або антыкаштоўнасць, увасабленне набывае незвычайную мадальнасць...» і г. д.

Усё гэта, урэшце, можна расшыфраваць пэўным чынам. Яно стасуецца да пераўвасаблення фальклорнай вобразнасці ў сучаснай паэзіі М. Танка. Але ж аўтар можа і пра рэчы не менш складаныя гаварыць і больш даступна, і пераканаўча. Артыкул напісаны ў сціплай манеры «надарожнага дзённіка», у якім «запатавана» сумесная паездка з М. Танкам у глыбіннае палескае сяло Моталь. Ёсць у гэтым эсэ карціны-малюнкі, створаныя ўпэўненай рукой мастака-празаіка. Варта прыгадаць сцэну ў праўленні калгаса ў Моталі, у якой як бы «ажываюць» і завуч школы, і старшыня калгаса, і сакратар парткома. Значную частку артыкула складае цікавы, насычаны новымі фактамі расказ пра даверасняўскую дзейнасць Танка, шмат месца займае аналіз яго сучаснай паэзіі.

Пасля «Здымка ў жыццё» — неяк яшчэ больш паважаеш Брыля-чалавека, глыбей успрымаеш яго творчасць.

«Калі ў нашу партызанскую стаянку на ўскрайку Налібоцкай пушчы прыйшлі ўсе тры браты Коля, Міша і Янка Брылі, неяк пасвятлела над кашлатымі елкамі...» На такой жа даверлівай ноце ідзе гаворка і пра творчасць пісьменніка-друга.

Вось маленькі штрышок да партрэта Я. Брыля: «Не падта любіць ён фатаграфавацца, але ўгаварыць яго можна заўсёды, калі фонам да здымку выбераш жыта, нават сам запрапануе... Стомлены ў дарозе, Янка Брыль часта шукае месца каб прылегчы недзе ля жыта, і, лежачы дагары, глядзіць, як на блакітным небе важка гойдаюцца залатыя каласы. Тут хутка праходзіць стома. Можа, спракавечнае хлебаробскае пачуццё ўнутранай бяспекі сыходзіць на чалавека: калі вырасла жыта, дык будзем жыць, перазімуем. Ля хлеба бяспечна думаць пра нешта больш высокае, чым хлеб надзённы...»

Спакуса цытаваць такія мясціны ў кніжцы крытыка вялікая. Але хай чытач не думае, што крытык занадта ідылічна - паблажлівы. Яго адданасць літаратуры дазваляе яму, не хаваючы сваіх чалавечых і мастацкіх сімпатый, быць вельмі патрабавальным і ў адносінах да такіх любімых пісьменнікаў, як М. Танк і Я. Брыль. І калі ён заяўляе, што «Птушкі і гнёзды», гэтую «кнігу адной маладосці» можна назваць інтэлектуальным раманам, раманам-паэмай, то імкнецца даказаць гэта не гучнымі словамі, а аналізам.

Як сведчыць Ул. Калеснік, аднойчы Я. Брыль зазначыў што «акрамя пісання ў пісьменніка ёсць многа работы — чытаць, перакладаць з іншых моў, выконваць грамадскія абавязкі, а галоўнае — думаць».

Чытаць такія кнігі, як «Зорны спеў» — занятак не марны. Яны і прымушаюць нас думаць.

Генадзь ШУПЕНЬКА.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

Б. Сачанка. Тры аповесці. Мастак А. Часноў. 1976 г. 238 стар. Тыраж 14.000 экз. Цана 61 кап.

А. Масарэнка. Журавіны пад снегам. Аповесці, апавяданні. Мастак М. Басалыга. 1976 г. 224 стар. Тыраж 10.000 экз. Цана 43 кап.

В. Буран. Васіль Быкаў. Нарыс творчасці. Мастак М. Казлоў. 1976 г. 222 стар. Тыраж 5.000 экз. Цана 72 кап.

Л. Дайнека. Бацькава крыніца. Апавяданні. Мастак Г. Малышаў. 1976 г. 160 стар. Тыраж 10.000 экз. Цана 22 кап.

В. Вярба. Выбранае. Мастак М. Казлоў. 1976 г. 270 стар. Тыраж 6.000 экз. Цана 89 кап.

М. Аўрамчык. Радовішча. Вершы. Мастак А. Жэлдакоў. 1976 г. 78 стар. Тыраж 9.000 экз. Цана 24 кап.

М. Дукса. Прыгаршчы суніц. Лірыка. Мастак У. Даўгань. 1976 г. 110 стар. Тыраж 5.000 экз. Цана 30 кап.

Ю. Голуб. Векапомнае поле. Вершы. Мастак М. Лазавой. 1976 г. 64 стар. Тыраж 5.000 экз. Цана 16 кап.

У выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшлі новыя кнігі для дзяцей. Змяшчаем іх вокладкі: «Лясныя прыгоды» М. Ваданосава (мастак Ю. Пучынскі), «Мядзведзеў пачастунак» З. Бяспалага (мастак Ю. Зайцаў), «Арктур — гончы сабака» Ю Казакова (мастак Л. Зяневіч, пераклад А. Жука), «Самая доўгая ноч» Д. Бянькоўскай (мастак В. Александровіч, пераклад Я. Бяганскай).

Напісаў новую аповесць — другую з задуманых чатырох — пра сучасных настаўнікаў. Яна лагічна з'яўляецца працягам надрукаванай ужо «Усё яшчэ наперадзе».

У новым творы дзейнічаюць не толькі вядомыя ўжо героі, але і новыя персанажы, раскрываюцца іншыя праблемы, разгортваюцца многія падзеі школьнага і асабістага жыцця педагогаў.

Прапаную ўвазе чытачоў урывак з новай аповесці «Міланькі».

Генрых ДАЛІДОВІЧ.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Міхаіл Апанасавіч і Каця

Конюх Мікола — у старой, выбеленай ад вотруб'я куфайцы, у падвязанай на патыліцы шапцы-вушанцы, якая ўнізе выпацела, выцерлася аб шыю і была без падкладкі, у гумовых ботах, чырванашчокі — вывеў з цёплай канюшні высокага белага, з чорнымі плямамі на баках каня, падвёў яго да калёс і паставіў між аглабель.

— Дзякую, — сказаў Міхаіл Апанасавіч, бачачы, што конюх не толькі апускае долу лейцы, але і бярэцца за хамут, які ляжаў ужо на добра падмазаных калёсах. — Я сам запрагу.

— Ды ладна, мы — людзі не ганаровыя, паможам... А то, можа, ужо і забыўся, як ушчэмліваць каня ў аглоблі... — пажартаваў вельмі вясёлы сёння Мікола, мігам беручы хамут і нацягваючы яго на задраную ўверх конскую галаву, а пасля пераварочваючы гужамі ўніз. — Станеш гаспадаром у Каці, то на чарку калі заклічаш...

«Хоць крыху і старэйшы я па гадах, але невысокі, тонкі. Словам, не надта салідны... — падумаў Міхаіл Апанасавіч. —Вось ён так смела і гаворыць са мною, пакеплівае...».

— Чаго маўчыш, як вады ў рот набраў? — як здзівіўся Мікола, папраўляючы пад хамутом конскую грыву, зірнуў, шырока раскрываючы белазубы рот, вышэй і ніжэй якога сінелася густая невялікая шчэць. — Мусіць жа, ужо добра прыгрэўся ля яе? Га? Не дарэмна, я табе скажу, зусім не дарэмна, — пры гэтым ён хітра прыжмурыў левае вока, —яна ўханіла цябе ў кватаранты. Нябось хлопца якога маладога ці дзяўчыну не ўзяла, а цябе во, сталага, пад свае гады, так сказаць, прыняла...

— Трэба ж і мне, прыезджаму, недзе жыць... — заступіўся і за сваю маладую, добрую, працавітую, што пчала, гаспадыню, і за сябе далікатны Міхаіл Апанасавіч. — Так што не трэба абы-што гаварыць на спагадлівую жанчыну... — Прамовіў, накруціў, падкарочваючы, гуж, падняў аглоблю і ўсунуў у гужавую пятлю дугу, другі канец яе цераз шыю каня падаў Міколу, які гэтаксама ўжо накруціў гуж, зачапіў ім за дугу, ад чаго дужкі хамута шырока раз'ехаліся.

— Трэба то трэба, гэта ясна...—загуў Мікола, каленам ціснучы на правую хамутовую дужку. — Але ж яна — ты толькі не абіжайся, — я табе скажу, ніколі кватарантаў не брала. А гэта ні з таго ні з сяго падахвоцілася... Не злуй, калі табе гэта не надта будзе наравіцца, але я табе скажу: я добра ведаю, чаго яна хоча... Яшчэ як ведаю, я табе скажу... — ён заматаў ужо на хамутовыя дужкі пасак, завузліў яго, ад чаго дуга зусім сціснулася ды выгнулася. — Часта прыходзіла дагэтуль да мяне то каня напрасіць, то баразну якую разараць... Пашчыплеш у кладоўцы за бокі — дык рагоча, я табе скажу, агнём у вачах бліскае... Ну, а я чалавек не ганаровы, табе скажу, то раз сёлета падурэлі так, і я прыціснуў яе тут, у загарадцы з сенам. Дык, ведаеш, я табе скажу, надта і не адбівалася, загарэлася ўся як агонь... Не ведаю, што было б, калі б не людзі... Як выпусціў з рук, дык у другі канец канюшні марсянула... Далей ад людскіх воч... Вот што я табе скажу, а ты сам кумекай, — бо ў цябе не мая дурная, а разумная галава, — што гэта значыць...

Міхаіл Апанасавіч, ціха тоячы сорам і нават злосць на залішне гаманкога конюха, прамаўчаў, адвязаў ад падсядзёлка кавалак старой сашмараванай ляйчыны — церассядзельнік, — прывязаў да аглоблі, другі канец кінуў цераз спіну каня на той бок. Там яго перахапіў Мікола, падняў аглоблю і падняў каня.

— Ты не злуйся, калі я замнога лепячу языком... — той паправіў падсядзёлак, а пасля пасак пад конскім жыватом. — Прыставай у прымы, я табе скажу, калі бярэ. Не глядзі надта, што простая баба, а не настаўніца... — сказаў гэта ўжо не з насмешкай, а шчыра. —І маладая яшчэ, імчаць будзе, што воз з гары, і спраўная... За бабу і за мужчыну робіць... — і, бачачы, што яму не адказваюць, запытаў: — Куды паедзеш?

— У лес, — адказаў Міхаіл Апанасавіч.

— Тады не бяры драбін, — сказаў той і сам зняў іх з калёс, паставіў ля сцяны канюшні. — Каня не кілзай, а то вострыя цуглі, губы парэжаш... — прамовіў, сеў на цагляную прызбу, дастаў з кішэні замусоленую пачку, узяў адну цыгарэціну, пастукаў па далоні, прыпаліў, зацягнуўся і пусціў дым долу, на свае тоўстыя літыя гумовікі.

Міхаіл Апанасавіч, спяшаючыся і саромеючыся Міколавых дапытлівых і смелых позіркаў, хутка падлажыў пад дугу новыя цвёрдыя лейцы, выцягнуў іх, сеў на старой, учарнелай ляжанцы — дзвюх збітых на канцы перакладзінкамі дошках, — на якой сёлета за лета і за гэтую раннюю восень многа чаго паперавозілі, бо відаць была на ёй то сухая кара, сена, то мох, спусціў ногі і турзануў лейцамі каня.

Прысохлыя калёсы крануліся, для чаго каню прыйшлося крыху папяцца, аж рыпнула дуга, загрукацелі па сухіх калдобінах.

Міхаіл Апанасавіч ездзіў ужо ў лес не раз. Яшчэ на пачатку верасня прывёз Каці сухастою, бярозавага галля, што валялася на працярэбленай нядаўна лініі, пасля прытарабаніў два вазы смалістых карчоў. Цяпер вось ехаў па хваёвыя жэрдкі, якія пасек на тым тыдні, каб паставіць цяпер, восенню, ці ўжо вясною новы плот.

Каця, напраўду ці крышку хітруючы, адгаворвала яго ад гэтай і іншай гаспадарскай работы (стаўшы тут кватарантам, ён ахвотна памагаў ёй па гаспадарцы), але была ўсё ж вельмі рада, што памагае. Пасміхалася, смачней карміла, часта мяняла пасцель і пазірала на яго заўсёды добра, з павагаю. А яму было не толькі добра на душы, што памагае адзінокай гаротлівай кабеце, але чамусьці не раз і крыху сорамна. Ён пачаў бянтэжыцца, калі заставаўся з ёю адзін, пазіраў ёй у вочы, бачыў, што яна дзеля яго стараецца яшчэ ў большай чысціні трымаць хату, сама харашыцца... Акрамя сораму, адчуваў яшчэ і дзіўнае хваляванне ад жыцця пад адною страхою з маладою кабетаю, адчуваючы, што ён усё ж мужчына і ў яго — як гэта доўга здавалася — не зусім перагарэлі чалавечыя пачуцці ды жаданні...

Ён бачыў, што падабаецца ёй; быў рады; толькі крышку з сорамам, крышку з нейкай крыўдай адчуваў, што падабаецца не так, як маглі б быць да спадобы вясковыя мужчыны, а прыемна ёй, што ён настаўнік, «чысты чалавек», што жыве ў яе і памагае, зусім не ганарыцца ці не баіцца вясковай працы, што амаль зусім не п'е гарэлкі і мае добрую плату. Не раз ён, думаючы пра ўсё гэта, гадаў: можа, дарэмна чакаць у яго ўжо немаладыя гады не жаночага добра абдуманага разліку, а сляпога юнацкага кахання, але ўсё ж хацелася, каб ён быў пакаханы як чалавек, каб былі адчуты і яго пачуцці... Але — як не жадаў патаемна нечага святога і далікатнага да сябе — сам жа часамі здзіўляўся, што ён да Каці адчувае гэтаксама нешта падобнае, што, можа, адчувала і яна — «а разам жа жыць можна...». Можа, вось, ведаючы такія свае думкі, так часамі саромеўся Каці, да якой пра свае пачуцці, думкі не загаворваў і якая гэтаксама не заводзіла пра гэта гутаркі, хоць часта-часта ў размовах была блізка да гэтага. Таму даўнавата ўжо адчувалася, што ў іх «нешта ёсць...».

Міхаіл Апанасавіч патурзаў лейцамі каня, цмокнуў, каб той падбег — каб заехаць дамоў, узяць сякеру і ланцуг, з'ездзіць у лес, забраць жэрдкі, прывезці, адвесці на канюшню каня і паспець на першы ўрок другой змены.

Паехаў не вёскаю, а крыху далей ад людскіх вачэй — сценкаю.

...Малады зялёны сасняк яшчэ пахнуў цёплаю свежаю смалою, летнім пылам і сухою, даўно ўжо нямочанаю зямлёю, хоць ужо і тут добра была відаць восень: з'явілася аднекуль павуцінне, стала рыжай трава, дзе-нідзе ляжала апалае жоўтае лісце, чырванеліся пад шыгаллем высокія мухаморы.

У старым лесе, які цяпер стаў нейкі спакойны без птушак, глухі, пажоўклы і пачарнелы, рэха не кацілася — як летам — збоку, а прападала ўжо тут, па дарозе — толькі чулася, як тупка бег па цвёрдай спежцы конь, як ляскалі, падскокваючы на карэннях колы, як амаль нячутна чапляўся за ногі абабіты, пабялелы пры дарозе верас, за якім — між высокіх сосен — бачыліся дзе-нідзе старыя пні, густа абсыпленыя дзікімі жоўтымі грыбамі ці лясною белай плесенню. І ад таго, што яна, плесень, ужо не сохла, а была вільготная, то зноў і зноў адчувалася: на дварэ ўжо халодная восень — пара, калі найчасцей і наймацней прыходзіць да яго смутак. Можа, і ад таго, што гэтым часам пекалі, гадоў дванаццаць таму назад, ён развёўся са сваёй прыгожай, але цяверпай жонкай...

Не надта маладым, высокім сасняком пад'ехаўшы да складзеных адна на адну жэрдак, ён прыпыніў ля іх каня. Адняў і падкінуў яму пад ногі сена, якое ўзяў у Каціным гумне і ўсю дарогу — каб яно не зляцела — сядзеў на ім, а сякеру трымаў па каленях. Скінуў з калёс ляжанку, дастаў ззаду воза шворан, адцягнуў заднія колы.

Паклаў на перадок камлямі дзве жэрдкі, прымяркоўваючыся, каб яны былі не надта блізка ад конскіх ног. За задок калёс зачапіў ланцуг, прапусціў яго праз колца, падняў дышаль, што быў прымацаваны да перадка, усадзіў у дышаль шворан і, пацягнуўшы, зачапіў за яго ланцуг, абкрукіў ім і дышаль, і дзве жэрдкі. Тады пачаў накладаць на расцягнутыя калёсы хвойкі, адчуваючы, як бярэцца, ліпне да рук мяккая смала, што выступіла буйнымі кроплямі на ссечаных і ацярэбленых мясцінах.

Як ускінуў усе жэрдкі, — а яны, накладзеныя адна на адну, дасталі каля паловы ручак, — падумаў, што трэба яшчэ ссячы хоць некалькі сосен. Узяў сякеру і адышоўся ад воза, задраў галаву і пачаў выглядаць высокія і тонкія хвойкі, жмурачыся ад высокага светла-блакітнага, але самотнага, як апусцелага ад страчанага цяпла неба. Ішоў і нечакана ўспомніў, што на днях будзе дзень параджэння старэйшай дачкі.

Ён кожнага года да яе імяніп пасылаў ёй падарункі, бо за развітальныя гады перагарэла сэрца па былой жонцы, а па любімай дачушцы ныла яшчэ моцна і цяпер...

* * *

Каця, невялікая ростам, не зусім тонкая, але і не поўная, вельмі загарэлая на твары, дужая і здаровая кабета, вярнулася з саўгаснага поля позна, калі ён, Міхаіл Апанасавіч, прывёз з лесу сасновых жэрдак, адвёў на канюшню каня, ужо адвучыў другую змену і прыйшоў дахаты.

— Вы, мусіць, вельмі прагаладаліся ўжо? — сустрэўшыся ў дварэ, усміхнулася яна, усміхнулася, хоць была і стомленая.

— Ды, не, — адказаў ён, адчуваючы, што напраўду хоча есці, але не стаў прыспешваць, каб яна тут жа гатавала вячэру: ведаў, што ёй яшчэ многа клопатаў ды працы па гаспадарцы.

Ён з хвіліну пазіраў на яе кругленькі твар з невялікім роўным носам, з чырвонымі ад ветру і дажджу шчокамі, бачыў здароўе на ім, заўважаў гарэзлівыя агеньчыкі ў яе кругленькіх вочках, адчуваючы, сарамлівае хваляванне. А як яна яшчэ ўсміхнулася, зірнула пільна і з нейкім маладым выклікам, зусім разгубіўся, заміргаў, збянтэжыўся, чуючы, як нешта перахоплівае дыханне.

— Зараз, людзі мае, усё зладзім... — спахапілася Каця, што хвілінку пастаяла, і неяк ненатуральна моцна загаварыла да дачок, загадала тым абіраць бульбу, а сама скінула куфайку, атрэпала яе аб плот ад пяску, застаючыся ў даўгаватай сукенцы з кароткімі рукавамі, пачала ўходжвацца.

Работа, як гавораць, гарэла ў яе руках. Яна хутка і амаль у адну хвіліну рыхтавала едзіва свіням і курам, пасіла гэта ў загарадкі і праз міг ужо вярталася адтуль з трэскамі, кідала іх ля трыпожніка, што стаяў у дварэ ля плоту над чорнымі галавешачкамі і размытым вадою прысакам, бегла да печа-га другога. Зрэдку кідала на яго хуткія позіркі і, пылаючы суха на шчоках, усміхалася.

Ён, бачачы гэта і трывожачыся, прысеў ля трыпожніка, паламаўшы, налажыў пад яго сухіх і смолкіх трэсак і, як гаспадыніныя дочкі, такія ж рупліваія, бегатлівыя, як і маці, наабіралі ўжо бульбы, прамылі яе, падпаліў папяруну і сунуў яе пад трэскі. Наўмысна доўга пазіраў на кволенькі жоўта-чырвоны агонь, паціху паддзьмухаў пад яго, каб не сустракацца з Каціпымі позіркамі.

Калі ўжо старэйшая гаспадыніна дачка, прынёсшы аберуч, паставіла на трыпожнік гаршчок з бульбаю і вадою, накрыла яго зялёным вечкам ад каструлі, вярнулася з поля карова. Была яна высакаватая, не надта поўная, але вельмі ўдойная—і цяпер, вераснем, давала ледзь не па поўным вядры малака. Ад таго ў хаце хапае і смятаны, салодкага малака і кіслага, і тварагу ды сыру. Карова вялікая не раз добра не наядаецца ў полі, то Каця яшчэ ўжынае ёй штодня травы з узмежкаў. Вось і цяпер яна вынесла з дрывотні і кінула ў куток двара ахапак звялай зялёнай канюшыннай атавы—і карова ахвотна падышла да яе, узялася есці, раз за разам матляючы галавою, ад чаго закідвала на спину траву.

Управіўшыся па гаспадарцы, Каця вынесла з хаты цёплай вады, вымыла ёю каровіна вымя, абперла яго сухім ручніком, села на столачку і пачала даіць. Пачуўшы пах сырадою, прыбег аднекуль з-за хлява рыжаваты кот, падняў кароткі хвост, замяўкаў, тручыся ля гаспадыніных ног.

— Естачкі захацеў? — жартам падражніла яго Каця.—Ах ты, стары гультай! А хто ж мышэй будзе лавіць? Бегаюць вунь па кладоўцы, як коні...

Міхаіл Апанасавіч усміхнуўся, бачачы, што гаспадыня вельмі паважае ката і сабаку, хоць не раз і кажа, што «замест гэтых гультаёў можна было выкарміць добрага падсвінаку», але зводзіць ката і сабаку не збіраецца. Відаць, ёй было смялей з імі жыць...

— Ну , як там, Апанасавіч, мае вучаніцы? — запытала Каця ў яго, бачачы, што ён сядзіць паблізу і не ведае, што рабіць, а то і саромеецца, запытала, хоць і добра ведала, што ён не вучыць яе дачок. — Усё гаварэце, каб я ведала.

— Дзеці як дзеці, — адказаў ён. — Ніхто на іх не наракае. Старанныя, працавітыя.

— Працуюць, бо жыццё прывучыла... — уздыхнула Каця. — Большая го

добра вучыцца, сама ведаю, а вось меншая слабенькая...

— Двоек жа не мае... Падрасце, то і здароўе направіцца... — сказаў ён, ведаючы, што Каця вельмі любіць, калі хто хваліць яе дачок.—А цяпер яе рост такі цяжкі...

— Можа і так, — згадзілася яна.

Дочкі ж, слухаючы гэтую размову і сарамліва ўсміхаючыся, усё яшчэ бянтэжачыся яго, новага і ў доме чалавека і настаўніка, невялікімі бярэмкамі прынеслі ў хату дроў, намылі свіням бульбы, насыпалі яе ў гаршкі, каб маці адразу заўтра ранічкай магла паставіць іх у гарачую печ. Як толькі памылі рукі, адразу шмыгнулі ў хату.

— Брыдка во за троечкі... — усміхнулася Каця, якая падняла́ся ўжо, ішла да сянец з ледзь не поўным вядром малака, якое наверсе ўспенілася, пахла па ўвесь двор.

— Дзеці ёсць дзеці, — заступіўся ён. — Але няма чаго маракаваць, яшчэ добрыя ў вас дочкі...

— Яны ў мяне і дома, і ў школе стараюцца, хоць, можа, і не ўсё ім удаецца,— зноў з гонарам сказала Каця, — не гуляюць попусту, як у другіх...

Яна паставіла паблізу агню столачак, на яго — вядро з малаком, а сама падалася ў хату і хутка вярнулася з бляшанкаю і цадзілкай. Паклала жаўтаватую цадзілку на бляшанку, абціснула яе, падняла вядро, перагнула крыху і пачала ліць з яго малако, якое адразу ж гучна заструменіла па дне.

— Пакіну і табе, — міралюбна сказала кату, які ўсё цёрся ля яе ног, абутых у гумовікі.

Усё малако з вядра не ўлезла ў бляшанку. Каця дапільнавала, калі яно перастала цадзіцца, узняла цадзілку і астатняе прападзіла ў двухлітровы слоік— на вячэру. Крыху з дна вядра паліла кату ў кансервавую банячку, што з загнутым набок пачарнелым вечкам стаяла ля сянец.

Бляшанку Каця апусціла ў студню, а слоік занесла ў хату.

Калі вярталася адтуль, несла ў руцэ кубак. Міхаіл Апанасавіч ведаў, што гэты сырадой яму. Ён выпіў і падзякаваў.

— Піце на здароўе, — спакойна, як надта нічога такога добрага і не зрабіўшы, адказала яна. — Самі бачыце, малака хапае. Ды і другога чаго, хоць і без гаспадара жыву, ёсць. Не многа, але ёсць. Карова добрая, це прагаварыцца толькі, два парсючкі гэтаксама ладныя. Сена пачці сабрала за лета, дроў тожа хваціць на зіму. Толькі вот па мужчынскай часці вялікія непаладкі — плот пагніў ды паваліўся, веранда ды страха во абы-якія, што, здаецца, і не глядзеў бы, падпаветка развалілася... Ды па добры толк, і хату ўжо варта было б ашаляваць, бо надта ж халодная ўзімку...

— Страху то позна ўжо раскрываць, бо восень на дварэ, — сказаў ён, бачачы, як яна, абцягваючы на поўныя калені сукенку, прысела ля агню, зняла вечка і ткнула відэльцам у бульбу. — А плот можна яшчэ і цяпер надмаладзіць...

— Хіба мая гэта работа, Апанасавіч? — клапатліва, моршчачыся ў пераносcі, прамовіла яна. — Ці час на гэта надта маю?

— Пагаварыце з лесніком, хай яшчэ дазволіць высекчы сасняку ды дасць на шулы, то я за восень пакрысе і перасыплю ўвесь частакол, — сказаў ён, — усё роўна мне да полудня няма чаго рабіць, то памагу.

— Будзеце вы рукі мазаць... Гэта мы ўжо прывыклі да ўсякай работы...

— І я ж не беларучка. Увесь час жыву ў вёсцы, раблю вясковую работу, —сказаў ён. — Калі быў жанаты, то і гаспадарку сваю меў, усё сам рабіў. І настаўнічаў, і дома спраўляўся...

Каця, уважліва слухаючы, з павагаю паглядзела на яго, але затрымала позірк толькі на міг: сустрэўшыся з ягоным позіркам — тады зноў ажыло між імі гэтае недагаворанае, — адразу ж апусціла галаву, пачала глядзець на агонь.

— Я ж здалёку замуж сюды прыйшла, то і цяжка, бо адна жыву, без радні...— прамовіла яна. — Няма як спадзявацца на чыю помач, трэба толькі ўсё самой...

— Нешта будзе, — заспакоіў ён. — Дзяцей на ногі паднялі ўжо, гаспадарку не толькі не запусцілі, але яшчэ і больш падладзілі.

— Ды не прападзем жа, абы здароўе бог даў...—згадзілася яна.— А я, дзякуй богу, яшчэ добра чуюся... Шчасця вот толькі малавата... Ляпей сем разоў згарэць, як адзін раз аўдавець... Ды ў маладым веку... — усхлипнула, шморгнула носам, але ўтрымалася, не заплакала, хутка выцерла падолом вочы, зірнула на яго і, чамусьці як саромеючыся ці позіркам просячы, каб ён цяпер нічога не гаварыў, усміхнулася. Пры гэтым не варухнула нават вуснамі, не міргнула вокам, усміхнулася толькі позіркам, выказваючы да яго вялікі давер.

— Ну, во і гатова бульбачка... —прамовіла пасля, зноў ткнуўшы відэльцам. Пасунула на край вечка, абхапіла гаршчок анучаю, падняла яго, паднесла да плоту і адцадзіла рэшткі кіпятку на зямлю. — Пайшлі, Апанасавіч, вячэраць, а то ўжо, мусіць, добра вымерхаліся, — сказала і падалася ў хату.

Ён гэтаксама пайшоў, убачыўшы, як ад шыбін адарваліся дзіцячыя тварыкі— відаць, дзяўчынкі сачылі за ім і за маці.

Калі памыўшы на дварэ рукі, зайшоў на кухню, то бульба ўжо ляжала на стале і парыла ў вялікай місцы. Каця відэльцам, адніхаючы вішаннік, лісце хрэну, часнаку, даставала з вядра салёныя гуркі, клала іх, зялёныя, цвёрдыя, у талерку. Пасля дастала з паліцы загорнуты ў паперу, на якой самапіскай была напісана цана, кавалак купленай каўбасы, парэзала яго, паліла ў кубкі кіслага малака.

Затым схадзіла ў другую палавіну і прынесла адтуль напалавіненую гарэлкай пляшку, заткнутую гумавым коркам.

— Не трэба, — прамовіў ён, саромеючыся не так Каці, як яе дочак-вучаніц.

— На апетыт трохі... — усміхнулася Каця, наліла яму з палавіну шклянкі, а сабе зусім крыху. — Ну, будзьце здаровыя... — сказала, але пастаралася не зірнуць на яго, не глядзела: бярэ ён чарку ці не, выпіла, прыкрыла рот рукою.— Фу, як яе толькі п'юць!

Ён паволі выпіў, моўчкі пачаў закусваць.

— А можа, і гэта дап'яце? — спытала пасля. — Кропля тут засталася, што вам значыць, мужчыне...

— Ды хопіць, — усміхнуўся ён, — прылягу яшчэ да гэтай халеры...

— Гэтая халера толькі дурных ды прагных губіць, а разумнага чалавека не звядзе... — сказала яна. — Вы то выпіце, а я не буду болей, бо і так слабая мая галава закруцілася...

Дзеці ўжо ўволю пад'елі і выйшлі з кухні.

— Ну, бярыце на здароўе, — падахвоціла зноў яна, яшчэ больш чырванеючы ў твары, становячыся лагоднай.

Выпіўшы, ён зноў пачаў есці, а яна яшчэ дастала гуркоў, нарэзала каўбасы. Сама не ела больш, сядзела паблізу, як радуючыся, што сядзіць разам з мужчынам і той смачна есць тое, што яна прыгатавала, і не толькі ўплятае, але і ў душы дзякуе ёй.

— Спадабалася вам у нас, Апанасавіч? — запытала пасля яна з хваляваннем у голасе.

— Ды добра... — адказаў ён, зірнуў на яе, яшчэ зусім маладую, ружавашчокую, прыгожую, і адчуў такое хваляванне, якое даўно ўжо не адчуваў: прыйшоў вялікі смутак па жанчыне — па жонцы, сяброўцы, маці яго дзяцей, — па ўсім тым, без чаго, відаць, не можа жыць усякі разумны ды здаровы чалавек.

— Ці добра вам тут выходзіць? — як ужо між іншым запытала Каця, прыбіраючы стол.

— Ды рублёў сто трыццаць...

— Добра, — сказала яна, — Гэта ўжо вялікія грошы. Я во па сям'ю пяцьдзесят-шэсцьдзесят палучаю...

Ён нічога больш не адказаў, закурыў, глядзеў, як увішна ўсё робіць гаспадыня і адчуваў трывожнае хваляванне ад блізкасці жанчыны...

У канцы мінулага года мне давялося быць на Крайняй Поўначы нашай Радзімы — на Таймырскім паўвостраве, дзе я наведаў індустрыяльную сталіцу гэтага вялізнага і своеасаблівага краю — Нарыльск і яго адміністрацыйны цэнтр Дудзінку, зрабіў вельмі карыснае падарожжа-экскурсію ў царства тундры з яе непаўторнай фаунай і флорай, сустрэўся і добра пазнаёміўся з цікавымі людзьмі, у тым ліку з нашымі землякамі-беларусамі. Вынікам усяго гэтага і з'явілася некалькі нарысаў і нізка вершаў, частку з якіх я і прапаную чытачам штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва».

Павел ПРУДНІКАЎ.

НАРЫЛЬСК

У тундравым царстве,
на поўдні Таймыра,
Ля ног дзвюх абгрызлых,
абветраных гор,
Стаіць ён, празваны
«Паўночнай Пальмірай»,
І трубы нацэліў
у неба, да зор.
Грыміць і грукоча
няўрымслівы горад,
Глытаючы тонамі
вугаль, руду.
Плавільныя печы,
гігант-аўтамолат
Не моўкнуць—
гудуць і гудуць.
У грукаце-гудзе
пад свіст завірух!
Кіпіць, нараджаецца
цуда-метал.

Павел ПРУДНІКАЎ

ЛЮДЗІ ЗАЎСЁДЫ Ў НОВЫХ УЗЛЁТАХ...

Я гэтую песню
не раз ужо слухаў
І з ёю на крылах
у марах лятаў.
Бывае, што горад
патоне ў сумётах,
І сцены яго
ад мароза трашчаць.
Ды людзі заўсёды
у новых узлётах,
Іх сэрцы натхнёна,
мажорна гучаць!

ТАЛНАХ

Ёсць на поўдні Таймыра куток,
Яго «райскім» завуць у народзе.
Там паветра адзіны глыток,
Быццам зноўку на свет вас народзіць.

Ён аблашчаны гоманам дрэў,
Ціхім шэпатам хваляў азёрных.
Там міжвольна ты будзеш мудрэць,
На блакіт пазіраючы зоркі.

Запазычыў імя ён Талнах,
У рачулкі, празрыстай іскрынкі,
Што пачатак бярэ у гарах
І ўліваецца ў воды Нарылкі.
Па ствалах, што на рудных дварах,
Што навечна ў зямлю паўрасталі,
Чалавек падае на-гара
Руды чыстыя поліметалаў.

Вось які яго сённяшні дзень,
Бо Талнах яшчэ мерыць і кроіць.
Ну, а заўтра, я веру, што ён
Прыгажосць і багацці патроіць!

●

Тут у цэху і цёпла, і светла,
Нікель з печы сцякае ракой,
Пах тут серы чуцён у паветры.
Свае клопаты, свой неспакой.

А за вокнамі—круціць і вые,
А за вокнамі—студзіць, пячэ.
І сумёты ляжаць снегавыя,
Цемень доўгіх зімовых начэй.

Не відаць ні дарог, ні сцяжынак,
Ледзь мігцяць на слупах ліхтары
Ды паблізу стаяць старажылы—
Дзве,
як помнікі тундры,
гары.

ВЯСЕЛЛЕ

Я запомніў малюнак такі—
Непаўторны, спрадвечны і мудры,—
Як танцуюць вясной кулікі
На прасторах заснежанай тундры.

Круг за кругам, прыжок за прыжком...
І каханне, і рэўнасць пад песні.
Я там быў ганаровым дружком
На вяселлі цудоўнейшым, веснім.

Паглядзелі б на гэты канцэрт:
На рухавасць, на танцы, на страсці!
У ім свой, самабытны акцэнт,
Свая радасць, птушынае шчасце.

Павел МАРЦІНОВІЧ

...ДАСПЕЛІ ГРОНКІ АРАБІНЫ

ВЯЗЫНКА

Вось тут,
у хатцы, простай, як сляза,
І нарадзіўся некалі Купала.
Ён нарадзіўся, каб пасля сказаць.
Што Беларусь у свеце не прапала.

І калі ёй прыйшлося напаткаць
Ліхую вестку, што памёр Купала,
Яна далонь да гэтага кутка,
Як да пакутнай раны, прыціскала.

●

Быў дзень крамяны, дзень асенні,
І твой настрой гаіла ўсё:
Бадзёры халадок басейна,
І парку зыркае лісцё,

П'янлівага паветра брага...
І ты падумаў паміж дрэў —
Што ўсё ідзе не так і блага,
Хоць і не так, як ты б хацеў.

ПЛЫНЬ

Заход праменіцца над водамі
Святлом стагоддзяў трапяткім...
І нас, як продкаў, поўніць одумам
Неспаманкая плынь ракі.

О, колькі
мігатлівых кропелек
Адзіхацела і сплыло...
Імён, падзей, надзей, захопленых
У незваротнасці палон.

Чаму, скажы, плынь хуткацечная,
Не забярэш ніяк з сабой
Валун, што лёг на плечы вечнасці —
Адвечны
чалавечы
боль!

●

Калі заззялі гронкі арабіны.
І мільганулі чырванню праз плот,
Журботай набрынялыя хвілінкі
Душу маю працялі навылёт.

Аб чым падумаў я тады: аб лёсе,
Аб тым, што я сустрэў і не сустрэў!
Што мне тады балючае здалося
У найшчымлівых барвах позніх дрэў!

Мо гэты сум прыйшоў яшчэ раней!
Ці, можа, быў у сэрцы штохвілінна!
Не ведаю, пра што падумалася мне,
Калі заззялі гронкі арабіны.

●

Дзень мінуў, напоўнены, як мех,
Гукамі: то крык, то плач, то смех
На мяне ляцелі штохвілінна,
Як лавіна.

І не мог
ратунку я знайсці,
І не мог
нікуды я сысці.
Уцячы.
Хоць лемантуй у скрусе:
Я — здаюся!

Дзень мінуў. Сцямнела за акном.
Хутка — ноч. Я атулюся сном,
Думкі і турботы адпусціўшы,

І тады якраз, калі сама
Прыляціць,
уночы, як сава,
Як дзіця начнога змроку —
Ціша.

ПРАЦА

Ад пакутлівых думак,
Дзён, працятых журбой,
Праца, ты — паратунак,
Паратунак мой.

Адмігцела надзея...
Ёсць адзін толькі цуд,
Ёсць адна панацэя —
Працуй!

Працай
(хай самавіта
каласяцца радкі),
Засланюся, як жытам,
Густым, трапяткім.

МАСТАК І НАРОДНЫЯ ПРОМЫСЛЫ

Артыкул міністра мясцовай прамысловасці БССР Д. А. Данілава «Гарызонты народных промыслаў», надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» 16 студзеня г. г., дае шырокае ўяўленне аб сучасным стане народных промыслаў, якія знаходзяцца ў сістэме мясцовай прамысловасці, аб адносінах да гэтага пытання названага міністэрства, дае падставу выказаць свае меркаванні па закранутых пытаннях і Саюзу мастакоў БССР.

Развіццё мастацкіх промыслаў — гэта не толькі важная народнагаспадарчая, але і, у першую чаргу, ідэалагічная задача, якая мае непасрэдныя адносіны да фарміравання нацыянальных культур, да эстэтычнага выхавання працоўных.

Вырабы мастацкай прамысловасці перш за ўсё павінны быць творамі мастацтва. Каб выпускаць іх такімі, натуральна, пры добрай арганізацыі сістэмы мастацкай прамысловасці, неабходны мастакі. Роля мастака павінна быць вядучай на прадпрыемстве.

У артыкуле «Гарызонты народных промыслаў» прыводзіцца лічба — 90 млн. рублёў. Такая сума будзе атрымана ў дзесятай пяцігодцы ад рэалізацыі мастацкіх вырабаў, выпускаемых на фабрыках мясцовай прамысловасці.

Між тым, на працягу 1973 — 76 гг. на мастацкіх саветах Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР разглядаліся толькі 68 твораў мастацтва, а ўсе астатнія работы, прынятыя і выпускаемыя мясцовай прамысловасцю Беларусі, не разглядаліся.

Галоўным напрамкам у развіцці мясцовай прамысловасці рэспублікі стаў выпуск строчавышытых вырабаў, якія складаюць цяпер звыш паловы ўсёй выпускаемай прадукцыі. Гэта чахлы на коўдры, павалачкі, прадметы туалета, адным словам, вырабы, якія не маюць дачынення да мастацкай прадукцыі і, тым больш, не з'яўляюцца творамі мастацтва. Міністэрства ж штомесяц разглядае падобную прадукцыю фабрык на мастацкіх саветах.

Атрымліваецца парадокс: мясцовая прамысловасць, закліканая выпускаць як мага больш мастацкіх твораў, новых форм дэкаратыўна-прыкладнога характару, створаных рукамі таленавітых мастакоў-прафесіяналаў і народных майстроў, займаецца выпускам немастацкіх вырабаў. Безумоўна, гэты тавар неабходны народу, ён карыстаецца вялікім попытам і, натуральна, павінен выпускацца, але, відаць, пад шыльдай іншай фірмы.

Мастацкая прамысловасць у рэспубліцы вось ужо 10 гадоў знаходзіцца ў кампетэнцыі Міністэрства мясцовай прамысловасці. Фармальны кантроль па лініі Міністэрства культуры і Саюза мастакоў БССР ажыццяўляецца членамі мастацкіх саветаў, у складзе якіх — прадстаўнік гэтых арганізацый. У іх функцыі ўваходзіць вызначэнне мастацкай вартасці той або іншай работы, прычым, думка членаў савета з'яўляецца толькі кансультатыўнай, таму што Міністэрства мясцовай прамысловасці мае права прымаць канчатковае рашэнне на свой погляд.

У Саюз мастакоў БССР усё часцей паступаюць скаргі ад мастакоў і народных майстроў, за якімі не прызнаецца права на атрыманне аўтарскага ганарару за тыражыраванне створаных імі вырабаў, што ў канчатковым выніку супярэчыць пастанове ЦК КПСС ад 24 лютага 1975 года «Аб народных мастацкіх промыслах» і зніжае зацікаўленасць творчых работнікаў у стварэнні высокамастацкіх твораў.

За 10 гадоў у мастацкай прамысловасці рэспублікі не з'явілася новых буйных прадпрыемстваў. Амаль няма новых імёнаў народных майстроў-мастакоў. Фабрыкі мастацкіх вырабаў пакуль што не ўкамплектаваны кіраўнікамі са спецыяльнай адукацыяй. На гэтых фабрыках дрэнна наладжана работа па перадачы навыкаў і метадаў народнага мастацтва маладой змене. Усё гэта, натуральна, перашкаджае выпускаць высакаякасныя мастацкія творы.

Мы ўжо гаварылі, што роля мастака ў стварэнні новых відаў мастацкай прадукцыі з'яўляецца галоўнай і пытанні стымулявання творчай працы павінны быць на першым плане. Сапраўды, калі мастаку будуць створаны нармальныя ўмовы для творчай працы, прадпрыемствы мастацкай прамысловасці толькі выйграюць. Але дзе там! Многія пытанні творчага плана застаюцца да гэтага часу нявырашанымі, што прыводзіць да пастаяннай цякучасці кадраў.

Цяпер распрацоўваецца палажэнне аб правах і абавязках мастака на прадпрыемстве. Не так даўно Саюз мастакоў БССР унёс свае прапановы, якія датычацца творчага працэсу мастака на прадпрыемстве, узяўшы за аснову тоесныя палажэнні, прынятыя ў іншых рэспубліках.

Адным з немалаважных пунктаў у гэтым палажэнні, на наш погляд, з'яўляецца творчая камандзіроўка. Вядома, што спецыфіка творчай працы любога мастака звязана непасрэдна з вывучэннем жыцця, з накапленнем жыццёвых фактаў, з'яў, вывучэннем культуры народа. Творчыя камандзіроўкі неабходны не толькі для павышэння прафесіянальнага майстэрства і вывучэння народных мастацкіх промыслаў, для збору матэрыялаў, якія могуць быць выкарыстаны ў рабоце па стварэнню новых узораў прадукцыі, але і для азнаямлення з дасягненнямі сумежных прадпрыемстваў у галіне мастацкага афармлення выпускаемай прадукцыі і вывучэння спажывецкага попыту. Без гэтага мастак можа проста дыскваліфікавацца або, у лепшым выпадку, будзе ствараць шэрыя, малавыразныя творы, якія, натуральна, не могуць задаволіць чалавека з пункту гледжання сучасных мастацкіх патрабаванняў.

Саюз мастакоў БССР мяркуе, што штогадовыя творчыя камандзіроўкі з'яўляюцца абавязковымі. Аднак Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР лічыць, што такая камандзіроўка павінна давацца мастаку адзін раз у два гады. Выходзіць, думка творчага саюза ў гэтым выпадку аказалася недастаткова кампетэнтнай?.

На практыцы атрымліваецца, што пытанні мастацкай якасці вырашаюцца не Міністэрствам культуры БССР і не творчымі саюзамі, а прамысловасцю. Ці правільна гэта?

Немалаважная роля ў развіцці народных промыслаў належыць падрыхтоўцы маладых спецыялістаў - майстроў, выканаўцаў і мастакоў. Гэта вельмі складаная праблема і да яе трэба падыходзіць сур'ёзна.

Практыка работы з майстрамі народнага мастацтва паказвае, што пытанні адукацыі, традыцый, перадачы вопыту і майстэрства, адным словам, пытанні падрыхтоўкі кадраў маладых спецыялістаў у гэтай галіне маюць самыя розныя формы. Найбольш эфектыўнай формай, на наш погляд, з'яўляецца форма індывідуальнай работы спрактыкаванага народнага майстра-мастака з вучнямі, таму што ў гэтым выпадку перадаецца не толькі рамяство, але і вялікая любоў да прафесіі, да мастацтва, да традыцыі.

Надышоў час правесці рэспубліканскую творчую канферэнцыю па тэарэтычных праблемах народнага мастацтва, на якой Саюзу мастакоў БССР сумесна з Міністэрствам культуры БССР, Міністэрствам мясцовай прамысловасці і іншымі зацікаўленымі арганізацыямі трэба вырашыць цэлы шэраг пытанняў.

Грандыёзныя планы развіцця народнай гаспадаркі ў дзесятай пяцігодцы, павелічэнне выпуску тавараў шырокага ўжытку, павышэнне іх якасці прадугледжваюць стварэнне маласерыйных і унікальных твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якія заклікаць несці радасць савецкім людзям.

В. ГАУРЫЛАЎ,
член прэзідыума праўлення Саюза мастакоў БССР, намеснік старшыні бюро секцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Б. КРЭПАК,
загадчык творчых секцый і камісій Саюза мастакоў БССР

САМАДЗЕЙНЫЯ МАЙСТРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ

У выставачнай зале абласнога цэнтра адкрылася выстаўка самадзейнага мастацтва Віцебшчыны.

На ёй экспануецца больш за 300 работ самадзейных мастакоў — рэзчыкаў, скульптараў, чаканшчыкаў, майстроў народнага ткацтва.

Экспазіцыя адкрываецца вялікім партрэтам правадыра рэвалюцыі У. І. Леніна, які з любоўю і майстэрствам інкруставаў па дрэву рабочы з Віцебска Я. Бабкоў.

Новапалачанін У. Нікфараў у сваіх акварэльных лістах «Перадавая брыгада нафтагіганта», «Будні нафтабрыгады», «Заводскі пейзаж» і іншых натхнёна ўслаўляе гераічную працу нафтахімікаў і нафтаперапрацоўшчыкаў.

Сельскім працаўнікам Прыдзвінскага краю прысвяцілі свае новыя карціны рабочы з Ушач Д. Крупеня («На таку», «Пара сенакосу»), афарміцель з Лепеля Г. Колчын («Вёска на Лепельшчыне», «Захад пасля дажджу»).

Прыцягваюць увагу наведвальнікаў пейзажы С. Шышкунова «Расце старажытны Полацк», Ю. Крыкава з Оршы «Кастрычнік», В. Жытнова «Новы мікрараён», партрэты: М. Гвоздзікава «Малады ўрач» і П. Баранава «Народны пісьменнік М. Лыньковў», акварэльныя пейзажы І. Цупікава «Цёплы вечар», «Зіма» і многія іншыя.

Са скульптурных работ можна адзначыць бюсты Ухтомскага і К. Заслонава і кампазицыю «За Радзіму», выкананыя рабочым паравознага дэпо Віцебска П. Смаляковым.

У раздзеле прыкладнога мастацтва цікавасць выклікаюць разьба па дрэву і чаканка народных умельцаў А. Даўялы, Ю. Халаднова, У. Котава, А. Вярыгі і інш.

Выстаўка прысвечана першаму Усесаюзнаму фестывалю самадзейнай творчасці працоўных.

Я. АЗЕРНЫ.

У адной з залаў выстаўкі. Фота А. ЦЕРЛЮКЕВІЧА. (БЕЛТА).

СЛОВЫ СМУТКУ, СПАЧУВАННЯ І ЛЮБВІ

Вестка аб смерці Івана Паўлавіча Мележа глыбокім смуткам і болем адазвалася ў шырокіх колах грамадскасці краіны, ва ўсёй шматнацыянальнай савецкай літаратуры, выдатным прадстаўніком якой ён быў, у сэрцах мільёнаў чытачоў. У адрас Саюза пісьменнікаў БССР паступіла шмат спачувальных тэлеграм.

Сціслая, але глыбокая па сэнсу і выказаных у ёй пачуццях тэлеграма сакратарыята праўлення Саюза пісьменнікаў СССР:

«Дарагія сябры, прыміце наша шчырае спачуванне ў сувязі са смерцю выдатнага савецкага пісьменніка, вялікага майстра мастацкага слова, нашага сябра і таварыша Івана Паўлавіча Мележа. — Федзін, Маркаў, Ціханаў, Верчанка, Сартакоў, Озераў, Міхалкоў, Баруздзін, Федарэнка, Сураўцаў, Селіхаў, Гарбачоў, Аўчарэнка, Шчадрына».

У тэлеграме Савецкага камітэта абароны міру гаворыцца:

«Дарагія таварышы, разам з вамі глыбока смуткуем з прычыны заўчаснай смерці народнага пісьменніка Беларусі, вядомага грамадскага дзеяча, члена Сусветнага Савета Міру, члена прэзідыума Савецкага камітэта абароны міру, старшыні Беларускага камітэта абароны міру Івана Паўлавіча Мележа.

Шырока вядомы ў краіне і за яе межамі, Іван Паўлавіч стварыў нямала яркіх твораў, у якіх адлюстраваны гераічныя справы савецкага народа, яго самаадданая барацьба з фашысцкімі захопнікамі. Многа сіл і энергіі аддаваў Мележ справе абароны міру.

У памяці прыхільнікаў міру, прагрэсіўнай грамадскасці свету заўсёды будзе жыць светлы вобраз цудоўнага чалавека, пісьменніка-воіна, нястомнага змагара за мір Івана Паўлавіча Мележа.

З выказваннем глыбокай жальбы ад імя Савецкага камітэта абароны міру — Мікалай Ціханаў, Яўгеній Фёдараў, Алег Хархардзін, Юрый Жукаў, Канстанцін Сіманаў, Натан Рыбак, Міхаіл Котаў».

Тое, што ў сувязі са смерцю Івана Мележа вялікую страту панесла ўся шматнацыянальная савецкая літаратура, але кнігі пісьменніка застаюцца ў баявым страі, падкрэсліваецца ў тэлеграме сакратарыята праўлення Маскоўскай пісьменніцкай арганізацыі. Аднадушныя ў прызнанні яго вялікіх заслуг перад савецкай літаратурай, савецкім народам аўтары многіх іншых тэлеграм, якія прыйшлі з Масквы — з выдавецтваў і рэдакцый часопісаў, ад прыватных асоб.

Шмат тэлеграм са спачуваннем сябрам, родным і блізкім нябожчыка, усяму беларускаму народу прыйшло на адрас Саюза пісьменнікаў БССР з братніх рэспублік — з Украіны, Літвы, Туркменіі, Азербайджана, Казахстана, Грузіі. «Няма больш з намі цудоўнага пісьменніка, чалавека вялікай душы, памяць аб якім назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах», — гаворыць ад імя пісьменнікаў Грузіі і ад сябе асабіста Г. Абашыдзе.

Цяжка перажывае страту, смерць любімага пісьменніка, беларускі народ. Шмат жалобных тэлеграм прыйшло з родных мясцін Івана Паўлавіча Мележа — з Хойніцкага раёна, з Гомеля, а таксама з Быхава, полацкага літаб'яднання «Надзвінне», з іншых куткоў рэспублікі і краіны.

Смуткуюць з прычыны смерці Івана Паўлавіча воіны Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, якія, як і ўсе савецкія людзі, горача любяць таленавітыя творы яго. Аб гэтым гаворыцца ў тэлеграме камандуючага войскамі акругі генерал-лейтэнанта М. Зайцава.

Прыйшлі тэлеграмы ад калектываў выдавецтваў «Советский писатель» і «Прогресс», кіеўскага выдавецтва «Дніпро», ад рэдкалегій часопісаў «Дружба народов» і «Советская литература», з абласных аддзяленняў СП БССР, ад выкладчыкаў і студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і Мінскага дзяржаўнага педінстытута імя А. М. Горкага, ад калектываў Гомельскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, тэатра імя Янкі Купалы, рэспубліканскага Добраахвотнага таварыства аматараў кнігі, рэдакцый газет і часопісаў, многіх іншых арганізацый, устаноў, ад шматлікіх сяброў І. П. Мележа і прыхільнікаў яго таленту.

«Яго кнігі ведаюць, чытаюць і любяць не толькі ў Беларусі, іншых рэспубліках Савецкага Саюза, але і далёка за яго межамі. Творы Івана Паўлавіча Мележа шырока перакладзены і на нямецкую мову і карыстаюцца вялікай папулярнасцю ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

Цяжка ўсведамляць, што не стала таленавітага пісьменніка, палымянага барацьбіта за светлыя ідэалы, адданага справе партыі камуніста», — піша Генеральны консул ГДР у БССР Л. Волерт.

З Берліна ад імя пісьменнікаў ГДР прыйшла тэлеграма:

«Мы ашаломлены смерцю Івана Мележа і выказваем вам, дарагія сябры, наша глыбокае спачуванне. Заўчасную смерць Івана Мележа мы ўспрымаем як вялікую страту не толькі беларускай і ўсёй савецкай, але і нашай літаратуры, літаратуры нашага часу».

СУЧАСНАСЦЬ, ПОШУКІ...

К. Аляксееў. . Ніва (сілумін).

ВОСЕМ гадоў прайшло з таго часу, калі ў Мінску адбыўся вернісаж маладых мастакоў рэспублікі. І вось ў Палацы мастацтваў зноў экспануецца выстаўка работ мастацкай моладзі Беларусі.

Пяцьсот твораў больш як трохсот аўтараў... «Маладосць краіны» — так называецца экспазіцыя, на якой мы бачым шматгадовы плён творчай працы.

На адкрыцці выстаўкі нехта пажартаваў, што на палотнах маладых вельмі многа блакітнага і зялёнага колераў. Сапраўды: молада — зелена!.. Але ж зялёны колер — колер надзеі, колер жыцця, вечнага яго руху.

Менавіта з гэтага мы і пачалі размову з членам выстаўкома, старшынёй секцыі графікі Саюза мастакоў БССР **Г. Г. Паплаўскім.**

— Чым перш за ўсё заявіла аб сабе моладзь на гэтай выстаўцы?

— Перш за ўсё — высокім прафесіяналізмам, дасканалай выяўленчай тэхнікай работ. Сённяшнія маладыя пасталелі як мастакі значна хутчэй, чым некалі мы, надзвычай хутка авалодалі асновамі майстэрства, прафесіянальнымі прыёмамі. На іх робіць уплыў бурны праграс нашага часу, тэмпы сучаснага жыцця, яго поліфанічнасць, складанасць. Маладыя пазбягаюць эмпірычнасці, імкнуцца да філасофскага асэнсавання падзей — іх творы адзначаны складанай вобразнай сістэмай, манументальнасцю. Праўда, часам складанасць формы становіцца самамэтай, калі змест твора адыходзіць на другі план...

— Аднак змест твора, тое, пра што хоча расказаць аўтар гледачам,— адзін з галоўных момантаў. Якая ж тэматыка твораў маладых?

— Маладых заўсёды хвалявала і хвалюе сучаснасць, той час, калі нарадзіліся яны самі як мастакі. А сучасная тэма — гэта і тэма працы, і сам чалавек працы (уласна — вытворчая тэма), і сучасны пейзаж, і нацюрморт, у якім яскрава праяўляюцца прыкметы часу, стаўленне аўтара да сённяшняга дня.

Галоўнай магістраллю вытворчай тэмы стала буйнейшая маладзёжная новабудоўля краіны — БАМ. Маладыя беларускія мастакі пабывалі на БАМе і сёння вынеслі на суд гледача свае работы, прысвечаныя гэтай новабудоўлі і яе людзям. Але, вядома, не толькі далёкі ад Беларусі БАМ мы бачым на палотнах маладых мастакоў — многія з іх пабывалі з мальбертамі ў цэхах беларускіх заводаў і прадпрыемстваў. На стэндах выстаўкі — работы маладых, прысвечаныя беларускаму рабочаму класу... А цяпер — канкрэтна: Л. Марчанка і А. Гаршкавоз расказваюць пра БАМ, расказваюць кожны па-свойму, хаця іх уразіла адно і тое ж — велічнасць новабудоўлі, яе размах, прырода тых мясцін, нялёгкія ўмовы працы.

Аднак мне здаецца, што работы Л. Марчанкі вызначаюцца большай цеплынёй, чалавечнасцю, ён па-сяброўску, уважліва зірнуў на людзей, на іх быт. Цікава, што Марчанка—малады мастак—выканаў свае работы ў складанай тэхніцы (мяккі лак), чым ускладніў сабе творчую задачу, але справіўся з ёй нядрэнна. Гэты прыём даў магчымасць аўтару перадаць непасрэднасць пачуцця і збе-рагчы дакументальнасць падзеі. І ўсё ж мне хацелася б падкрэсліць, што маладыя занадта захапляюцца складанай тэхнікай, лепш было б, калі б яны часцей карысталіся звычайным старым добрым алоўкам і ўдасканальвалі малюнак, паглыбляліся ў характары персанажаў, дбалі аб кампазіцыі.

З другога боку, моладзь залішне захапляецца некаторымі «моднымі» прыёмамі ў акварэлі, напрыклад, так званым «пісьмом па мокраму». У выніку — аднаго горада ад другога на такіх акварэлях не адрозніш, як часта не адрозніш мастака ад мастака... Вось доказ таго, як цікавы прыём ператвараецца ў моду. А мода ў мастацтве — рэч шкодная.

А вось прыклад самастойнай работы, зробленай без пагоні за модай — афорт А. Бажэнава «Мінскі трактарны». Гэта своеасаблівы трыцціх, у якім прысутнічае і чалавек, і вынікі, плён яго працы. Думка мастака ясная, дакладная, адсюль і дакладнасць кампазіцыі, упэўненасць лініі. Шкада толькі, што ў асобных дэталях аўтар не пазбегнуў некаторай манернасці, залішняй прыгажосці і «вытанчанасці». А гэта бяда многіх маладых.

Больш сур'ёзным недахопам з'яўляецца, праўда, не «празмернасць» тэхнічных прыёмаў, а «бязлюднасць» палотнаў і графічных лістоў, адсутнасць на іх чалавека. Вось і літаграфіі з серыі «Беларуская хімія» В. Шнарэвіча. Мастак няблага перадае рытм сучаснай новабудоўлі, магутнасць і велічнасць тэхнікі, але ўражанне такое, што ўсё гэта існуе само па сабе і само для сябе — не для чалавека, без чалавека. Тое самае бачым ў работах В. Волкава («Паветраачышчальныя ўстаноўкі») і В. Назарава («Вузел грануляцыі»).

— Але ж на выстаўцы ёсць партрэт, а значыць, паказаны вобраз сучасніка. Што б вы маглі тут адзначыць?

— Назаву партрэты, выкананыя такімі маладымі аўтарамі, як Л. Воранава, Д. Сарока, С. Волкаў, Л. Іваноў. Гэта ўсё людзі, безумоўна, здольныя, але неабходна заўважыць ім, што трэба працаваць над партрэтам больш паглыблена, пранікаць у таямніцы характару, знаходзіць глыбока псіхалагічнае. А так атрымалася някепска, але «рэпартажна», мімалётна...

— Вельмі слушная думка была выказана вамі, што пейзаж таксама дае магчымасць выявіць сучаснае мысленне мастака, яго адносіны да сучаснасці.

Хто, на вашу думку, найбольш «сучасна» мысліць у пейзажы?

— Адразу назаву зусім маладую мастачку Л. Кальмаеву. Яе графічны ліст «Вясна» вырашаны лаканічна. Скупымі сродкамі яна стварае складаны мастацкі вобраз сучаснага горада, «другую», створаную чалавекам прыроду, адасобленую ад звыклай прыроды. Гэта сапраўды урбаністычны пейзаж.

Простыя па выкананню, лаканічныя, немудрагелістыя, але ў той жа час ёмістыя па зместу лірычныя работы У. Піменава з серыі «Успаміны пра дзіцячыя гульні». Можа, гэта і не чысты пейзаж, а хутчэй жанравыя сцэнкі, але тут пейзажны момант адыгрывае надзвычай выразную, а галоўнае, зразумелую нам ролю. Такія прастата, зразумеласць вельмі прывабныя. Гэта хочацца падкрэсліць таму, што некаторыя маладыя мастакі імкнуцца да залішней складанасці, дакладней, нейкай штучнай ускладнёнасці, яўна перабольшваюць з асацыяцыямі, зразумелымі толькі самому аўтару. У гэтай сувязі не магу не назваць каляровы афорт С. Халамава «1 Мая ў памяці Джакамеці». Гэты вялікі прыгожы твор не зусім зразумелы — настолькі ён суб'ектыўны. Ва ўсякім выпадку, без тлумачэнняў аўтара зразумець яго сэнс амаль немагчыма. Акрамя таго, перанасычанасць работы рознымі па зместу сцэнамі і буйнымі дэкаратыўнымі плямамі разбурае яе кампазіцыю.

— Як маладое пакаленне падыходзіць да тэмы Айчыннай вайны, рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, вырашэнне якіх мае ў нашым выяўленчым мастацтве надзвычай багатыя традыцыі?

— Хоць маладыя мастакі і не былі сведкамі падзей, пра якія расказваюць, але расказваюць пра іх глыбока.. Яны ўвабралі і асэнсавалі вопыт папярэдніх пакаленняў, у тым ліку — мастацкі вопыт. Тут дала свой плён дыстанцыя часу.

Адразу назаву Б. Цітовіча. Яго трыцціх «Памяці Брэста» ўражвае і сілай пачуцця, і глыбінёй думкі, і глыбока вобразным іх увасабленнем, высокай ступенню мастацкага абагульнення. Пластычнае вырашэнне трыцціха вельмі ўдала, арганічна яднае гераічнае мінулае з сённяшнім днём, арганічна перадае адчуванне непарыўнай сувязі пакаленняў.

На высокім прафесіянальным узроўні, я б сказаў, рукой упэўненага майстра выкананы работы М. Селешчука «Ваенная заалогія», тры графічныя лісты, і асабліва яго работа «Героям Шыпкі», дзе ў непарыўным адзінстве спалучаюцца майстэрства, яснасць грамадзянскай думкі, высокі густ маладога мастака.

Прыкладам адзінства формы і зместу, актыўнага ўплыву формы, мастацкай тэхнікі на характар выяўлення зместу з'яўляецца работа У. Піменава па матывах паэмы А. Блока «Дванаццаць». Гэты твор Блока неаднаразова знаходзіў увасабленне ў выяўленчым мастацтве, але У. Піменаў адлюстраваў вобразы паэмы ў афорце. І паэма загучала па-новаму, афорт падказаў мастаку новыя творчыя рашэнні. Падкрэслім, што гэта не ілюстрацыі да паэмы, а самастойныя станковыя лісты.

— Дарэчы, пра ілюстрацыю. На выстаўцы даволі шырока прадстаўлены гэты раздзел графікі.

Што тут найбольш цікавае, як вы лічыце?

— Мне здаецца, ілюстрацыі да «Пецярбургскіх аповесцей» М. В. Гогаля, выкананыя У. Кліменкам. Гэта, я думаю, наогул адна з лепшых работ у раздзеле ілюстрацыі. Паглядзіце на яго работы. Яны адмысловыя і з пункту гледжання графічнага майстэрства наогул, і вызначаюцца глыбокім пранікненнем у тэкст вялікага пісьменніка, калі ў ілюстрацыі прысутнічаюць не толькі гогалеўскія персанажы, гогалеўскі час, але і наша з вамі адчуванне Гогаля, сучаснае разуменне яго творчасці, разуменне пісьменніцкіх пошукаў, пакут, думак. Даволі ўдала ў традыцыях беларускай народнай гравюры працуе М. Басалыга, які выставіў ілюстрацыі да твораў М. Ю. Лермантава, А. Куляшова, Г. Бураўкіна. Цікавыя ілюстрацыі да твораў Максіма Багдановіча, выкананыя Л. Лапіцкай.

Святочныя, яркія малюнкі і да дзіцячых кніжак выканалі І. Лобан, Н. Грамыка, Варта адзначыць і графічную работу Л. Зіневіч «Інтэр'еры Вялікага тэатра».

— Што выявілася найбольш выразна ў работах большасці маладых мастакоў, якая эстэтычная тэндэнцыя?

І што б вы маглі пажадаць у гэтай сувязі?

— Вельмі добра, што ў сваіх пошуках маладыя ідуць ад традыцый савецкай рэалістычнай школы, ад высокай класікі, ад яе вытокаў. Але надыходзіць час, калі вучань павінен станавіцца, так сказаць, на свае ногі, павінен больш давяраць сабе самому, свайму бачанню свету, свайму разуменню жыцця і мастацтва. Хацелася б пажадаць нашым маладым большай смеласці, большай самастойнасці. Каб новае пакаленне мастакоў творча развівала традыцыі сацыялістычнага рэалізму ў мастацтве.

Запісала Р. БАКУНОВІЧ.



А. Бажэнаў. Мінскі трактарны (афорт).

ЧАЛАВЕК ІДЗЕ Ў ЛЕС...

Ідзе знаёмымі сцяжынкамі, каб сустрэцца з прыгажуном ласём, палахлівым зайцам, паназіраць за спрытнай вавёркай, убачыць драпежніка ваўка. За плячамі — рукзак, у руцэ — кій. Ён не мае стрэльбы і ніколі не паляваў на жывёл, ён ідзе да іх у госці. Магчыма, таму звяры, не адчуваючы небяспекі, і не надта ўцякаюць.

Мікалай Мацвееевіч Ерафееў часта ўспамінае маленства, сваю радзіму Мардовію з вялікімі лясамі, заліўнымі лугамі. Колькі пералётных птушак — качак, чапляў, гусей — спынялася там на адпачынак! Хлапчук гадзінамі назіраў за імі, і гэта ніколі не надакучвала. Потым сям'я пераехала ў Сібір, і зноў — лясы, птушкі, звяры. Летам Мікола пасвіў коней і тут жа іх ляпіў з гліны. Аднак па-сапраўднаму любімай справай заняўся ўжо ў сталым узросце.

Былы франтавік, які аддаў службе ў радах Савецкай Арміі васемнаццаць гадоў, Ерафееў звяртаецца да ваеннай тэмы. Вось барадаты партызан — у шапцы-вушанцы і кажушку, з вінтоўкай за плячамі—схіліўся над тэлефонным апаратам. Справа ад партызана — фігура юнака ў поўны рост. Ён выпускае голуба. З левага боку — дзяўчына ўглядаецца ўніз, дзе струменіць крынічка.

Мікалай Мацвееевіч шмат удзяляе ўвагі і працаўнікам вёскі. Яго работы «Будучы жывёлавод», «На ўборцы ўраджаю», «Юны тэхнік» экспанаваліся на рэспубліканскай выстаўцы самадзейнага выяўленчага мастацтва «Слава працы», а аўтар ўзнагароджан дыпломам II ступені. «Будучы жывёлавод» трапіў і на Усесаюзную выстаўку твораў самадзейных мастакоў. Ерафееў атрымаў дыплом Акадэміі мастацтваў СССР, медалі ВДНГ СССР.

Вось скульптура вышынёй у метр дваццаць сантыметраў. Прыгажуня-дзяўчына, апранутая ў беларускі касцюм з арнаментам, трымае грэбень і верацяно. На шыі ў яе каралі...

— Гэтую скульптуру,—Мікалай Мацвееевіч усміхаецца. — зрабіў проста ў лесе. Знайшоў вывернуты корч грушы-дзічкі. Прынёс інструмент, дзён дзесяць працаваў.

Побач з праляй — «Грыбнік»: метровая скульптура хлопца ў капелюшы, з кошыкам.

У Мікалая Мацвееевіча, рабочага Мінскага завода электрамантажных вырабаў, шмат драўляных птушак і жывёл, нават такіх, якіх не сустрэнеш у Беларусі.

— З малюнкаў, пэўна, робіце? — цікавяцца гледачы.

— З малюнкаў не люблю, больш з натуры. Вельмі дапамагаюць перадачы «У свеце жывёл», «Клуб кінападарожжаў». Дзякуючы тэлебачанню выразаў галапагоскую чайку, малпу, дэльфіна.

Выстаўка твораў самадзейнага мастака адбылася і на заводзе электрамантажных вырабаў, дзе экспанавалася звыш шасцідзесяці работ. З імі знаёміліся рабочыя і іх сем'і, шматлікія госці. Інжынер з Масквы Н. Барыснава запісала ў кнігу водгукаў: «Вельмі прыемна апынуцца сярод твораў, выкліканых да жыцця фантазіяй і ўмельствам мастака, які ў бясформенным карэньчыку бачыць нешта непаўторнае і можа надаць яму другое жыццё...».

Чалавек ідзе ў лес. На сустрэчу з прыродай, каб потым у дрэве паказаць прыгажосць і багацце роднага краю.

А. ПЯТРОВІЧ.

ТЭАТР

ГАСТРОЛЬНАЕ ЛЕТА

Гэты калектыў сёлета можна было назваць самым паўднёвым госцем Беларусі—Дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга рускі драматычны тэатр імя Самеда Вургуна прыехаў з Баку. Аматары сцэнічнага мастацтва ведаюць яго, бо ён мае рэпутацыю стабільнага ансамбля майстроў, на творчым рахунку якіх значныя дасягненні ў галіне раскрыцця сучаснай тэматыкі. Гэта і не выпадкова—Рускі тэатр у Баку быў створаны ў 1923 годзе з трупы, што раней мела назву Бакінскі вольны сатыр-агіттэатр і пачала дзейнасць адразу пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў Азербайджане. Сярод рэжысёраў тэатра былі выдатныя знаўцы сцэны і запатрабаванняў сучаснага гледача. Ёсць «бакінскія старонкі» і ў творчых біяграфіях такіх вядомых артыстаў, як М. Жараў, Ф. Ранеўская, Б. Ільін. Калектыў працаваў з арыентацыяй на слаўны рабочы клас рэспублікі, нафтавікоў, чыгуначнікаў, партавікоў. Многія гады ён так і называўся—Бакінскі рабочы тэатр.

Таму зразумелай была тая цікавасць, з якой сустрэла сёлетнія гастролі гэтай трупы грамадскасць Брэста і Віцебска. Карэспандэнт «ЛіМа» папрасіў падзяліцца ўражаннямі ад першай сустрэчы з новым для бакінскіх артыстаў гледачом дырэктара Рускага тэатра імя Самеда Вургуна Ірыну Навіцкую.

Ірына НАВІЦКАЯ:

«МЫ ПАСЯБРАВАЛІ З ПАТРАБАВАЛЬНЫМ І ДОБРАЗЫЧЛІВЫМ ГЛЕДАЧОМ»

—ЗРАЗУМЕЛАЕ хваляванне творчых людзей, калі яны ўступаюць па зямлю Брэста, дзе не спынялася паток наведвальнікаў гераічнай крэпасці. Наш калектыў, для якога патрыятычны подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне заўсёды застаецца крыніцай натхнення і жыццёвым матэрыялам мастакоўскага асэнсавання, быў узрушаны тым, што нам давялося пабачыць на ўласныя вочы, адчуць сваімі сэрцамі на беразе Мухаўца ў цытадэлі Славы.

Было прыемна, што першай назвай па афішы тэатр пазначыў назву п'есы Г. Баравіка «Інтэрв'ю ў Буэнас-Айрэсе». Нам дарагі гэты спектакль, бо ён актыўна і ваяўніча выкрывае карані фашысцкай змовы супроць прагрэсіўных сіл міра і справядлівасці. Як вядома, вобразы і драматычны канфлікт твора падказаны аўтару падзеямі ў Чылі. Палітычны напал пастаноўкі і натхненне выканаўцаў выклікалі ў адказ надзвычай чулую рэакцыю ў залах Брэста і Віцебска. Артысты адчулі, што гледачы тонка разумеюць мастацтва і не пакідаюць без ухвалення творчыя знаходкі рэжысуры і артыстаў.

Цяпер вельмі ўзнялася цікавасць да сучаснай тэматыкі наогул. Скажам, іграючы «Пратакол аднаго пасяджэння» А. Гельмана, тэатры розных гарадоў і рэспублік успрымаюць гарачую зацікаўленасць сутнасцю вытворчых і арганізацыйных спрэчак, якія вядуць героі спектакля. Таксама і тыя п'есы, што мы іграліі ў Беларусі, — «Спатканне ў прадмесці» А. Вампілава, «Шырэй круг» азербайджанскага драматурга Імрана Касумава, «Валяніцін і Валяніцына» М. Рошчына, — абуджаюць часам вельмі гарачыя дыспуты, жывы абмен думкамі аб жыцці, якое паслужыла аб'ектам увагі пісьменнікаў і тэатра. Брастаўчане і віцябчане не былі ў гэтым сэнсе выключэннем: спектаклі праходзілі пры пільнай увазе да сцэнічнай праўды з боку гледачоў.

З класікі мы паказалі добра вядомую ў вашай рэспубліцы (яе іграюць коласаўцы і Рускі тэатр БССР імя М. Горкага) трагедыю Ф. Шылера «Марыя Сцюарт». Дарэчы, гэта наш спектакль-ветэран, дарагі для трупы, бо захоўваецца ў рэпертуары пятнаццаць гадоў.

Знаёмства з беларускім гледачом было вельмі непасрэднае. Мы наведвалі буйныя прамысловыя прадпрыемствы, будоўлі абласных гарадоў, выязджалі ў раёны і давалі прадстаўленні для працаўнікоў сяла, былі гасцямі гераічных пагранічнікаў. Узнікалі шчырыя гутаркі аб сувязі мастацтва з жыццём, аб дарагіх для ўсіх нас ідэалах, якія сцэна сцвярджае ў эмацыянальным відовішчы і праз абагуленыя вобразы. Сяброўства пачалося. Мы спадзяёмся, што яшчэ прыедзем у Беларусь, абавязкова пакажам свае работы мінчанам. Таму — да новых сустрэч! Дзякуй за гасцінны прыём!

Сцэна са спектакля «Інтэрв'ю ў Буэнас-Айрэсе». У ролях Марты і Карласа Бланка народныя артысты Азербайджанскай ССР Р. Гінзбург і А. Фальковіч.

У КАЛЕЙДАСКОПЕ ФАРБАЎ І МУЗЫКІ

П'ЕСА «НА ЎСІХ АДНА БЯДА» П. МАКАЛЯ У РЭСПУБЛІКАНСКІМ ТЭАТРЫ ЮНАГА ГЛЕДАЧА ІМЯ 50-ГОДДЗЯ КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

ПАД імклівыя, пераплівістыя гукі музыкі на сцэну выбягуць скамарохі — народныя ўмельцы, артысты-аматары, мастацтва якіх данесла да нас гісторыя з далёкага мінулага. Як і належыць сапраўднаму плашчаднаму відовішчу, на гледача абрушыцца каскад музыкі, яркіх фарбаў, амаль цыркавых нумароў. Заўзята і спрытна адзін са скамарохаў пройдзецца па сцэне колам, другі зробіць кульбіт, трэці, перакуліўшыся і стаўшы на галаву, замрэ ў нерухомасці. Неўзабаве з'явіцца і музыка (бо якое ж свята абыходзіцца без яго!). Ён заліхвацкі выйдзе на сцэну і зычна пратрубіць, абвяшчаючы аб прадстаўленні. Пачынаецца спектакль «На ўсіх адна бяда» ў тэатры юнага гледача.

Дзівосны свет тэатра! Ён уводзіць нас у свет казкі, з дзяцінства прываблiваючы сваёй чароўнасцю і таямнічасцю. Ён дапамагае нам з першых жыццёвых крокаў усвядоміць сутнасць такіх паняццяў, як дабро і зло, вернасць і здрада, высакародства і нікчэмнасць. На простых, дасціпных для дзіцячага разумення прыкладах тэатр навучае цаніць сапраўдную прыгажосць, захапляцца хараством, непрымірыма ставіцца да духоўнай спустошанасці ва ўсіх яе праявах. Звяртаючыся да нашага розуму, абуджаючы нашы пачуцці, тэатр сваім эмацыянальным уздзеяннем непасрэдна і апасрэдавана ўплывае на фарміраванне чалавечай асобы. Спасціжэнне складанай жыццёвай мудрасці звычайна пачынаецца ў дзяцінстве з казкі, часам вельмі вясёлай, часам крыху сумнай, але абавязкова «справядлівай», дзе заўсёды дабро бярэ верх над злом.

Сюжэтная фабула п'есы П. Макаля «На ўсіх адна бяда», пастаўленай рэжысёрам Р. Баравіком, традыцыйна казачная. Пан, уладальнік навакольнага краю, трапіў у яму, якую па яго ж загаду выкапалі для звяроў, і апынуўся ў «небяспечнай» кампаніі мядзведзя, малпы і змяі. Пан пачынае енчыць, скуголіць, прапануючы грошы таму, хто яго выцягне з ямы. Ігнат і Дана, выпадкова апынуўшыся ў лесе, выратоўваюць пана і звяроў. Хлопец і дзяўчына даўно ўжо кахаюць адзін аднаго. Але яны вельмі бедныя для таго ж, каб пажаніцца, патрэбны грошы. Ігнат, спадзеючыся на панскую ласку, ідзе ў палац, дзе замест узнагароды ён атрымлівае... дзесяць бізуноў. Пакрыўджанага хлопца суцяшаюць яго сапраўдныя сябры—звяры. Удзячныя за выратаванне, яны прыносяць свае падарункі: мядзведзь — дзежку мёду, малпа—дровы, змяя—цудоўны дыямент. У крытычную хвіліну, калі па абвінавачванню ў крадзяжы панскі суд гатовы прысудзіць Ігната да пакарання смерцю, звяры прыходзяць яму на дапамогу. Усё заканчваецца па справядлівасці: Ігнат атрымлівае свабоду, а пан, як і павінна быць у казцы, гіне ў вогнішчы.

Тэатр юнага гледача не ўпершыню звяртаецца да твораў П. Макаля. На яго сцэне былі пастаўлены п'есы «Адчыніце, казляняткі» і «Дай вады, калодзеж». Пісьменнік добра разумее спецыфіку дзіцячага тэатра, верыць у непасрэднасць, шчырасць, эмацыянальнасць юнацкага ўспрымання. Вершы П. Макаля лёгка кладуцца на музыку, яго дасціпная сцэнічная мова гучыць меладычна.

Пастаноўшчык Р. Баравік, вызначаючы жанр спектакля «На ўсіх адна бяда», звярнуўся да народных, фальклорных традыцый беларускага тэатра. Стылістыку пастаноўкі абумовіла форма плашчаднага тэатралізаванага прадстаўлення. Мастацкая фантазія рэжысёра ўзбагаціла сучасную п'есу-казку фрагментамі старажытнага тэатра, ператварыўшы яе ў яркае, іскрамётнае відовішча.

Нібы ў карнавальным віхры пачне «раскручвацца» казачны сюжэт з элементамі народных ігрышчаў, пантамімы, цыркавой буфанады. У калейдаскоп сцэнічных падзей арганічна ўплятаюцца скамарошыя гульні, батлеечныя інтэрмедыі, сцэны з жыцця прыгоннага тэатра.

Ці не замнога гэтага для аднаго спектакля? Ці зразумеюць такі прыём маленькія гледачы?

Прыўзняты святочны настрой, які заўжды пануе на спектаклі, разумная рэакцыя дзяцей амаль на кожную рэпліку, гучныя калектыўныя адказы на пытанні дзеючых асоб — усё сведчыць аб правамернасці рэжысёрскага прачытання твора. Хай сабе многія з дзяцей яшчэ не ведаюць, што сцэнка Мацея з доктарам — цудоўная жамчужына скамарошага, а пазней батлеечнага тэатра, што прыгожыя дзяўчынкі з кі льцамі анёлаў за спіной—хор, апрануты ў традыцыйныя касцюмы прыгонных артыстаў тэатра князя Радзівіла. Аб усім гэтым яны даведаюцца пазней, калі ў старэйшых класах пазнаёмяцца з гісторыяй і культурай свайго народа. Пакуль жа яны ўспрымаюць больш вонкавы бок відовішча, пільна сочаць за развіццём асноўных падзей і праз маляўнічыя вобразныя «адступленні» непасрэдна, без дыдактыкі спасцігаюць сэнс барацьбы супрацьлеглых жыццёвых пазіцый.

Характары персанажаў у гэтым спектаклі — тыпажна традыцыйныя: пан — злы, стражнікі — лянівыя, звяры—добрыя і г. д. Таму сімпатыі маленькіх гледачоў адразу ж выклікаюць станоўчыя героі казкі Ігнат, Дана, звяры. Выканаўца ролі Ігната А. Акуліч стварае вобраз прывабнага хлопца, надзвычай абаяльнага ў сваіх даверлівых адносінах да людзей. Вельмі пластычны Ігнат — Акуліч рухаецца з зайздроснай лёгкасцю, дакладна паводзіць сябе часам у надзвычай складаных сцэнічных абставінах, прапанаваных рэжысёрам. Так, з артыстычным бляскам выканаўца абыгрывае канат і вяровачную лесвіцу. Пад стаць Ігнату і яго верная сяброўка Дана ў выкананні артысткі С. Ніканчык. Вясёлая, жыццярадасная, не зважаючая на гора і бяду, што заўжды спадарожнічае простым людзям, яна ўспрымаецца ў спектаклі як сімвал адданасці, веры, любві.

У цудоўны свет казачнага лясного царства, з яго звычкамі, сумленнымі законамі, уводзяць гледача выканаўцы роляў звяроў. Артысты знайшлі своеасаблівыя рысы, дэталі, уласцівыя характару і павадкам лясных жыхароў. Нязграбны мядзведзь (Б. Барысёнак), гнуткая змяя (Г. Раеўская), жвавая малпа (К. Доўнар) прываблiваюць сваёй пластычнасцю, шматграннасцю знешняга малюнка. Багатая фантазія, пэўныя элементы імправізацыі, добрае адчуванне казачна-камедыйнай стыхіі твора ўласцівы выканаўцам роляў пана, вартаўнікоў, суддзі—М. Пятрову, В. Турмовічу, М. Труханy, М. Ціхану.

Цікавае вырашэнне набылі ў спектаклі скамарохі ў выкананні артыстаў В. Барноўскага, А. Высоцкага, М. Лявонцьева, В. Якушава. Яны непасрэдна амаль не ўдзельнічаюць у развіцці сюжэта. Функцыі гэтых выканаўцаў у спектаклі разнастайныя: іх скамарохі не толькі імправізуюць на сцэне як вандроўныя артысты, ствараючы святочную атмасферу, але пасвойму спачуваюць галоўным героям, як могуць дапамагаюць ім. Узяўшы за аснову дэмакратычную сутнасць мастацтва скамарохаў, рэжысёр і артысты надалі гэтым персанажам умоўна-алегарычную, казачна-фальклорную афарбоўку. Менавіта яны, вялізныя дзецюкі, у смешных чэпчыках з дзіцячымі соскамі, з'яўляюцца каля Ігната і Даны ў іх мроях аб будучым сямейным шчасці; яны ж, ператварыўшыся ў зялёныя кусты, прымаюць удзел у вясёлай гульні і хаваюць Дану ад Ігната. Скамарохі здзекуюцца з пана, з'едліва насміхаюцца над стражай. У якім бы абліччы яны ні з'яўляліся — малпянят, дзяцей, птушак ці прыгонных артыстаў, выканаўцы дакладна даносяць сапраўдны гуманізм простага чалавека, яго шчырае імкненне да дабра і справядлівасці.

Разам з тым, нам падалося, што ў такім каларытным па форме спектаклі мастацкае афармленне У. Гардзеенкі магло б быць менш груваcткім, менш стракатым. Матэрыял казкі дае мастакам вялікія магчымасці раскрыць творчую фантазію, дазваляе шырока выкарыстоўваць рознакаляровае святло, фасфарасцыруючыя фарбы. Некаторая ўмоўнасць замест празмернай рэалістычнасці зменшыла б перагружанасць сцэнічных дэкарацый, зрабіла б іх больш сучаснымі, казачна-таямнічымі. Тым больш, што касцюмы ў спектаклі вельмі яркія і маляўнічыя. Наогул жа пастаноўка вылучаецца сваёй музычнасцю, гарманічнай пластычнасцю. Яна ў многім дапамагае пашырыць межы творчай магчымасці драматычных артыстаў, выявіць іх вакальныя і харэаграфічныя здольнасці. І ў гэтым немалая заслуга кампазітара Я. Глебава і балетмайстра Н. Цімафеевай.

Спектакль «На ўсіх адна бяда» — добры падарунак нашым маленькім гледачам. Тэатр юнага гледача іх запрашае ў казку.

Тамара ГАРОБЧАНКА,
кандыдат мастацтвазнаўства.

З ПАЗІЦЫЙ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ

НАЗВА новай кнігі Е. Бондаравай «Час, экран, крытыка» цалкам адпавядае свайму зместу. Сапраўды, чытаючы яе адчуваеш час, у які ствараліся тыя ці іншыя фільмы, даведваешся пра новыя карціны, пастаўленыя беларускімі кінематаграфістамі. Аўтар аналізуе пранэс развіцця беларускага кінамастацтва, шмат піша пра гэта. Яе ранейшыя нарысы «У. У. Корш-Саблін», «У кадры і за кадрам», шматлікія артыкулы ў перыядычным друку па пытаннях беларускага кіно сведчаць аб глыбокім веданні аўтарам гэтай тэмы. Звернемся, аднак, непасрэдна да раздзелаў кнігі, бо менавіта яны вызначаюць яе праблематыку — «Новыя далягляды савецкага кінамастацтва і кінакрытыкі», «Духоўны вопыт пакаленняў у дынаміцы вобразаў», «Адлюстроўваць дыялектыку сучаснасці», «Кінакрытыцы — дзейснасць публіцыстыкі».

Даследчык на багатым фактычным матэрыяле на вялікім адрэзку часу разглядае кінаплынь рэспублікі. Цікавыя і грунтоўныя ацэнкі, якія дае аўтар дакументальным і мастацкім фільмам, прымушаюць пагадзіцца з імі, а дзе-нідзе выклікаюць роздум і нават супярэчлівыя думкі.

На нашу думку, вельмі цікавым атрымаўся раздзел «Духоўны вопыт пакаленняў у дынаміцы вобразаў». У ім аўтар асабліва абгрунтавана гаворыць пра пошук беларускіх майстроў экрана. Размова ідзе пра пошук тэм, сюжэтаў, новых выяўленчых сродкаў. У ліку найбольш значных стужак 50-х—60-х гадоў называюцца дакументальныя — «Цытадэль славы», «Сустрэча герояў Брэста», «Бацька Мінай», «Генерал Пушча»... Розны, вядома, іх кінематаграфічны ўзровень, але аснова адна — паказ гераічнага мінулага савецкага народа.

Пра поўнаметражны дакументальны фільм «Генерал Пушча» (аўтар сцэнарыя А. Вялюгін, рэжысёр-аператар І. Вейняровіч), у кнізе, напрыклад, сказана: «тут няма нілкіх асаблівых кінематаграфічных адкрыццяў. Кампазіцыя яе — звычайная: спалучэнне эпізодаў і кадраў вайны з успамінамі сучаснікаў. І ўсё ж гэта не ілюстрацыя падзей, а публіцыстычнае асэнсаванне іх, таму што ёсць адбор і супастаўленне, ёсць палымянае і змястоўнае аўтарскае слова, якое пашырае сэнс зместу, што даюць кадры. І ёсць у фільме як бы абагульнены вобраз патрыёта. Гэты белагаловы хлопец усюды паспяваў першым, вось і цяпер першым ускочыў у сялянскую хату, дзе толькі што размяшчаўся штаб нямецкіх карнікаў, і, зняўшы тэлефонную трубку, крыкнуў: «Гаворыць генерал Пушча...»

Звяртаючыся да мастацкіх кінастужак у гэтым раздзеле, Е. Бондарава асабліва высока ацэньвае фільм «Поаз могілкі» (сцэнарый П. Ніліна, рэжысёр В. Тураў, аператар А. Забалоцкі). У ёй партызанская барацьба паказана не з фасаднага боку. Крытык раскрывае асаблівасці творчай манеры В. Турава, адзначае яго шчырасць, усхваляванасць, назіральнасць.

У той жа час вельмі слушныя заўвагі зроблены па фільму таго ж рэжысёра «Я родам з дзяцінства»: «У фільме ёсць асобныя адметныя рысы пакалення ваеннага часу, але няма пераканаўчага партрэта. Цікавая задума да канца не рэалізавана, хоць сама па сабе і не бясплённая. У ёй можна разгледзець і арыенціры, і рысы на шляху тэматычнага і стылістычнага ўзбагачэння беларускага кінамастацтва...»

Коратка і дакладна гаворыцца ў кнізе Е. Бондаравай пра творчы пошук вядомага рэжысёра студыі «Беларусьфільм» Б. Сцяпанава, пастаноўшчыка такіх карцін, як «Альпійская балада», «Бацька»... Засяроджваецца ўвага на фільмах І. Дабралюбава, на творчым рахунку якога стужкі «Іду шукаць», «Іван Макаравіч», «Шчаслівы чалавек», «Вуліца без канца», «Таму, што кахаю». Называецца шэраг імён маладых майстроў экрана.

Адзначаючы станоўчае ў кнізе, хацелася б выказаць некаторыя заўвагі адносна яе кампазіцыйнай пабудовы. Матэрыял у ёй пададзены чытачу своеасаблівымі канцэнтрычнымі коламі. Гэта быццам і зручна для аўтара, бо брэндзіць, напрыклад, перыяд кінавытворчасці за 50—60-я гады і разглядаюцца адразу ўсе жанры: дакументальнае, мастацкае кіно, тэлебачанне. Потым аўтар вядзе нас да другога перыяду. А навошта? Адны і тыя ж назвы зноў паўтараюцца. З пункту гледжання крытыка, гэта, магчыма, і апраўдана, ды такі прыём стамляе чытача, блытае яго.

Кніга вызначаецца разнастайнасцю тэм, ацэнак, імён. І ўсё ж хацелася б больш падрабязна даведацца пра здабыткі і выдаткі сучаснага беларускага кіно. На жаль, аўтар часцей толькі канстатуе факты. Пэўная бессістэмнасць у расстаноўцы акцэнтаў у аналізе, спасылкі на шматлікія крыніцы, загрувашчванне даследавання цытатамі з розных крыніц зноў-такі не спрыяюць цікавасці да кнігі з боку шырокага чытача.

Разам з тым названыя і не названыя пралікі не могуць засланіць таго, што Е. Бондарава падсумавала работу беларускіх кінематаграфістаў на розных этапах іх дзейнасці, патрабавальна і кваліфікавана разгледзела дасягненні беларускага экрана ў сувязі з агульным кінапрацэсам краіны.

Кніга Е. Бондаравай «Час, экран, крытыка» карысная не толькі прафесіянальным кінематаграфістам. Яна прыцягне ўвагу ўсіх аматараў «важнейшага з мастацтваў», работнікаў культасветустаноў, народных універсітэтаў, тым больш, што выданне добра ілюстравана кадрамі з фільмаў, у канцы кнігі прыведзены іх пералік, названы імёны стваральнікаў і г. д. Гэта робіць кнігу своеасаблівым даведнікам і зборам цікавых фактаў развіцця экранага мастацтва.

І. ПАЎЛЮКОЎСКІ.

Е. Бондарава. Час, экран, крытыка. На рускай мове. Мінск. Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1975.

ГУЧЫЦЬ ГОЛАС У ЭФІРЫ

КАЛЕКТЫЎ аўтараў падрыхтаваў кнігу «Гаворыць і паказвае Беларусь». Яна падагульняе вынікі работы рэспубліканскага радыё за паўстагоддзе і тэлебачання — за дваццаць гадоў.

...Першыя пазыўныя Беларускага радыё, як вядома, прагучалі ў эфіры 15 лістапада 1925 года ў 18 гадзін 30 мінут. Тады ў краіне налічвалася каля дваццаці пяці тысяч рэпрадуктараў і некалькі тысяч дэтэктарных прыёмнікаў. Цяпер толькі ў нашай рэспубліцы звыш двух мільёнаў радыёпрыёмнікаў і больш за мільён тэлевізараў. Такія лічбы. Красамоўныя! За імі — напружаная творчая дзейнасць журналістаў, рэжысёраў, аператараў. За дзень радыё і тэлебачанне перадаюць у эфір столькі матэрыялаў, што яны занялі б дзесяткі газетных старонак... Тут і шырокая ўсебаковая інфармацыя, і прапагандысцкія артыкулы, і перадачы для юнацтва і дзяцей, і літаратурныя чытанні, і тэатр ля мікрафона і на блакітным экране. Тут музыка, спорт, непасрэдныя перадачы з месца падзей... Усё гэта патрабуе вялікай увагі і напружання, высокай кваліфікацыі работнікаў радыё і тэлебачання, творчага імкнення рабіць кожную перадачу цікавай і захапляючай.

Нельга без хвалявання чытаць старонкі аб радыё, якое пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў даносіла да шырокіх мас планы партыі па аднаўленню народнай гаспадаркі, расказвала аб небывалым энтузіязме працаўнікоў горада і вёскі. Аўтары заўважаюць, што асабліва шмат увагі ўдзялялася новабудоўлям рэспублікі, гігантам індустрыі, якія з'явіліся ў Беларусі пасля вайны, — аўтамабільнаму і трактарнаму заводам, тонкасуконнаму камбінату, радыёзаводу, заводам электронных машын і аўтаматычных ліній і многім іншым прадпрыемствам. У выпусках «Апошніх паведамленняў», карэспандэнцыях, выступленнях рабочых і кіраўнікоў прадпрыемстваў штодзённа ішла размова аб стваральнай працы беларускага народа.

Шмат увагі работнікі радыё і тэлебачання ўдзяляюць навукова-тэхнічнаму прагрэсу, сацыялістычнаму спаборніцтву, павышэнню прадукцыйнасці працы. Гэта яскрава адлюстравана ў кнізе. Добра, што аўтары кнігі вылучылі і спецыфіку пэўных праграм. Скажам, тое, што адрасавана вясковаму слухачу, мае адметныя рысы, а тое, што будзе слухаць юнак, гучыць не так, як перадачы для ветэранаў вайны і працы.

У нас амаль не друкуюцца нарысы і сцэнарыі, прызначаныя для радыё. Таму варта было б у такой кнізе даць больш падрабязныя цытаты з літаратурных першакрыніц лепшых перадач. Гэта падмацавала б некаторыя тэзісныя высновы аўтараў кнігі.

Вядома, расказаць аб усіх радыёперадачах за пяцьдзесят гадоў і тэлеперадачах за дваццаць — немагчыма. Гэта і не магло быць мэтай аўтараў кнігі. Улічваючы аб'ём перадач і працягласць часу, і не трэба было імкнуцца аналізаваць усе праграмы. На жаль, такое імкненне прывяло да таго, што ў многіх раздзелах кнігі даецца спіс — пералік перадач.

Хіба толькі ў раздзеле «Тысяча помнікаў», які напісаны жывой мовай і на аснове канкрэтных фактаў, зроблена спроба адысці ад схематычнага пераказу. Ён будзе карысны і павучальны і для шматлікіх работнікаў рэспубліканскага і абласных радыёкамітэтаў, і для студэнтаў факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна, і для многіх чытачоў.

Значнае месца ў кнізе адведзена літаратурнаму і музычнаму вяшчанню. І гэта зразумела. Тэатральныя пастаноўкі ля мікрафона, літаратурныя чытанні, канцэрты выклікаюць цікавасць у слухачоў, маюць выхаваўчае значэнне. У раздзеле «Мастацкае слова на радыё» зроблена справаздача, што перадало радыё за апошні час у эфір, з якімі пастаноўкамі, выступленнямі пісьменнікаў, з якімі новымі творамі пазнаёміла сваю шматмільённую аўдыторыю. Тут цяжка папракаць аўтараў, што яны не далі дэталёвага разгляду тых ці іншых твораў. Але ж у прынцыпе, на прыкладзе адной-дзвюх пастановак, сцэнарысты або рэжысёры маглі б падзяліцца вопытам стварэння такіх перадач. Зразумела, для пэўнага кола чытачоў дастаткова даць пералік назваў, ды хацелся б прачытаць адказы і на пытанні—«хто?» і «як?» усё рабілі і робяць на студыі.

Тэлебачанне і радыё з'яўляюцца самай вялізнай канцэртнай «залай» рэспублікі. Выступленні самых выдатных майстроў і самых славутых калектываў могуць слухаць і глядзець адначасова мільёны людзей. Раздзел кнігі «На музычнай хвалі» знаёміць нас з музычнымі калектывамі тэлебачання і радыё — хорам, інструментальным ансамблем, аркестрам, салістамі.

Невялікі раздзел кнігі знаёміць чытачоў з работай студыі тэлебачання, паказвае, як малады калектыў авалодвае новай цікавай справай, як ён з першых дзён натхнёна ўзяўся за работу— пачаў ствараць перадачы розных жанраў, пастараўся даць шырокую інфармацыю аб надзённых праблемах, арганізуе і праводзіць перадачы на прамысловыя і сельскагаспадарчыя тэмы, выпускае тэлевізійныя часопісы. З атрыманнем новай тэхнікі — ПТС — тэлебачанне выйшла, як кажуць, на аператыўны прастор і пачало даваць перадачы з месца падзей — з заводаў і фабрык, з навуковых устаноў, са стадыёнаў і тэатраў, канцэртных залаў.

Шкада, што аўтары не называюць рэжысёраў, пастаноўшчыкаў, аўтараў сцэнарыяў і тэлеспектакляў або тэлефільмаў. Напрыклад, спектакль «Крах» прагучаў з блакітнага экрана на ўсю краіну. А хто яго стварыў— з кнігі не відаць. Расказваецца, напрыклад, што стваральнікі праграмы «Адзін з 36» сталі ўдзельнікамі Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, былі ўдастоены залатых і сярэбраных медалёў, грашовых прэмій. Хто ж яны, гэтыя лаўрэаты? Не называюцца таксама аўтары сцэнарыя і рэжысёр пастаноўкі паводле рамана «Людзі на балоце»... Ад такога выдання чакаеш і творчых партрэтаў (або штрыхоў да іх) сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў. На жаль, гэтага не зроблена.

Адчуваецца, што кніга тэрмінова рыхтавалася да пэўнай даты. І гэта не магло не адбіцца на яе якасці. Увогуле ж зборнік артыкулаў будзе карысны для работнікаў тэлебачання і радыё. У агульных рысах ён знаёміць чытачоў са складанай і важнай работай беларускага тэлебачання і радыё.

М. ДОСІН.

Гаворыць і паказвае Беларусь. Мінск, «Беларусь», 1975.

НАВІНЫ ЭКРАНА

ЗА РАДКОМ ДЫРЭКТЫЎ

Аб'яднанне «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» выпусціла на экраны новы дакументальны фільм «Усяго адзін радок». Стужка расказвае аб будаўніцтве Вілейска-Мінскай воднай сістэмы, завяршэнне якога прадугледжвалася Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС.

Гледачы «пабываюць» на будоўлі, убачаць, як воды Віліі пайшлі ў Мінск, пазнаёмяцца з людзьмі, якія вырашылі найскладанейшую гідратэхнічную задачу.

У КАДРЫ—САМАДЗЕЙНЫЯ АРТЫСТЫ

Група кінематаграфістаў аб'яднання «Тэлефільм» пачала здымкі каляровага музычнага фільма-канцэрта «Гармонікі весела граюць». Героі будучай карціны — этнаграфічныя харавыя калектывы вёсак Канатоп і Галоўчыцкая Буда Нараўлянскага раёна. Здымкі, пачатыя ў Нароўлі, працягнуцца ў Мазырскім раёне і на літоўскай студыі ў Вільнюсе.

БЕЛТА.

Беларускі кампазітар У. Алоўнікаў (злева) і ўкраінскія кампазітары Г. Ляшэнка і М. Скорык сярод навучэнцаў Брэсцкага музычнага вучылішча.

Фота Э. КОБЯКА. (БЕЛТА).

ФЕСТЫВАЛЬ САМАДЗЕЙНАЙ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ 1975-1977

НА БЕРАГАХ ВУЗЛЯНКІ...

ГРУПА моладзі збочыла на знаёмую сцяжынку, на прывеглае святло клуба. А стаіць ён у Сватках на высокім пагорку, сярод бяроз, вішняку і яблынь, непадалёку ад крыштальнай і бруістай Вузлянкі. Па вечарах, калі зайграе гармонік, музыка склікае сюды ўсіх: і моладзь, і пажылых калгаснікаў. Нездарма ж у Нарачанскім краі называюць Сваткі спеўнай вёскай.

Пры клубе працуюць фальклорна - этнаграфічны ансамбль, харавы калектыў, вакальны гурток, група дэкламатараў, спартыўныя секцыі.

Амаль чвэрць веку ўзначальвае хор, самы вялікі ў раёне, настаўніца мясцовай сярэдняй школы Вольга Іванаўна Пястун. За гэты час яна выхавала не адно пакаленне вясковых артыстаў.

Народны фальклор, сучасныя беларускія песні — усё тое самабытнае, што любяць тут спрадвеку, прыйшло ў рэпертуар калектыву. Сваткаўскі хор — гонар народных талентаў Мядзельшчыны. Сёння ён налічвае добрую паўсотню ўдзельнікаў. За апошнія гады канцэрты гэтага калектыву былі ў самой вёсцы Сваткі. У іх апавядаецца аб шчаслівай долі, добрых здабытках хлебаробаў — багатых ураджаях, праслаўляюцца блакітныя прасторы азёрнага краю.

Сваткаўскім артыстам часта даводзіцца выступаць са сцэны сельскага клуба перад паляводамі, жывёлаводамі, механізатарамі. Так, зусім нядаўна ў гонар лепшых даярак Яніны Калбун, Тацяны Малько, цялятніцы Ніны Янель і іншых пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва былі выкананы іх любімыя песні. Не забываюць удзельнікі самадзейнасці павіншаваць жывёлаводаў і трактарыстаў са святамі, з днём нараджэння, з поспехамі ў працы.

З тэматычнай праграмай «Хвала рукам, што пахнуць хлебам» яны пабывалі ва ўсіх паляводчых брыгадах калгаса «Зара», у хлебаробаў калгасаў імя Леніна і імя Суворава, выступілі на раённай нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Многія выхаванцы хору хутка стануць прафесіянальнымі спевакамі і музыкантамі. У Мінскім музычным вучылішчы імя Глінкі вучыцца Люба Роўда, у кіеўскай кансерваторыі — Уладзімір Каўрус. Дачка Вольгі Іванаўны — Святлана — займаецца на музычна-педагагічным факультэце педінстытута імя М. Горкага.

Вядомыя майстры прафесіянальнага мастацтва Беларусі народны артыст СССР Рыгор Раманавіч Шырма, народны артыст БССР Юрый Уладзіміравіч Семяняка, прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі Віктар Уладзіміравіч Роўда адзначаюць зладжанасць, чысціню гучання і сапраўдную народную непасрэднасць Сваткаўскага хору. Паслухаць песні ў яго выкананні восенню мінулага года прыязджалі ў Мядзель дзеячы культуры з братняй Эстоніі.

Ідзе першы Усесаюзны фестываль самадзейнай мастацкай творчасці працоўных. Сваткаўскі хор яшчэ не раз будзе чараваць сваімі самабытнымі песнямі слухачоў Нарачанскага краю.

М. СІСКЕВІЧ.

Не толькі ў Беларусі вядомы гэты калектыў. Народны ансамбль песні і танца «Маладосць» Віцебскага гарадскога Дома культуры выступаў у Смаленскай, Пскоўскай і іншых абласцях.

На здымку — выступаюць удзельнікі ансамбля песні і танца «Маладосць».

Фота Ул. КРУКА.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

НА ТАНЦПЛЯЦОЎЦЫ І ВАКОЛ ЯЕ

ХАВАЕЦЦА сонца за дамамі. На паркавых алеях згушчаюцца прыцемкі. Раптам, ускалыхнуўшы цішыню, з глыбіні парку даносяцца звонкія гукі электрагітар. Чародкі дзяўчат і хлопцаў, паскараючы крок, накіроўваюцца туды, адкуль данеслася музыка...

Штовечар некалькі тысяч маладых мінчан аддаюць свой вольны час танцавальнай пляцоўцы. Мне давялося пагутарыць, па меншай меры з паўсотняй яе наведвальнікаў, — у парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, парку імя Чалюскінцаў, на танцавальнай верандзе Дома культуры пятага будтрэста. На жаль, пакуль што танцы для многіх з іх не сталі неабходным элементам агульнай культуры, тым, што прыносіць эстэтычную радасць, што духоўна ўзбагачае. І мяшчанскія ўяўленні аб «танцульках» бесперашкодна вандруюць дагэтуль. Ці не таму многія жанатыя пары, наогул старыя людзі, лічаць за сорам наведваць танцпляцоўку? Вось і атрымліваецца, што, акрамя як на свята, пажылому чалавеку няма дзе патанцаваць...

Аб гэтым падумалася ўжо пазней, калі ў блакноце занатавалася шмат назіранняў з доўгіх, насычаных уражаннямі, вечароў.

Спачатку некалькі інтэрв'ю.

Аляксандр Савіч, фрэзеровшчык інструментальнага завода: «Мне 23 гады, і, бадай, гадоў восем я хаджу на танцпляцоўку. Танцаваць, праўда, нідзе не вучыўся, але гэта не перашкаджае: танцую ўсё запар. Танцавальны вечар не прамяняю ні на кіно, ні на тэатр».

Сяргей Фядорчанка, наезнік Маскоўскага цырка. «Я тут у адпачынку. І вось рашыў пайсці патанцаваць. Уражанні? Ведаеце, я шмат раз'язджаю па краіне, дык вось, скажам, у Пермі, Харкаве, дзе давялося набываць у апошні час, ад танцпляцовак самае прыемнае ўражанне. У вас жа, на жаль, засмучае не вельмі высокая культура. Маю на ўвазе хаця б манеру запрашэння на танец, адносіны паміж партнёрамі...»

Дзве медыцынскія сястры Людмілы (прозвішчы свае яны адмовіліся назваць): «Цяпер танцы наведваем вельмі рэдка і то ў асноўным, каб паслухаць музыку. Рэгулярна мы ходзім на вечары зімою, у клуб імя Дзяржынскага. Там публіка больш культурная. Тут жа можа падысці і запрасіць танцаваць п'яны, або хлопец з цыгарэтай у зубах».

Сапраўды, часам танцы ў нас нагадваюць дзіўнае відовішча. Вось ківаюцца са сціснутымі кулакамі два хлопцы—гэткія задзіры-пеўнікі. Побач нязграбна, бокам, прытрымліваючы торбу, што коўзаецца на плячы, скача дзяўчына. Яе сяброўкі паклалі сумкі ў цэнтры круга і таўкуцца пад імі.

Здавалася б, забаўна. А падумаць—сумна: тых, хто танцуе, значна больш, чым тых, хто ўмее гэта рабіць. Імправізацыйнасць — прывабная рыса масавых танцаў. Менавіта праз імправізацыю раскрываецца індывідуальнасць. Але ж імправізаваць можна не наогул, а маючы пэўную харэаграфічную базу. Яе маюць адзінкі—вось галоўная прычына безгустоўнасці, якая панае на танцпляцоўках.

Танцы тут прыпята падзяляць толькі на хуткія і павольныя. Можна нават зусім не ведаць назвы танцаў. Шэйк ці казачок, танга ці павольны факстрот — абы суправаджэнне, пад якое зручна «ламаць» часам адзіны ўбогі рух. Басанову тут па няведанню прымаюць за аркестровы ўступ да вечара, вальсу, як правіла, аб'яўляюць байкот. А ўвесь той танцавальны сурагат, што нараджаецца ад няўмелага капіравання горшых узораў, чамусьці пахрысцілі шэйкам, а шэйку, зусім нявіншаму танцу, абаронцы нораваў аб'явілі вайну.

Ну, а дзе ўсё ж такі навучыцца танцаваць? У Мінску працуюць школы бальнага танца. Але не сакрэт, тут рыхтуюць у асноўным удзельнікаў конкурсаў. Іх цярпліва выцягваюць на конкурсную праграму, якая не мае амаль нічога агульнага з рэпертуарам масавай танцпляцоўкі. Сур'ёзныя харэографы, на жаль, на танцпляцоўку амаль не заглядваюць. Былі, праўда, такія-сякія спробы арганізаваць развучванне танцаў непасрэдна на пляцоўках, але вынікаў стаўчых не відно.

Адбываецца гэта, мабыць, з-за наогул нізкай танцавальнай культуры моладзі, якую яшчэ ў школе не знаёмяць з азамі харэаграфіі. А шкада. Вырашэнне гэтай праблемы ўскосна прывяло б да аздараўлення клімату танцпляцовак, пабрацця добрай музыкі, калі нашы кампазітары, па сутнасці, спецыяльна для танцпляцоўкі не пішуць? Прыходзіцца прыстасоўваць для гэтых патрэб песні з рэпертуару папулярных выканаўцаў, улічваючы, што не кожная змястоўная песня дарэчная па танцах. Прыходзіцца «падганяць» іх на свой інструментальны састаў, свае вакальныя магчымасці. А не-не ды і частаваць непатрабавальную публіку акрошкай—папуры на тэмы мелодый з фільмаў, вулічных куплетаў і дзіцячых песенак. Далёка ж не кожнаму калектыву, такім, як «Сябрам» з парку імя Чалюскінцаў, або «Эксперыменту» з Дома культуры будтрэста № 5, пашанцавала на здольных аранжыроўшчыкаў і кампазітараў-аматараў.

Музычны патруль гарадскога камітэта ЛКСМБ адзначыў у выніках праверкі танцавальных пляцовак паляпшэнне выканаўчага ўзроўню аркестраў. І ўсё ж такі каля некаторых танцавальных пляцовак не шкодзіла б устанавіць знак—папярэджанне: «Беражыце вушы!» Стоячы ў некалькіх метрах ад уваходу (а ён жа ў супроцьлеглым канцы ад эстрады), не чуеш уласнага голасу. А як паразмаўляць партнёрам у час танца?

Ёсць на што паскардзіцца самім музыкантам. Слухаеш — дзіву даешся. Удзельнікі «Эксперыменту» вымушаны ўсякі раз перацягваць цяжкія скрыні апаратуры з Дома культуры і назад, бо на верандзе няма падсобнага памяшкання. Драўляная будыніна за летняй эстрадай парку імя Чалюскінцаў не захоўвае інструменты ад холаду і вільгаці. Касцюмы, пашытыя для «Сяброў», не апранеш прахладным вечарам, і тады ансамбль выглядае пярэста і будзённа.

А чым займаецца публіка ў перапынках, калі адпачываюць аркестранты? Барыс Смольнік — давялі вопытны масавік. У яго ёсць картатэка, у якой запісана 700 масавых гульняў. Аднак чаму так пасіўна, абыякава ставіцца моладзь да масовак? Значна больш аматараў удзельнічаць у тэматычных віктарынах, больш жадаючых паслухаць цікавага чалавека або паглядзець паказальныя танцы. Ці не сталі масавыя гульні ва ўмовах тысячнай аўдыторыі анахранізмам? Такое меркаванне выказаў у час нашай размовы і загадчык аддзела прапаганды Мінскага ГК ЛКСМБ В. Корзун. Тое, што сёння падышло б толькі для піянерскага ранішніка, навязваецца дарослым людзям. Ужо без спецыяльных даследаванняў відавочна, што некаторыя забавы выглядаюць наплавата, а вось вясёлыя «мульцікі» ў перапынку або цікавы дакументальны фільм знаходзяць масу прыхільнікаў, тое самае можна сказаць пра дэманстрацыю прычосак або сучасных мод.

Сацыёлагі, псіхолагі, работнікі культуры і камсамол змаглі б распрацаваць новую метадалогію арганізацыі вольнага часу моладзі. Праўда, амаль немагчыма эксперыментаваць на буйных пляцоўках, дзе склаліся свае традыцыі. Лепей мець невялікі «вопытны ўчастак», мабільны калектыў, на якім можна вывучаць запатрабаванні моладзі, правяраць мэтазгоднасць новаўвядзенняў. Такой своеасаблівай лабараторыяй мог стаць гарадскі маладзёжны клуб, накшталт рыжскага клуба «Алегра». Са здзяйсненнем гэтай ідэі звязана вырашэнне многіх праблем адпачынку.

Дазволю сабе крыху пафантазіраваць і ўявіць, скажам, такую летнюю танцпляцоўку. Бліскучы паркет, арыгінальна афармленая эстрада. Асвятленне па колеру і яркасці адпавядае характару чарговай мелодыі. Рассоўны дах—на выпадак дажджу. У кутку адпачынку—лаўкі, столікі з газетамі і рэкламамі, настольныя гульні, гардэроб. Буфетная стойка з прахладжальнымі напіткамі, ласункамі. І людзі—з густам апрануты, ветлівыя, жыццярадасныя — моладзь, пажылыя людзі.

Фантазія не далёка адарвалася ад рэчаіснасці: падобныя танцверанды існуюць у латвійскай сталіцы. Зусім не трэба механічна капіраваць чужы вопыт, але пераняць лепшае, павучыцца ў сваіх суседзяў варта. Каб зрабіць нашы танцы формай сапраўды культурнага адпачынку.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ.

Іван МЯЛА

Перадні край

ДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ

ЧАГО толькі не пабачыш у камандзіроўках!

Саўгас «Бярозкі». Гомельскі раён на Сожы, а мяце пяском як у Кушцы. З поймы Іпуці — прытоку Сожа, за густым ячменем — сцянасцяной — які абяцае цэнтнераў з сорак з гектара, ідуць статкі на дойку. Ідуць па высакагор'і і рыжая смуга пылу дымавой заслонай сцелецца на прысядзібныя ўчасткі, а белыя кветкі бульбоўніка ўсё роўна ззяюць пад гарачым сонцам...

Ветэрынарны ўрач саўгаса Пятро Ягоравіч Карпенка, заслужаны ўрач БССР, з неахвотаю пагадзіўся пусціць мяне на комплекс, праўда, у суправаджэнні лепшага свайго ветфельчара Чэусава (ён жа лепшы ветфельчар раёна) і дазволена мне было ехаць толькі ў кабіне дэзаўстаноўкі Камарова, якая па сваёй форме нагадвала кароткую ракету, пастаўленую на шасі. І раптам перад намі вынырнула з-за высокага жыта звычайная машына для паливання гарадскіх вуліц. Ідзе і моцныя струмені вады паліваюць не ячмень, а раз'езджаную дарогу.

— Адкуль яна тут? Навошта?

— Нельга, каб на саўгасную бальніцу ляцеў пыл.

Да той бальніцы, што стаіць сярод таполяў, з кіламетр. Зямля прамакае на сантыметр. А сама ж паліваная машына ўзламвае карычневую скарынку, пад якой яшчэ на пяць вяршкоў пушыстага пылу. А ён усё роўна ляціць на пасёлак з дзесяці двароў і на саўгасную бальніцу. Не зусім рэнтабельна. Хто спіша бензін і заплаціць шафёру, па якому артыкулу? Іншая справа, калі б пагражала эпідэмія. А так, прыязджаем на комплекс: заасфальтаваныя дарогі і нейкае ўрачыстае ззянне вакол агароджы. І яшчэ кідаецца ў вочы прыемная чысціня і сіметрычнае размяшчэнне памяшканняў. Ва ўсім прапорцыі, нават у сеткавай рашотцы, якая агароджвае ферму. Усё гэта так далёка ад існуючага стагоддзямі паняцця «скотны двор». Унутры халаднаватых улетку кароўнікаў з машынным даеннем ніводнай мухі. У вялікай, як ангар, зале, чатыры каровы з хворымі капытамі. У кожнай вымя, як двухвядзёрны чыгун. Страшнавата глядзець — ці не пухліна гэта? Аказваецца, з-за такога вымя гэтых кароў не здаюць на мяса. Усе заразныя хваробы ліквідаваны. Засталася адна — хвароба капытоў — біч усіх сучасных комплексаў ад таго, што жывёлы стаяць на цвёрдай падлозе. Для ўвядзення шчыліннай падлогі патрэбна капітальна пераабсталяваць шырокагабарытныя кароўнікі, што гаспадаркам не выгадна. І гэтак на многіх фабрыках малака.

У пачатку чэрвеня мяне вельмі засмуцілі зводкі раённых і абласной газет па надоях малака і здачы мяса дзяржаве. І надой малака, і прывага былі ніжэйшыя, чым у мінулым годзе, план здачы прадуктаў жывёлагадоўлі дзяржаве не выконваўся. Я ездзіў спецыяльна ў суседні з Гомельскім — Веткаўскі раён. Два раёны на Сожы, а па глебавых умовах Гомельскі — першай катэгорыі, Веткаўскі — аднесены аж да 4-й катэгорыі, і ўнутры гэтага раёна гаспадаркі падзелены на 3 групы. Веткаўскі раён вельмі пацярпеў ад цяжкай зімы. Відзе, здаецца, не бачыў я такіх палявых дарог, як у Веткаўскім раёне. Ляжалі яны, як расплеценая вяроўка, паміж лагчын і пясчаных узвышкаў. З Тарасаўкі на Ветку пралягае шэсць звілістых пясчаных дарог, на іх дванаццаць пракладзеных аўтамашынамі каляіны-стужак. Жоўтая рака з астраўкамі. Зялёныя астраўкі з шурпатых кустоў дробяць дарогу, і яна разбягаецца ў розныя бакі, выбірай, па якой ісці, каб убаку не пакінуць Ветку. Глядзіш, і праз якія паўвярсты зноў сышліся, зліліся ў адну дарогу. К восені мінулага года на такіх супясчаных землях трава пажухла і план нарыхтоўкі кармоў застаўся нявыкананым. Да вясны не хапіла кармоў. Жывёлу падтрымлівалі на галінным корме ды карбамідзе. Разлік быў такі, што аміяк, які выдзяляецца з карбаміду, будзе засвойвацца ў рубцы каровы інфузорыямі і сінтэзавацца ў бялок. Але з падкормкамі, відаць, перахапілі, яны не замянілі ні камбікармоў, ні сена. Аміяку выдзялялася больш, чым маглі яго засвоіць інфузорыі, і ён усасваўся праз сценкі набрынялага рубца і сценкі кішэчніка ў кроў. Пастэрызаванае малако пачынала патыхаць гноем, яно стала непрыгодным для вырабу масла. У выніку розных падкормак вясной было прададзена ў раёне больш як 3.700 тон малака другім гатункам. У саўгасах атрымана нявяканага малака — 4,2 працэнта. Горкі вопыт. Цяпер увесь Веткаўскі раён жыве вялікім напружаннем, выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці, каб нарыхтаваць як мага больш кармоў.

Вось чаму мяне так узрадаваў зрух па надоях малака ў саўгасе «Бярозкі». У мінулым годзе сярэднясутачныя надоі на карову складалі 11—18 літраў, цяпер 19—20. Калі мы вярталіся назад з фермы, паліваная машына ўсё яшчэ кружыла вакол населенага пункта з участковай бальніцай і ўсё ж дабілася свайго — на палявых дарогах замест пылу ляжала жоўтая гразь. Вецер пачаў сціхаць, але ўвесь гарызонт быў зацягнуты жоўтай імглой. І мне зноў успомнілася Ветка. Там ва ўсім раёне, па гарызонту і побліз дарог белыя вялізныя фантаны. Нахільныя струмені аграмадзін фантанаў круцяцца. Вось раструб паліваючай машыны паварочваецца па ветру і фантан ляціць метраў на 50, падае, але ад яго паспяваюць адарвацца і закруціцца віхры з дробных пыркаў. Адзін за адным, ззяючы дзесяццю вясёлкамі, плывуць, як дзяўчаты ў карагодзе, — дзесяць празрыстых жыватворных віхроў яшчэ метраў на сто. За два тыдні палівання Сож, з якога бяруць ваду заборнымі трубамі, абмялеў больш як на метр. І рэчка Іпуць, якая ўпадае на палях саўгаса «Бярозкі» ў Сож, амаль удвая паскорыла сваё цячэнне, каб выраўняць свой узровень з узроўнем вады ў Сожы. Яна стала падобнай на бурлівую горную рэчку, а была ж ціхая, спакойная і глыбокая Іпуць, якая пачыналася дзесьці ў глыбіні бранскіх лясоў і сілкавалася прытокамі яшчэ некалькіх бранскіх лясных рэчак. Спяшаецца, бяжыць бранская вада на выручку ўсходняга Палесся. Але ў Веткаўскім раёне не проста пачалі ўводзіць паліў траў. Намеснік старшыні райвыканкома Ягор Максімавіч Федасеенка, энергічны чалавек, у перапынках, пакуль ездзілі на семінары па калгасах і саўгасах, вывучалі прывязны спосаб утрымання жывёлы на пашах і травасеянні, гаварыў, адказваючы на мае надакучлівыя пытанні:

— Галоўная задача раёна — травы, паліванне траў і падкормка. Травы падсеяны галоўным чынам пад ячмень на плошчы 3.371 га, план пасеву кукурузы перавыкананы, пасеяна 1.500 га. Райвыканком у свой час аб'явіў месячнік барацьбы з пустазеллем, у гаспадарках мабілізавалі на праполку ўсё насельніцтва, у тым ліку школьнікаў і студэнтаў. Плантацыі буракоў і бульбы прапалаты. У саўгасе «Свяцілавічы» гербіцыдамі апрацавалі 626 га аўса і 670 га ячменю. Падкормліваліся шматгадовыя травы аміячнай салетрай... Са шматгадовых траў, апрача канюшыны, сеем баркун, люцэрну, аўсяніцу і цімафееўку. Асваенне ў раёне шматгадовых траў дало магчымасць перайсці да больш рацыянальнага ўтрымання жывёлы — цяпер на прывязі пасецца 2.300 галоў.

А людзі? Як яны працуюць? Я сам бачыў як яны працуюць. Усяго адзін прыклад. Па нагаданай вышэй разгалінаванай дарозе кожны дзень ездзіць з Веткі — райцэнтра — у Вялікую Тарасаўку на сваёй машыне інвалід Аляксей Рыгоравіч Муха, ён — машыніст траваперапрацоўчага агрэгата, які працуе кругласутачна. Ён працуе на пару з машыністам Сцяпанам Сяргеевічам Халадковым. Побач блакітны вагончык — гэта чырвоны куток, дзе, акрамя графіка выканання работы, тут ёсць шмат газет і часопісаў: «Коммунист», «Агитатор», «Советские профсоюзы», «Бюллетень научно-технической информации МСХ БССР», «Наука и религия». Жывуць тут добрыя і працавітыя людзі. Кожны вырабляе па 6—7 тон вітаміннай мукі. Глядзеў я на іх магутны агрэгат, з'ездзіў на поле, дзе тры сіласарэзкі гналі ў кузавы пяцітонных машын з прыбудаванымі высокімі бартамі фантаны здробненай зялёнай цімафееўкі, і думаў, што магутныя машыны здольныя высушыць і перацерці ў вітамінную муку наогул усе запасы шматгадовых траў раёна.

У мінулым годзе я настойліва дабіваўся ад заслужанага ветурача БССР Віктара Аляксеевіча Андросава, члена Гомельскага раённага савета па міжкалгаснаму кааперыраванню:

— Кажуць, што ветэрынарныя ўрачы цяпер не займаюцца сваёй работай? Што такое «свая работа»? Эпізаты ў раёне ёсць?

— Няма.

— Цяляты гінуць?

— Здараецца, але не ад заразных хвароб.

— Што ж тады рабіць ветэрынарнаму ўрачу, калі прышчэпкі супраць усіх хвароб закончаны?

— Кармы... паболыш кармоў жывёле... Памяшканні... Прафілактыка, і атрымліваецца накшталт не сваёй работы, — сказаў, пакрыўдзіўшыся, Віктар Аляксеевіч.

— У чым поспех такіх комплексаў, як у калгасе імя Урыцкага?

Падняўся над сваім рабочым сталом асілак Віктар Аляксеевіч, навіс нада мною гарачымі сінімі вачамі. «Усё ж старыя знаёмыя, — думаю, — скажа пра тое, што мне так хочацца ведаць, каб не адчуваць сябе ў хвасце падзей».

— Не скажу, — крыху павагаўшыся, сказаў ён. — Гэта наш вытворчы сакрэт.

Цяпер я бачыў Андросава зусім мала, снуе па гаспадарках цэлымі днямі. Але вытворчы сакрэт, пра які змоўчаў Андросаў, аказаўся зусім не сакрэтам. У Веткаўскім раёне нядаўна адбылася цырымонія ўручэння пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР і БРК прафсаюзаў рабочых і служачых сельскай гаспадаркі і нарыхтовак саўгасу «Сігнал» за поспехі, дасягнутыя ў мінулым годзе. Гэтая гаспадарка дала на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў 108,8 цэнтнера мяса. У гэтым годзе к сярэдзіне чэрвеня атрымана мяса па 186,9 цэнтнера на 100 га, а план здачы мяса дзяржаве выкананы на 199,8 працэнта. Гаспадарка атрымала больш як 400 тысяч чыстага прыбытку. У чым жа вытворчы сакрэт? У мінулым годзе «Сігнал» закупіў у калгасах і саўгасах Веткаўскага раёна 1.960 галоў маладняку сярэдняй вагой 270 кг кожная жывёла па цане 2 руб. 36 кап., за кілаграм, г. зн. па той цане, якая была на балансе гаспадарак-пастаўшчыкоў. Здалі б дзяржаве гэтыя гаспадаркі не даведзены да высокіх кандыцый маладняк, атрымалі б па 1 руб. 58 кап. за кг. Такім чынам, добры дзядзька «Сігнал» за свой кошт пакрыў гаспадарчыя выдаткі пастаўшчыкоў, пераплаціўшы на кожным кілаграме на 1 руб. 13 кап. Усяго гэтым «дзядзькам» было выплачана гаспадаркам-пастаўшчыкам дадаткова 410 тысяч рублёў. «Сігнал» адкарміў кожную жывёлу да сярэдняй вагі 438 кг і сёлета здаў дзяржаве адкормны маладняк па 2 руб. 70 кап. за кг.

— Мала! — сказаў мне бухгалтар калгаса «Камуніст». — Калі яны давялі адкорм да вышэйшых кандыцый, ім павінны заплаціць па 2 рублі 90 капеек.

Калгас «Камуніст» адзін з пастаўшчыкоў маладняку, але ўжо ў другім раёне, Гомельскім. Пастаўляе ён свой маладняк на комплекс калгаса імя Урыцкага. Апрача таго гэта адзін з калгасаў, дзе даўно сеюць шматгадовыя травы.

У калгасе «Камуніст» 700 кароў, столькі ж, прыкладна, стаіць на адкорме цялят. Пераважная колькасць цялят для папаўнення фермы была закуплена ў прыватных асоб, сваіх калгаснікаў.

У адным памяшканні стаяць на адкорме 113 бычкоў, сярэднесутачная прывага — 1,1 кг на аднаго бычка. Яны дасягнулі вагі, прыкладна, па 310 кг. Узважванне бычкоў рабілася пры мне. Загадчыца фермы Антаніна Васільеўна Васількова і галоўны заатэхнік Вольга Аўдзееўна Пірагова ўсхваляваны. Вестка аб правядзенні ў раёне міжрэспубліканскага семінара па жывёлагадоўлі ўсіх разварушыла, паслужыла каталізатарам для навядзення на фермах ветэрынарна-санітарнага парадку. Але жывёлаводы калгаса «Камуніст» усхваляваныя па іншай прычыне. Калгас імя Урыцкага захацеў да семінара заноўніць адкормнай жывёлай свой вялізны комплекс і пачаў шмат закупляць жывёлы ў калгасаў-пастаўшчыкоў. 113 бычкоў трэба было тэрмінова перагнаць або перавезці на машынах з аднаго канца раёна ў другі. І маладая худзенькая заатэхнік Вольга Аўдзееўна нервавалася, хадзіла ля маладняку, аглядала капыты: ці няма ў каторага трэшчын? Ці дойдуць? Давала апошнія распараджэнні жывёлаводам. Бычкі абыякава жавалі ў цяню здробненую зялёную масу, насыпаную ў цэментавыя карыты, ззаду іх ціха паўзла стальная стужка скрабковага транспарцёра. Заатэхнік і загадчыца фермы, жывёлаводы былі сумныя, — усім ім, і нават мне, рабочаму на ферме, было шкада расставацца з рахманымі чорна-белымі бычкамі. Акрамя таго жывёлаводы трацілі грошы. За высокую прывагу яны атрымлівалі па 200—250 рублёў у месяц, а цяпер набяры такую групу! Пакуль сам да іх прывыкнеш, пакуль яны да цябе прывыкнуць і пачнуць зноў даваць сутачную прывагу — залатыя тыдні мінуць.

— Маглі б вы адкарміць гэтых бычкоў да 430 кілаграмаў?

— Вядома, маглі б, — гаварылі жывёлаводы. — Травы хапіла б.

— Па якой жа цане вы іх прадаеце? — спытаўся ў загадчыцы фермы.

— Не менш як па тры рублі за кілаграм, — адказала Антаніна Васільеўна. Яна назвала цану за сваіх адкормачных бычкоў. Калі ж я спытаўся ў бухгалтара, па якой цане яны прадаюць бычкоў калгасу імя Урыцкага, той замуляўся і цану не назваў.

— Цана вызначыцца ў раённым маштабе, не мы адны гаспадаркі-пастаўшчыкі.

Пра што ж хацеў мне сказаць галоўны ветфельчар Гомельскага раёна Андросаў. Пра тое, што папаўненне комплексу калгаса імя Урыцкага — складаная справа і патрабуе вялікага напружання, бо маладняк паступае на комплекс з розных месц: ад непасрэднага ўзнаўлення, ад гаспадарак кааперавання і прыватных асоб. Спашлёмся на вопыт Мінскай вобласці. Адкормачны саўгас «Урэцкі» ў мінулым годзе з 4.522 пастаўленых на адкорм жывёл атрымаў: ад гаспадарак аб'яднання — 32,8 працэнта; купіў у насельніцтва і гадаваў у сваёй гаспадарцы — 38,1 працэнта; выгадаваў у сябе ад уласнага ўзнаўлення — 7,2 працэнта; нарыхтоўчага — 22,4 працэнта. Пры гэтым цана, вызначаная аб'яднаннем за кілаграм жывой вагі была: пры вазе жывёлы 240 кг — 2 руб. 80 кап.; пры вазе 300 кг — 2 руб. 60 кап., а цана нарыхтаванай жывёлы і купленай у насельніцтва ніжэйшая: пры жывой вазе 250 кг — 1 руб. 58 кап., пры вазе 300 кг — 1 руб. 90 кап.

А цяпер вернемся да даўно існуючага мярыла эканамічнай магутнасці гаспадаркі: колькі цэнтнераў атрымана мяса і малака на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў? І тут з ар-

(Заканчэнне на стар. 14).

Паэты братніх рэспублік

Народны пісьменнік Туркменістана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ТССР імя Махтумкулі Керым Курбаннепесаў нарадзіўся ў 1929 годзе ў сям'і селяніна ў Геок-Цепінскім раёне Ашхабадскай вобласці.

Працаваў на будаўніцтве Цеджэнскага вадасховішча, служыў у Савецкай Армії.

Першы зборнік яго вершаў выйшаў у 1952 годзе. Керым Курбаннепесаў перакладаў на туркменскую мову паэмы і вершы рускіх, украінскіх і замежных паэтаў.

Керым КУРБАННЕПЕСАЎ

ГАЛАВАКРУЖЭННЕ

Упаў хлапчук, закружаны ў гульні,
І маці кажа сыну: — Адпачні!..
Калі зямля выскаквае з-пад ног,
У іншы бок кружыся, мой сынок!

— А можаш ты дарослых навучыць,
Як галавакружэнне ў іх лячыць?
Закружыць слава галаву каму —
Чым вылечыць яго? Вядома мала!
Пабегчы трэба ў бок які яму,
Каб зноў усё пасля на месца стала?

— Гульня ці слава—ўсё адно, мой сын.
Назад кружыся — сродак тут адзін.
Ты ганарлівы — зноў ідзі туды,
Дзе простым быў, дзе мог з людзьмі ты зжыцца,—
І стане ўсё на месца назаўжды,
І перастане галава кружыцца!

●

Скажыце, заўважалі, як ішлі вы
Між вулічнай цякучай цеснаты
Адзначаныя глыбінёй тужлівай
Людскія твары сумнай пекнаты!

Скажыце, мабыць, вам тады карцела
Пабегчы за прахожым наўздагон,
Прызваць на выручку ўсю вашу смеласць, —
Даведацца, чаму журботны ён!

Мне скажуць і прыстойна, і разумна:
«Бяду чужую варушыць нашто?
Хай ведаць будзеце прычыну суму, —
Нічым не зможа памагчы ніхто».

Без лішніх спрэчак згодзен я з усімі:
Няма пілюль і кропель ад бяды.
Ды калі ў горы памагчы бяссільны,
Які ж на свеце я паэт тады!

ЦАНА СВІТАННЯ

Многа аб чым у жыцці я тужыў:
Неяк цудоўны канцэрт прапусціў,
Фільма цікавага ўбачыць не змог,
Дзень быў замкнуты музей на замок
У гарадку, дзе я суткі гасціў.

Многа аб чым я раней шкадаваў:
Неяк знясілены тысячай спраў,
Злоўлены сотняю важных прычын,
Я прапусціў дзень спаткання адзін,
Я прапусціў дзень спаткання другі —
Як шкадаваў я аб ім, дарагім!

...Я на світанні ўстаю нездарма,
Лепей відовішча ў свеце няма!

Радасць — убачыць заранак штодзень,
Радасці большай няма для людзей!
Мне шкадаваць сёння суджана зноў
Не аб канцэртах і не аб кіно,
Не аб музеях, дзе я не бываў,
Не аб спатканнях, што я празяваў, —
Кожны заранак, не ўбачаны мной,
Зноў бы вярнуў...
Ды якою цаной?
Гэта не верне ніхто ўсё адно.

Пераклаў М. АЎРАМЧЫК.

Пярэдні край

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13).

гапізацыяй буйных комплексаў пачалі раскрывацца нажніцы. Па многіх вядомых калгасах Веткаўскага раёна назіраецца рэзкае зніжэнне вытворчасці мяса ў параўнанні з мінулым годам. У саўгасах справы ідуць лепш. У 1975 годзе на 100 га атрымана 32,3 ц, у 1976—29,2 ц. Саўгасы выцягвае «Сігнал». Як вызначыць з пералічаных паказчыкаў эканамічны стан гаспадарак? Можна падумаць, што ў іх гаспадарках жывёлагадоўля заняпала. Ці так гэта? Калі гэтыя гаспадаркі не будуць вырошчваць маладняк да канца года, набіраючы з кожным днём па ўзыходзячай цэнтнеры мяса на кожныя 100 га, а вымушаны будуць здаваць, каб не прастойвалі комплексы, цялят вагой па 100—200 кг «Сігналу», то яны ніколі не атрымаюць плануемую вытворчасць мяса па 100 га ўгоддзяў. А здаваць яны будуць, бо такая здача ім выгадная. Тады планы, заданні і сацабавязацельствы «атрымаць столькі вось цэнтнераў мяса на 100 га» не будуць адпавядаць рэальнаму стаўлішчу спраў. Магчыма, настаў час графу «100 га цэнтнераў мяса» выкарыстаць у дастасаванні да міжкалгасных кааператыўных аб'яднанняў. Установяцца рэаліі. Не будзе сынкоў і пасынкаў. Не будзе галавакружных скачкоў вытворчасці мяса за адзін год на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў ад 108 цэнтнераў мяса да 189 цэнтнераў, або катастрафічнага зніжэння вытворчасці мяса да 2-3 цэнтнераў на 100 га, гэта значыць у 4-5 разоў. На самай жа справе такія саўгасы Веткаўскага раёна, як «Грамыкі», развіваюцца і план продажу малака дзяржаве выкананы ім у паўтара раза больш, чым у мінулым годзе. Нягледзячы па цяжкасці зімоўкі саўгас «Веткаўскі» з гонарам выканаў свае абавязацельствы: у параўнанні з мінулым годам прададзена дзяржаве мяса такая ж колькасць, а малака — на 1,6 раза больш.

А надвор'е засмучае. Вясна была зацяжная і халодная. Рост траў замарудзіўся. Пасля пачаліся сухавеі і спякота. Жоўтая пыльная смуга над сожскай поймай — такая рэдкая для зялёных дуброў і бароў, уляглася к ночы. Яе змяніў бязвоблачны дзень з ледзяным паўночным ветрам, які дасягаў 16 метраў у секунду. Надоі ў калгасе «Камуніст», у параўнанні з мінулым годам, вышэйшыя. Зноў хочацца ведаць — у чым прычына? Іду да пастуха. За фермай раўніна з аб'едзенымі шматгадовымі травамі. Дойны статак 200 кароў. Рыгор Сцяпанавіч Майсеенка працуе пастухом дванаццаты год.

— Цяпер мне за выслугу гадоў даюць прэмію,—расказвае ён.—Чаму надоі вышэйшыя? У мінулым годзе кароў трымалі толькі на пойме, дзе шмат сакавітых траў і люцікаў, а цяпер рэгулюем: папасуцца статкі на цімафееўцы—на луг гонім, пакуль цімафееўка падрасце. Адразу ўдвая на літар, а то і больш падаюць. Вяртаемся зноў на цімафееўку. Каровы наядуцца, а каторая захоча піць—шэсць жалезных карытаў стаяць па шэсць метраў кожнае. На дзень каровам прывозяць 18 цыстэрнаў вады.

Паша ад сенакосных шматгадовых траў аддзелена вадаскідваючым глыбокім каналам, за якім на высокіх стаяках вялікая паветка, пакрытая шыферам. Пад навесцю калгаснікі складаюць цюкі сена. У кіламетры на раўніне спецыяльная машына, прычэпленая да трактара «Беларусь», падбірае радкі скошаных траў і тут жа перапрацоўвае ў цюкі. Цюкі падхопліваюцца, укладаюцца на аўтамашыну і адвозяцца пад павець. Далёка на гэтым жа полі віднеюцца стагі.

— Хопіць траў?—пытаюся ў канторы.

— Павінна хапіць,—гаворыць бухгалтар. — Асабліва ў нас вялікая надзея на салому. У мінулым годзе мы нават Алтаю дапамогу саломай аказвалі—сорак тон адправілі.

Паўтары гадзіны ішоў я поймай уздоўж калгаснага жыта — густога, кусцістага—руку не праткнеш. Вышыня 190 см. Прыемны пах саломы ўжо разносіцца ў пойме, калі сціхае вецер. Акрамя збожжа, якога мяркуюць атрымаць да 30 цэнтнераў з гектара, калгас будзе забяспечаны цалкам па патрэбе саломай.

Так што гэты год, першы год дзесятай цяцігодкі, які цяжка пачаўся ў жывёлагадоўлі, усё ж будзе не горшы, а лепшы за мінулы год. Прыязджаеш на Гомельшчыну і трапляеш у зону вялікага працоўнага подзвігу і робяць гэты подзвіг не асобныя героі, у ім удзельнічае ўвесь народ.

— Пяцігодка патрабуе. Пяцігодка будзе выканана!—гаварылі мне ўсюды шчыра.

З ПОШТЫ «ЛіМа»

У ГОРАДЗЕ ЭНЕРГЕТЫКАЎ

Расказ пра Новалукомльскую кнігарню хацелася б пачаць з аднаго запісу, узятага з «Кнігі скаргаў і прапаноў». Скаргаў тут няма; ёсць словы ўдзячнасці работнікам магазіна. Вось што напісаў адзін з наведвальнікаў: «У магазіне заўсёды шмат народу. Цікава наладжана работа з моладдзю. Але галоўнае, прадаўцы добра ведаюць сваю справу. Прыемна, што ў нашым магазіне працуюць такія людзі».

Загадвае кнігарняй Тамара Супко. Даўнія трывалыя сувязі магазіна з ДРЭС. На ДРЭС многія вучацца. Работнікі прылаўка дапамагаюць ім знайсці патрэбную літаратуру. Вялікая дружба і з навукова-тэхнічнай бібліятэкай ДРЭС. Калектыў у магазіне невялікі, але працуе ён рытмічна, дружна.

Часта наведвае магазін памеснік начальніка катлатурбіннага цэха Лукомльскай ДРЭС Б. Дутлаў.

— Я тут не госць, заказваю патрэбныя мне кнігі, — гаворыць Барыс Міхайлавіч. —Большасць заявак прадаўцы выконваюць. Але хочацца сказаць, што для маладога горада энергетыкаў можна было б мець памяшканне крыху большае: цесна ў невялікай гандлёвай зале. Ну і да Віцебскага аблкнігагандлю можна прад'явіць прэтэнзіі. Трэба больш поўна ўлічваць запатрабаванні інжынерна-тэхнічных работнікаў, людзей з вышэйшай адукацыяй. Такіх жыхароў у нашым гарадку нямала. Таму дасылаць навінкі ў нашу кнігарню трэба часцей і больш. І ў першую чаргу спецыяльныя выданні.

Спадзяёмся, што да гэтых патрабаванняў прыслухаецца Віцебскі аблкнігагандаль.

А. САКАЛОЎ.

У АРШАНСКІХ ЛІТАРАТАРАЎ

У апошні час выйшлі з друку кніжкі аршанскіх літаратараў — Г. Казака і Л. Калодзежнага, з'явіліся новыя публікацыі іншых маладых аўтараў.

Творчасць аршанцаў стала тэмай гаворкі на чарговым пасяджэнні Віцебскага абласнога літаратурнага аб'яднання пад старшынствам паэта Д. Сімановіча.

Журналіст з Оршы Ф. Кулакоў расказаў пра творчыя здабыткі сваіх таварышаў. Новыя вершы прачыталі члены літаб'яднання А. Прохараў і А. Махнач.

Аршанскія літаратары выступілі ў тэлевізійнай перадачы «Пра час і пра сябе». Іх творы прагучалі па абласным радыё.

С. САКАЛОЎСКІ.

НАДРУКАВАНА Ў «НАСТАЎНІЦКАЙ ГАЗЕЦЕ»

«На жніве — настаўнікі і вучні» — так называецца падборка матэрыялаў, змешчаная на першай старонцы газеты за 14 жніўня. З яе чытачы могуць даведацца, як школы рэспублікі дапамагаюць калгасам і саўгасам убіраць новы ўраджай.

Пад рубрыкай «Партыйнае жыццё» надрукаваны артыкул настаўніцы Кармянскай сярэдняй школы Л. Чуясавай «Творчыя справаздачы». Сакратар Гродзенскага ГК ЛКСМБ Н. Квасоўка выступае з артыкулам «Час вольны — час плённы».

Аб выхаванні культуры патрэбнасцей гаворыцца ў артыкуле «Чалавек сярод рэчаў», з якім выступае кандыдат філалагічных навук А. Красноў. Журналісты А. Кірпічэнкаў і М. Дрыго ў карэспандэнцыі «Грані эфектыўнасці» расказваюць пра вопыт работы прафсаюзнай арганізацыі Нікалаеўскай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна.

У раздзеле «Трыбуна станоўчага вопыту» газета надрукавала артыкул настаўніка гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы № 6 г. Светлагорска М. Талакнова «Сцвярджай сябе ведзмі». «Хлебароб пачынаецца са школы» — такая тэма карэспандэнцыі супрацоўніка ельскай раённай газеты «Ленінская праўда» В. Кавалькова.

Газета надрукавала памфлет І. Паўлава «Чаму павышаецца ціск», у якім расказваецца аб цяжкіх умовах работы настаўнікаў у капіталістычных краінах. Змешчана спартыўная старонка «Гартуйся, як сталь».

Пад загалоўкам «Блакітны экран на ўроку» друкуецца план вучэбных тэлеперадач на 1976—77 навучальны год.

Нумар газеты за 18 жніўня пачынаецца перадавым артыкулам «Са школы — на прадпрыемства». Уся другая старонка адведзена пад пісьмы ў рэдакцыю. «НТР і мараль» — так называецца артыкул кандыдата філасофскіх навук А. Кісялёва. Загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта І. Харламаў выступае з артыкулам «Навуковы рост — на службу якасці».

Пад рубрыкай «Пошук, творчасць, ініцыятыва» газета надрукавала выступленне настаўніцы Мальскай пачатковай школы Астравецкага раёна Д. Пашкоўскай «Адказнасць у нас адна». Пра стыль работы аддзела народнай асветы расказвае ў артыкуле «Магістральны кірунак» загадчыца Першамайскага райана г. Мінска. М. Саўчык.

На старонках газеты з артыкулам «Грані сучаснага клуба» выступае дырэктар Рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства культуры БССР А. Суоыновіч. Пад рубрыкай «Крытыка і бібліяграфія» змешчана рэцэнзія А. Марціновіча «Упоравень з часам». У ёй разглядаецца кніга В. Каваленкі «З пазіцый сучаснасці», якая выйшла ў выдавецтве «Народная асвета».

Газета паведамляе пра змест жніўневых нумароў часопісаў «Народная асвета», «Беларусь», «Рабочая смена», «Бярозка», «Вясёлка».

Партыйная газета

Васіль ХОМЧАНКА

ІГОЛКА Ў СЕНЕ

ГУМАРЫСТЫЧНАЕ АПАВЯДАННЕ

НАЧАЛЬНІК аддзела Карпік увайшоў у наш пакой, слізгануў позіркам па рабочых сталах, спытаў:

— Дзе Зіначкін? І сёння спазніўся?

Справа ў тым, што дагэтуль Зіначкін ужо меў за спазненне дзве вымовы і адну—за невыкананне навуковага задання. Два кварталы запар Зіначкіна пазбаўлялі прэміі. Таму, калі Карпік у час ранішняга абходу сваіх падначаленых зазіраў у наш аддзел, то першым чынам правяраў, ці на месцы Зіначкін.

Мы ніжэй нагнулі галовы, з асаблівым спрытам забегалі па паперы нашы шарыкавыя ручкі.

Карпік стаяў, чакаў адказу.

— Міланоўская, дзе Зіначкін?

Маліноўская ўспыхнула, адказала кусліва:

— Я магу сказаць, дзе ён бывае вечарам. А кантраляваць яго ў рабочы час не мая справа.

Я не вытрымаў і выдаў тайну.

— Зіначкін шукае іголку ў сене. На доследным поплаве.

— Якую іголку? — лоб Карпіка зморшчыўся — начальнік аддзела ўспамінаў, ці ёсць такая тэма ў плане навуковай працы інстытута. — Такой тэмы няма. Гэта самаўпраўства. Зараз жа вярніце яго сюды. — І строга паглядзеў на Маліноўскую.

Галя зноў успыхнула.

— Калі на тое пайшло,—сказала яна, — дык вырашаецца прэстыж нашага аддзела.

— Правільна, — падтрымаў я Галю. — Пытанне стаіць так: або мы, або аддзел Міронава. Тэрцыум нон датур. Трэцяга не дадзена.

Калі мы ўпамянулі аддзел Міронава, нашага суседа і канкурэнта-праціўніка, Карпік первова пацепаў плячамі, і ямачка на яго падбародку паблякла — прыкмета, што ў чалавека сапсаваўся настрой.

— Сямён Сямёнавіч, — пачаў тлумачыць я. — Справа пайшла на прынцып. На карту пастаўлены наш гонар і наш прыярытэт. Учорэ пасля службы яны—Міронаў і яго намеснік Аляксееў—сказалі нам проста нахабна, што профіль нашых навуковых пошукаў абсалютна бесперспектыўны, каэфіцыент аддачы нуль цэлых. Гэта тое самае, маўляў, што шукаць іголку ў стозе сена—работа ёсць, а вынікаў няма. Мы абурыліся, сказалі, што гэта іх аддзел займаецца пустой справай. А Зіначкін заявіў, што ён, калі спатрэбіцца, знойдзе іголку ў стозе сена. Наш праціўнік гэтаму не паверыў. Заспрачаліся, напісалі ўмову, паднісалі. Арбітра запрасілі з трэцяга аддзела. Знайшлі капу сена. Вось Зіначкін зрапку і пачаў сваю працу.

Карпік пейкі час маўчаў з непранікальным тварам, і ямачка на яго падбародку была нейкага невыразнага колеру: ні то чырвонага, ні то шэра-шызага. Потым у вачах яго выразіўся клопат, а пасля ўвесь ён ажывіўся, азартна пацёр далонямі.

— Іголку шукаць з ніткай?— спытаў ён.

— Без ніткі.

— Гм... Справа адказная.

— Вельмі адказная, Сямён Сямёнавіч, — загаварылі мы.— На прынцып ідзе.

— Трэба прыдумаць нейкае прыстасаванне, — даў параду начальнік, — магніт скарыстаць.

— Нельга. Ва ўмове запісана: шукаць іголку толькі рукамі, без ніякіх прыбораў і прыстасаванняў.

— А арбітр аб'ектыўны?

— Над ім ёсць яшчэ кантрольны арбітр, з чацвёртага аддзела.

— Вось што, — распарадзіўся Карпік. — Праз кожныя паўгадзіны інфармуйце мяне пра вынікі пошукаў. І трэба паслаць туды чалавека, — ён зірнуў на Маліноўскую, — які б маральна падтрымліваў Зіначкіна.

Маліноўская падхапілася, узяла плашч і парасон.

— Буду падтрымліваць, Сямён Сямёнавіч. — І выбегла з пакою.

Карпік яшчэ распарадзіўся:

— Я думаю, што трэба некаму быць там і для сувязі з аддзелам.

І так вырашэнне прынцыповай спрэчкі паміж нашым і другім аддзеламі пачалося. Пасланы для сувязі чалавек акуратна, роўна праз кожныя паўгадзіны прыбягаў у аддзел і расказваў нам аб справах з пошукамі іголкі ў сене: Зіначкін зрабіў лесвіцу, Зіначкін пачаў перабіраць кожную сяніну зверху капы і г. д.

У абедзенны перапынак мы купілі за кошт сродкаў прафкома абед з трох страў, бутэльку піва і ўсім аддзелам панеслі Зіначкіну. Нават пайшла з намі і гардэробшчыца цётка Паша, зачыніўшы свой гардэроб на замок.

— Я, можа, якую параду дам,—сказала яна. — Колькі гэтых іголак на сваім жыцці я губляла і знаходзіла.

Дарогай, паддаўшыся парэдзе той жа цёткі Пашы, купілі такі ж абед і бутэльку піва для арбітра. А Карпік за свае ўласныя грошы купіў яшчэ і пачак цыгарэт.

Каля капы сена, куды мы прыйшлі, знаходзілася палова аддзела — нашага канкурэнта на чале з іх Міронавым. Міронаў сядзеў, як і належыць начальніку, у спецыяльна прынесеным туды крэсле. Нам стала сорамна за свой аддзел і за Сямёна Сямёнавіча, што той вымушан стаяць. Я збегаў у аддзел і прынёс крэсла і для Сямёна Сямёнавіча.

— Не спяшайся, Ваня, — давалі мы параду свайму калегу. —Азірай кожную сяніну.

Разаслалі Галін плашч, паставілі туды абеды для Зіначкіна і для арбітра. Нашы канкурэнты запратэставалі, сказалі, што мы арбітра падкормліваем і той страціць аб'ектыўнасць. Але ўмяшаўся арбітр над арбітрам, дазволіў, за што і для яго давялося таксама купляць абед і піва.

Паколькі гэта спаборніцтва паміж аддзеламі, — сказаў прафорг, трэба арганізаваць наглядную агітацыю.

Сямён Сямёнавіч санкцыяніраваў гэта, і мы выпусцілі баявы лісток: на вялікім лісце кардону напісалі: «Даёш іголку! Уперад, таварыш Зіначкін!» Баявы лісток паставілі каля капы, каб яго заклік з дапамогай Маліноўскай натхняў Зіначкіна.

Да абедзеннага перапынку мы прыхапілі яшчэ з паўгадзіны — было ўсё ж цікава, чым скончыцца гэта прынцыповая спрэчка. Зіначкін-аптыміст нас запэўніў, што іголку ён знойдзе, калі нават яму двойчы, ці тройчы давядзецца перабіраць гэту капу. Не пашкадуе месяц працы, але дакажа свайму праціўніку, што ў капе сена іголку знайсці можна.

Зіначкін шукаў іголку сваім метадам. Ён перабіраў сена зверху, — для чаго і зрабіў лесвіцу. Ён браў жмут, уважліва аглядаў яго, як праз лупу, а пэтым трос пад брызентам, рассцеленым побач з капой і толькі тады кідаў на брызент.

Я крыкнуў Зіначкіну:

— Ты правярай уважліва, а то ў сяніну можа іголка залезці.

На дварэ стаяў жнівень. Было горача, суха і ціха, хоць бы варухнуўся ветрык. Зіначкін зняў сарочку, майку, і было відаць, што стаміўся.

— Галя,—сказала цётка Паша,—ты б пацалавала Ваню, а то ён ужо нешта раскіс.

— У рабочы час я гэта не магу рабіць, — адказала Маліноўская і азірнулася на Сямёна Сямёнавіча.

— Для карысці справы можна,—дазволіў начальнік.

Галя, узрадаваўшыся такому дазволу, падышла да Зіначкіна і працягла яго пацалавала. Зіначкін адразу ж заварушыўся шпарчэй.

У стапе праціўніка запратэставалі:

— Ва ўмовах сказана, каб не карыстацца дапамогай іншых людзей.

— Гэта дапамога не фізічная, а маральная, — сказалі арбітр і кантралёр над арбітрам.

Сямён Сямёнавіч пакінуў каля Зіначкіна Галю і сувязнога, а астатніх павёў на работу ў аддзел. Але работы ў гэты дзень ужо не было ніякай. Было не да работы. Сабраўшыся ў калідоры, курылі і горача абмяркоўвалі праблему іголкі. Цётка Паша прыбегла ў аддзел са свайго гардэроба і сказала, што яна ведае, як дапамагчы Зіначкіну.

— Я прынесла з сабою іголку, яе трэба перадаць незаўважна Зіначкіну.

Па сваёй навуковай недасведчанасці цётка Паша не магла зразумець, што кантрольную іголку сфатаграфавалі, падвергалі спектральнаму аналізу. Больш таго, яе апрацавалі токам пэўнай частаты і паставілі адмеціну — штампік.

Так прайшоў дзень, наступіў другі. Для таго, каб сувязному не бегаць з поплава ў аддзел, туды правялі часовую тэлефонную сувязь, і цяпер інфармацыю мы атрымлівалі праз кожныя пятнаццаць-дваццаць хвілін.

— Больш паловы капы ўжо перабрана,—даносіў сувязны. Значыць, каб перабраць усю, нам трэба яшчэ і заўтра пахвалявацца.

У абед мы ўсім аддзелам, разам з Сямёнам Сямёнавічам зноў пайшлі на месца рысталішча. Як і ўчора, пакармілі за прафсаюзны кошт Зіначкіна, арбітра і кантрольнага арбітра. Зіначкін падзяліўся з Маліноўскай півам. Дэманструючы сваю адданасць аддзелу, Галя некалькі разоў прымалася цалаваць Зіначкіна, але ў таго імпэту не прыбавілася. Яе пацалункі перасталі ўжо ўліваць у Зіначкіна сілу і бадзёрасць.

— Галя прыелася яму, — заўважыў нехта з нас.—Можа, замяніць яе Люсяй з машбюро?

Галя сціснула кулакі.

— Толькі няхай паспрабуе гэта ваша Люська...

Зіначкін нечакана ўзбадрыўся, спярша заварушыўся, і мы больш не сталі абмяркоўваць пытанне з Люськай. Каля капы Галю пакінулі.

Самы напружаны момант наступіў на трэці дзень. Перад канцом работы Маліноўская паведаміла па тэлефоне, што сена засталося зусім мала, можа, на адно бярэма. Сямён Сямёнавіч распарадзіўся, каб на гэты адказны момант ішлі паглядзець усе. Да капы сышліся, апрача нас, увесь аддзел Міронава і вядучыя спецыялісты інстытута.

Хто выйграе, чыё возьме — вось чым жылі ўсе прысутныя.

Чым менш заставалася сена, тым больш нарастала радаснае ўзбуджэнне ў стане праціўніка. А ў нас, канечне, было ўсё наадварот. Нашы спадзяванні на Зіначкіна з кожнай хвілінай мерклі, памяншаліся, мы хмурыліся, ніклі і вялі.

Вось засталося зусім мала сена — яго можна ўжо і ў кішэню запіхаць. Мы замёрлі. Усталявалася такая пругкая нішыня, як бывае на лобнай плошчы ў час пакарання смерцю ў той момант, калі кат падымае над галавой ахвяры сякеру.

А Зіначкін раптам уздрыгнуў, адхінуўся назад, павольна пачаў прысядаць, быццам збіраўся ўпасці ад непрытомнасці. Прысеў, працягнуў руку да зямлі, схапіў нешта, і з горла яго вырваўся пераможны крык:

— Знайшо-о-ў!

— Ура! — закрычаў увесь наш аддзел і кінуўся быў да Зіначкіна, але асцярожлівы Сямён Сямёнавіч спыніў нас начальніцкім голасам:

— Адставіць! Згубіце іголку!

Далей было ўсё прыемнае і лёгкае. Праверылі іголку і прызналі яе кантрольнай. Перамога была за намі, а прысарамленыя праціўнікі вымушаны былі нас віншаваць і прызнаць сваю памылку. Сам Міронаў сказаў, што навуковыя пошукі нашага аддзела прынясуць такія ж вынікі, як прынесла трохдзённая праца ўпартага Зіначкіна. І ў навуцы мы знойдзем сваю іголку.

Што ж датычыцца героя аддзела Зіначкіна, то Сямён Сямёнавіч аб'явіў загад, якім зняў з яго ўсе папярэднія спагнанні і даў тыдзень адгулу: за адзін дзень пошукаў іголкі — два дні. Было таксама вырашана ў наступным квартале Зіначкіну выдзеліць павышаную прэмію.

Вось вам і іголка ў стозе сена!



Каварства і любоў.

Без слоў...

Мал. В. ДУТКОЎСКАГА.

Мікола ВЯРШЫНІН

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТАЎ

Пісьменнікаў уведаць
не бярыся,
Хоць сочыш і за кожным іх
радком,
Праглядваюць праз
прозвішчы ўсё ж рысы
Характараў і звычак
часцяком.

Калеснік скалясіў свой край
хадою.
Прыходзька прыйдзе —
скажа пару слоў.
А Барадулін — з мудрай
барадою,
Куе аповесць мякка
Кавалёў.

Без скрыпу Скрыпка піша
вельмі гонка.
Грамовіч не грыміць,
спакойны ён.
А дзе Гамолка, там заўжды
гамонка.
Рыхтуе Зуб зубасты
фельетон.

Стральцоў апавяданнямі
страляе,
Там і Вышынскі вышыню
бярэ.
Маеўскі ў байках часам
поспех мае.
Дзяргай дзядоўнік з дзірвана
дзярэ.

Стварае Агняцвет пейзаж
агністы,
Грахоўскі ў сваіх вершах
не грашыць.
Стаць Ставер хоча сталым
раманістам.
Звон вершаў Звонака —
не заглушыць.

Сушко даўно ўжо сохне над
сатырай,
І «Вожык» — быццам бацька
для яго.
А Верабей у паэтычны вырай
Ляціць.
Імкнецца кожны да свайго.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ

ХАЛТУРШЧЫК

Піша ён «пад Беранжэ»
І ад радасці іржэ.
Хай нас бог аберажэ
Ад такога Беранжэ.

СУСТРЭЧЫ, ПОШУКІ, АДКРЫЦЦІ.

ТАМ, ДЗЕ ПРАЦАВАЎ Я. КОЛАС

●

АЎТАРУ РАМАНА «ЯК ГАРТАВАЛАСЯ СТАЛЬ»

●

САМАБЫТНЫ ТАЛЕНТ

ДАРАГОЕ, ЗАПАВЕТНАЕ

НА ПАЛЕСКАЙ ЗЯМЛІ

На выездзе з Пінска палявая дарога перавальвае праз узгорак. Хутка лес у лагчыне знікае, і перад намі — вёска Баяры. Прыгожыя дамы, а навокал палі вядомага калгаса «Аснежыцкі», маляўнічыя Пінкавіцкія гаі. Мясціны, дзе некалі працаваў настаўнікам Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

Прырода тут захавала сваю першародную чысціню. Здаецца, гай памятае задуменныя крокі настаўніка-паэта, які любіў пахадзіць па ім, адпачыць, памарыць у адзіноце.

У вёсцы Пінкавічы, на месцы былой школы, у якой настаўнічаў малады Якуб Колас, узведзены цагляны дом з ранейшай планіроўкай. Зараз тут музей, экспанаты якога расказваюць аб жыцці і творчасці народнага песняра. Размешчаны ён амаль у цэнтры вёскі. Адсюль, калі крыху адысціся, адкрываецца цудоўны краявід на Піну.

Непадалёк, праз дарогу — двухпавярховы будынак новай Пінкавіцкай сярэдняй школы, што носіць імя паэта. Ля ўваходу мемарыяльная дошка: «У гэтай школе ў 1902 годзе працаваў народны паэт Беларусі Якуб Колас (Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч)». Школа была спалена ў гады Вялікай Айчыннай вайны, затым адбудавана нанава. Непадалёку помнік з надпісам: «Вечная слава героям, якія загінулі ў баях з ворагам і аддалі сваё жыццё за свабоду і шчасце нашага народа!».

За час працы ў Пінкавічах Я. Колас напісаў шэраг лірычных вершаў на рускай мове, вывучаў гісторыю Пінска, слухаў і запісваў народныя песні.

...Ходзіш па гэтых мясцінах і радуешся тым зменам, што адбыліся на палескай зямлі. Квітнее родная Беларусь, пра шчаслівы лёс якой горача марыў у маладыя гады народны песняр.

Мікола ЖЫГОЦКІ.

Нядаўна ў гасцях хлебаробаў Чэрыкаўскага і Крычаўскага раёнаў пабываў Гуцульскі ансамбль песні і танца.

Фота В. БЫСАВА.

Мікалаю Астроўскаму з Мінска

«Мы былі глыбока ўзрушаны тым выключным захапленнем, з якім партыйны актыў Мінска прыняў паведамленне пра нашу работу над Вашым раманам. Карыстаемся выпадкам, каб яшчэ раз падзякаваць Вам за тое творчае хваляванне і энтузіязм, які Вы ўлілі ў наш калектыў сваёй цудоўнай працай, якая падарыла нам вобраз выдатнага героя Паўла Карчагіна»,—гэта радкі з тэлеграмы, што была накіравана 8 чэрвеня 1936 года Мікалаю Астроўскаму рэжысёрам У. Меерхольдам і артысткай З. Райх. Адпраўлена яна з Мінска, дзе на пачатку таго лета гастраляваў Дзяржаўны тэатр імя Меерхольда. У часе гастроляў працягвалася праца над інсцэніроўкай рамана «Як гартавалася сталь». 4 чэрвеня рэжысёр выступіў перад партыйным і камсамольскім актывам сталіцы Савецкай Беларусі з лекцыяй аб перспектывах развіцця тэатра і назваў сярод маючых адбыцца прэм'ер спектакль паводле любімага мільёнамі твора пісьменніка-камуніста. У справаздачы з гэтага актыву газета «Рабочий» у нумары за 6 чэрвеня 1936 г. паведамляла, што гэтая вестка была сустрэта гарачымі апладысментамі прысутных і была прынята пастанова паслаць М. Астроўскаму прывітальную тэлеграму.

Аб гэтым можна прачытаць у толькі што выдадзенай кнізе «В. Э. Мейерхольд. Переписка. 1896—1939» (Выдавецтва «Искусство», Масква).

Ёсць у кнізе і іншыя старонкі, звязаныя з Беларуссю. Напрыклад, пісьмо ад 7 сакавіка 1908 г. гаворыць аб паспяховых творчых эксперыментах рэжысуры і мастака-дэкаратара ў спектаклях, пастаўленых паводле п'ес А. Блока і М. Метэрлінка. Было гэта ў час гастроляў Таварыства новай драмы пад кіраўніцтвам У. Меерхольда ў Віцебску і Мінску.

Многія пісьмы і дакументы ў кнізе друкуюцца ўпершыню.

Б. ГУК.

СУСТРЭЧЫ З ПАЭЗІЯЙ

Бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў Беларусі правяло некалькі выступленняў беларускіх пісьменнікаў у Докшыцкім раёне па кнізе М. Калачынскага «Докшыцкі каравай». Пісьменнікі Алесь Ставер і Анатоль Шаўня выступілі ў аб'яднанні «Сельгастэхніка», на хлебазаводзе, на прарабскім участку і ў іншых арганізацыях з аглядам зборніка. А ў раённым піянерскім лагеры «Бярозка» яны правялі вялікі літаратурны вечар па гэтай кнізе, дзе піянеры чыталі вершы паэта. З чытаннем вершаў М. Калачынскага выступаў таксама дыктар Беларускага радыё Мікола Чырык.

В. ДАЙЛІДА.

КАЗКА Ў СКВЕРЫ

А. Аганаў за работаю.

Распрацоўваючы план забудовы пятага мікрараёна Наваполацка, супрацоўнікі архітэктурна - планіровачных майстэрань № 3 вырашылі захаваць у яго паўднёва-заходняй частцы лясны масіў — для таго, каб стварыць у ім альпінарый, пляцоўкі для адпачынку, альтанкі, а ў адкрытых для агляду месцах устанавіць дэкаратыўныя скульптуры. Прывязку скульптур на мясцовасці выконваў архітэктар А. Караткоў. Ён прадставіў аўтарам даволі шырокае поле дзейнасці.

Сёння задума дойлідаў і планіроўшчыкаў амаль цалкам здзейснена. Радуюць вока альпінарый, арыгінальнай формы лаўкі і альтанкі, стылізаваныя ліхтары на цэнтральнай алеі. Але галоўным упрыгожаннем сквера сталі дэкаратыўныя скульптуры, над якімі працаваў выпускнік Ленінградскага інстытута мастацтваў імя І. Я. Рэпіна А. Аганаў са сваімі памочнікамі У. Васькоўцавым і У. Дзіўнічам.

Пад зялёнай, каржакаватай сасной спыніліся пасля доўгай дарогі чатыры старцы. Мо стаміў іх няблізкі шлях, а мо затрымаў-збянтэжыў гул многалюднай вуліцы?

Задуменна-ціха кратае струны стары казачнік і пад пералівісты перазвон іх вядзе сваю рэчытатыўную песню. Аб чым яна? Аб сівых часах старажытнай полацкай зямлі ці аб новай цудоўнай яве яе? Як бы там ні было, а песня зацікавіла спадарожнікаў гусляра, таму і заслухаліся-задумаліся яны.

Гэтай скульптурнай групай адкрываецца кампазіцыя дэкаратыўна-ігравой скульптуры. А далей—«Чырвоная шапачка і Шэры Воўк». Сімпатычная, з пульхнымі шчочкамі, даверлівая дзяўчынка з захапленнем назірае за дзецьмі, якія весела гуляюць за нізенькай драцяной агароджай. А побач—Воўк, які, здаецца, забыўся пра свой намер.

На ўсходняй ускраіне сквера спыніліся «Іван ды Мар'я». Глядзяць нашы героі задуменнымі позіркамі і не пазнаюць мясцовасць. Яшчэ нядаўна вачам тут адкрываўся зялёны лес, а сёння яго не відаць за гмахамі дамоў.

У цэнтры сквера—тры віцязі. Першы — аптыміст—усміхаецца, другі—сур'ёзны—аб чымсьці думае, а трэці, відаць, песіміст—засумаваў.

Асабліва падабаюцца дзецям казачныя персанажы. Што ж, яны і пастаўлены тут ні толькі для таго, каб упрыгожваць сквер, але і выхоўваць у грамадзян юнага ўзросту любоў да прыгажосці.

Ю. КАСЦЮК,
супрацоўнік наваполацкай гарадской газеты «Хімік».

Фота Ул. СУПРУНЕНКІ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі

Індэкс 63856 АТ 01379

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-44-04, аддзела грамадска-палітычнага жыцця і інфармацыі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-24-62, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-24-62, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела пісем і масавай работы — 33-24-04, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Хведар ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Барыс БУР'ЯН, Анатоль ГРАЧАНІКАЎ, Юрый ГРЫГОР'ЕЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Ігар ДАБРАЛЮБАЎ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Аляксандр КАПУСЦІН (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір НЯФЁД, Віктар ПРАТАСЕНЯ, Іраіда САНКОВА, Мікола ТКАЧОЎ, Юлія ЧУРКО, Віктар ШЫМУК (адказны сакратар), Рыгор ШЫРМА.